WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

6 МАЯ 2010 г.
ЧАЦВЕР
№ 86
(26694)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

**Прамая лінія**

## АБ СПРАВАХ САРДЭЧНЫХ

мы пагаворым на нашай чарговай «прамой лініі», у якой возьмуць удзел **загадчык інфарктнага аддзялення № 2 10-й мінскай гарадской клінічнай бальніцы Наталля Якаўлеўна ПАЛЯЎКОВА** і **ўрач-кардыёлаг таго ж аддзялення Ірына Віктараўна ГРЫШЫНА.** У нашых гасцей вы зможаце запытаць пра хваробы, звязаныя з артэрыяльным ціскам, пра тое, як папярэдзіць інфаркты і інсульты, пра лячэнне гэтых паталогій і рэабілітацыю пасля іх.

**«Прамая лінія» адбудзецца 11 мая, у аўторак, з 16.00 да 17.30 па нумарах: 8 (017) 292 38 92 і 292 38 21. Папярэднія пытанні можна пакінуць па нумарах 8 (017) 287 18 29 і 287 18 36.**

## ВЯНОК АД ПРЭЗІДЭНТА БЕЛАРУСІ ЎСКЛАДЗЕНЫ ДА МАГІЛЫ НЕВЯДОМАГА САЛДАТА Ў МАСКВЕ

**Вянок ад Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ўскладзены ўчора да Магілы Невядомага салдата каля Крамлёўскай сцяны. Урачыстая цырымонія, якая адбылася ў Аляксандраўскім садзе, была прысвечана 65-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

Гэта цырымонія прайшла з асаблівай урачыстасцю. У ёй прынялі ўдзел Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Беларусі ў Расіі Васіль Далгалёў, дзяржсакратар Саюзнай дзяржавы Павел Барадзін, адказны сакратар Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі Сяргей Стрэльчанка, ветэраны вайны, дыпламаты, супрацоўнікі інтэграцыйных органаў, прадстаўнікі беларускай дыяспары.

Удзельнікі цырымоніі ўсклалі таксама карзіны кветак да памятных знакаў «Горад-герой Мінск» і «Брэсцкая крэпасць-герой» на Алеі гарадоў-герояў.

Адной з асаблівасцяў гэтай цырымоніі ў гутарцы з журналістамі Васіль Далгалёў назваў той факт, што ў ёй удзельнічалі беларускія ваенныя, якія 9 мая пройдуць на парадзе па Краснай плошчы.

## БЕЛАРУСЬ І РАСІЯ ЯШЧЭ МОГУЦЬ НАГНАЦЬ АДСТАВАННЕ Ў БУДАЎНІЦТВЕ САЮЗНАЙ ДЗЯРЖАВЫ

**Будаўніцтва Саюзнай дзяржавы апошнім часам некалькі прыпынілася, аднак Беларусь і Расія могуць нагнаць гэта адставанне. Такую думку выказаў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 4 мая ў інтэрв'ю інфармацыйнаму агенцтву «Рэйтэр».**

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што Саюзную дзяржаву неабходна будаваць на роўных прынцыпах. «І калі Расія ў гэтым напрамку будзе працягваць рухацца, стварацца наш саюз на роўных прынцыпах, то мы з вялікім задавальненнем будзем працягваць гэта будаўніцтва», — сказаў кіраўнік дзяржавы. «Так, яно неяк прытармазілася апошнім часам. Але ўпэўнены, што мы можам пераадолець той вакуум, які ўтварыўся, і нагнаць хуткімі тэмпамі сваё адставанне», — лічыць Прэзідэнт.

«Галоўны прынцып, які мы заяўляем, — але Расія, відаць, не прымае і не разумее нас, — што мы не адмовімся ад свайго суверэнітэту і незалежнасці», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Ён таксама дадаў, што на іншых прынцыпах Беларусь Саюзную дзяржаву ва ўрон свайму народу і дзяржаве будаваць не будзе.

«Для нас гэта непрымальна, — падкрэсліў ён. — І калі нам уводзяць мытныя пошліны, а несаюзнікам гэтыя пошліны не ўводзяць, на адчувальныя тавары для нас, згадзіцеся, што гэта ўжо спроба «нахіліць», «дыктаваць». Гэта таксама непрымальна ў саюзнікаў».

На пытанне аб магчымасці адмовы Беларусі ад далейшага будаўніцтва Саюзнай дзяржавы Аляксандр Лукашэнка адказаў, што ляпаць дзвярамі Беларусь не будзе. «Мы вельмі шмат зрабілі для таго, каб стварыць гэты працэс, афарміць, накіраваць яго. Таму абрадаваць сваіх працаўнікаў і ворагаў я не магу. Грукаць дзвярамі Беларусь не мае намеру. Наадварот», — сказаў ён.

«У адносінах з Расійскай Федэрацыяй мы зрабілі гіганцкі крок насустрач адзін аднаму, — адзначыў беларускі лідар. — Але апошнім часам расійскае кіраўніцтва захацела выбудоўваць з Беларуссю абсалютна прагматычныя адносіны. Мы да гэтага гатовыя». Аляксандр Лукашэнка пры гэтым падкрэсліў, што «прагматызм не павінен губіць усё тое, што накоплена на сёння».

«Калі расіяне, у бухгалтэрыі падлічыўшы, убачылі, што яны ствараюць вельмі вялікія даброты для беларускага народа, то я павінен сказаць, што гэта няправільны падлік. Гэта касабокі, аднабокі прагматызм», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

«Калі вы думаеце, што ў нас настолькі дрэнныя адносіны з Пуціным і Мядзведзевым, то вы памыляецеся, — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы. — З Пуціным і Мядзведзевым мы наогул аднаго ўзроўню палітыкі, я маю на ўвазе і па ўзросце, у нас мысленне аднолькавае і гэтак далей, у нас няма ніякіх антаганістычных супярэчнасцяў. Тое, што ёсць, гэта пераадольна».

«Таму не трэба разлічваць, што пасварыўшыся з Расіяй, Лукашэнка трапіць у нямаласць нейкую. Гэта не патрэбна кіраўніцтву Расіі. Страціць Беларусь для Расіі — гэта будзе незаменная страта і незаменны ўрон, і перш за ўсё маральная шкода, — лічыць Прэзідэнт. — Рускі чалавек гэтага не пацерпіць. Усе апытанні грамадскай думкі ў Расіі, колькі б іх ні праводзілі пракрамлёўскія сацыялагічныя цэнтры, даюць вынік: больш за палову насельніцтва Расіі ў пагаршэнні адносінаў паміж Беларуссю і Расіяй абвінавачваюць расійскае кіраўніцтва. Народ не падманеш...»

СТАР. 2

## Дзе «карагод» ходзіць, там жыта родзіць!

Вёска Пагост Жыткавіцкага раёна — захавальніца старажытнага народнага абраду ў дзень святога Юр'я (Георгія Перамаганосца). Абрад называецца «Карагод». Галоўнымі носьбітамі жывой традыцыі пры ўдзеле фальклорнага калектыву «Міжрэчча» з яўляюцца самі жыхары гэтага населенага пункта. Летась дзяржава надала славутаму абраду ахоўны статус, а ў вёсцы ўсталяваны памятны знак.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## 9 МАЯ ПРЫХОДЗЬЦЕ ЗАГАДЗЯ

**Мінская міліцыя просіць грамадзян загадзя прыходзіць 9 мая на ваенны парад і іншыя святочныя мерапрыемствы, паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў ГУУС Мінгарвыканкама.**

У Дзень Перамогі асноўныя намаганні супрацоўнікаў міліцыі будуць засяроджаны на забеспячэнні асабістай і маёмаснай бяспекі грамадзян, недапушчэнні парушэнняў грамадскага парадку і надзвычайных здарэнняў. Менавіта для гэтага ў месцах правядзення найбольш значных святочных мерапрыемстваў будзе арганізавана работа кантрольна-прапускных пунктаў.

Праз КПП не будуць прапускацца нецвярозыя грамадзяне. З сабой нельга праносіць таксама не толькі алкагольныя, слабаалкагольныя напіткі і піва, але і ўвогуле любое пітво ў непразрыстай тары. Выключэнне складаюць прахаладжальныя напіткі ў празрыстых пластыкавых бутэльках аб'ёмам не больш як 0,5 л. Каб пазбегнуць канфліктных сітуацый, трэба загадзя падрыхтаваць асабістыя рэчы да надгляду.

## ...ЛЮБОЎ ДА ЧЫТАЧА — У КОЖНЫМ СЛОВЕ!

*На другі дзень працы выставы «СМІ ў Беларусі» да стэнда «Звязды» прыйшлі падпісчыкі з падзякай і прапановамі*

Дождж не перашкодзіў святу. Павятраныя шарыкі, ваенны аркестр, мімы, кветкі, прызы і падарункі... І, безумоўна, падзеі і прэзентацыі. На выставе адбываюцца не толькі сустрэчы і знаёмствы з журналістамі, выдаўцамі, распаўсюджвальнікамі і чытачамі, але і праводзіцца сур'ёзная навуковая работа, абмяркоўваюцца праблемы і шляхі іх вырашэння, адзначаюцца лепшыя з лепшых у інфармацыйнай прасторы краіны.

Учора ў рамках выставы ў Доме прэсы прайшоў семінар «Уплыў сучасных тэхналогій на развіццё рэгіянальных СМІ», удзел у якім узялі прадстаўнікі Міністэрства інфармацыі, Нацыянальнага прэс-цэнтра, Інстытута журналістыкі БДУ, Міністэрства сувязі і інфарматызацыі і рэгіянальных тэлерадыёкампаній. У гэты ж дзень у канферэнц-зале Дома прэсы адбылося пасяджэнне «круглага стала» на тэму «Вялікая Айчынная вайна ў нацыянальнай свядомасці беларускага народа. Гістарычная праўда як гарантыя будучага развіцця».

А на самой выставачнай пляцоўцы выданні працягвалі спаборнічаць за наведвальнікаў сваіх стэндаў і рэкламаваць сябе. Прэзентацыя стэнда газеты «Звязда» пачалася з відовішчнага выступлення спартыўнага клуба «Кайман» Беларускай федэрацыі каратэ будо Кёкусінкай, а працягнулася выступленнем маладых прыхільнікаў роднай газеты на роднай мове.

Вядучыя прэзентацыі студэнткі другога курса Інстытута журналістыкі БДУ Маргарыта Ніканюк і Ніна Шчарбачэвіч у вайсковай форме і з георгіеўскімі стужкамі ў пятліцах спачатку наладзілі конкурс выканаўцаў беларускамоўных песень. Перамагла дзяўчына Іна з лірычнай «Купалінкай», але прызы — кнігі журналістаў «Звязды» — былі ўручаны ўсім, хто не пабаяўся ўзяць у рукі мікрафон і абараніць гонар любімай газеты. Потым моладзь спаборнічала ў рыфмаванні радкоў з назвай газеты «Звязда»:

*«Звязда» — газета на роднай мове,*
*Любоў да чытача — у кожным слове!...*

Тым часам на другой сцэнічнай пляцоўцы падводзіліся вынікі Другога Рэспубліканскага конкурсу на лепшую арганізацыю рэалізацыі друкаванай прадукцыі. Лепшым прадпрыемствам было названа РУП «Белсаюздрук», лепшай кніжнай крамай — «Кнігарня Эўрыка» філіяла ААТ «Белкніга», лепшым газетным кіоскам — кіёск № 10 РУП «Брэстаблсаюздрук», лепшым прадаўцом кнігі — Ларыса ТРАЦЦЯКОВА (крама № 6 ААТ «Магілёўсаюздрук»), і, нарэшце, лепшым прадаўцом газет — Наталля АРНАТОВІЧ (кіёск № 4 Заслаўскага раённага аддзялення РУП «Мінаблсаюздрук»).

А адразу пасля гэтага пад гукі аркестра дыпломы, прызы і кветкі былі ўручаны шматлікім пераможцам штогадовага творчага конкурсу на лепшы матэрыял СМІ пра дзейнасць органаў унутраных спраў...

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

**Навіны Беларусі і замежжа ў рэжыме on-line на сайце «Звязды» — www.zviazda.by**

## РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

### ВЕТЭРАНАМ ВАВ — БЯСПЛАТНЫЯ ЛЕКІ

**Міністэрства аховы здароўя Беларусі ініцыюе бясплатнае забеспячэнне ветэранаў ВАВ лекамі па медыцынскіх паказаннях. Аб гэтым паведаміла на прэс-канферэнцыі намеснік начальніка ўпраўлення арганізацыі медыцынскай дапамогі, начальнік аддзела першаснай медыцынскай дапамогі Міністэрства аховы здароўя Людміла ЖЫЛЕВІЧ, адказваючы на пытанне карэспандэнта БЕЛТА.**

Правам на бясплатнае забеспячэнне лякарствамі па рэцэптах урачоў у мінулым годзе скарысталіся каля 28 тыс. інвалідаў ВАВ і асобаў, якія пацярпелі ў гады вайны. Яно ажыццяўляецца ў межах пераліку асноўных лекавых сродкаў. Гэты пералік самы вялікі ў свеце, уключае каля 500 назваў, падкрэсліла прадстаўнік Міністэрства аховы здароўя.

«Як паказвае аналіз зваротаў ветэранаў, праблемы з лекавым забеспячэннем яны называюць у ліку самых надзённых, — сказала Людміла Жылевіч. — Калі патрэбны ветэрану прэпарат не ўваходзіць у пералік, то пытанне аб яго бясплатным прадастаўленні, як правіла, вырашаецца на мясцовым узроўні». Разам з тым, лічыць Людміла Жылевіч, мэтазгодна забяспечваць ветэранаў бясплатна лекавымі прэпаратамі па медыцынскіх паказаннях, нават калі гэтыя прэпараты не ўваходзяць у зацверджаны пералік.

Гэта ініцыятыва Міністэрства аховы здароўя перададзена ўжо ва ўрад, пытанне разглядаецца.

### НОВЫЯ МАНЕТЫ ПАПОЎНІЛІ СЕРЫЮ «ПРАВАСЛАЎНЫЯ ХРАМЫ»

**З сённяшняга дня Нацыянальны банк Беларусі ўводзіць у абарачэнне ў рамках міжнароднай манетнай праграмы сярэбраныя памятныя манеты «Свято-Успенский собор», «Свято-Петро-Павловский собор», «Свято-Александро-Невский собор», «Свято-Николаевский собор» серыі «Праваслаўныя храмы», паведаміў карэспандэнту «Звязды» намеснік начальніка Упраўлення інфармацыі галоўнага банка краіны Міхаіл Журавовіч.**

Манеты выпушчаныя наміналам 20 рублёў, пробай сплаву 925, масай 28,28 грама, якасцю «пруф», тыражом да 6000 штук кожнага найменя, а таксама наміналам 20 рублёў, пробай сплаву 925, масай 28,28 грама, якасцю «брыльянт-ацыркулейтэд», тыражом да 3000 штук кожнага найменя.

**Ігар ГРЫШЫН.**

### У БАРЫСАВЕ НАСТАЎНІЦА ЗБІЛА ШКОЛЬНІКА-ВЕЛАСІПЕДЫСТА

36-гадовая настаўніца адной з барысаўскіх школ ехала на аўтамабілі ВАЗ па вуліцы Лапаціна. Справа ад аўтамабіля па краі дарогі на веласіпедзе рухаўся 11-гадовы хлопчык, дарэчы, вучань той жа школы, дзе працуе жанчына. Раптам, было каля 12 гадзін дня, веласіпедыст рэзка павярнуў налева — адбылося сутыкненне. У выніку школьнік атрымаў закрытую чэрапна-мазгавую траўму, страсанне галаўнога мозга, раны лобнай вобласці, носа, галёнкі і каленнага сустава.

У той жа дзень у Буда-Кашалёўскім раёне Гомельскай вобласці маладая маці везла сваю 10-гадовую дачку на багажніку веласіпеда, што катэгарычна забаронена.

— А палове на дзясятую жанчына вырашыла перасекчы праезную частку, — распавядае старшы інспектар спецыяльнага падраздзялення ДПС «Страла» Вольга АМІНАВА. — Пры гэтым яна не злезла з веласіпеда, як таго патрабуюць ПДР. У выніку ў яе ўрэзаўся «Фальксваген-Гольф». Дзяўчынка, на шчасце, выжыла, але з закрытай чэрапна-мазгавой траўмай дастаўлена ў хірургічнае аддзяленне.

**Надзея ДРЫЛА.**

## ЛЕПШ ЗА ГОРЫ МОГУЦЬ БЫЦЬ ТОЛЬКІ...

Парламенцкі дзённік

# БЕЛАРУСКІЯ СЯДЗІБЫ

*Каб ацаніць, чаго не хапае айчыннай турыстычнай галіне, дэпутаты самі сталі турыстамі — выправіліся ў вандроўку па Нёманскім краі*

Пры слове «турыст» сёння мала хто ўяўляе ўтрапёнага паходніка з непад'ёмным заплечнікам, бо нават адпачынак «дзікуном» не такі ўжо і дзікі пры наяўнасці велізарнай колькасці камфартабельных кэмпінгаў і сістэмы он-лайн-браніравання начлегу з любога пункта свету. Хутчэй — гэта патрабавальны, вопытны адпачывальнік, які перафоткаўся ўжо хіба не з усімі славутасцямі свету, і яму падавай экзотыку, дзіва — і ў краявідах, і ў гастраноміі, і ў актыўнасцях, у той жа час з выкананнем усіх стандартаў камфорту. Беларусь для такога хадака калі не тэра інкогніта, то смачны кавалак дакладна — мне, спадзяюся, не трэба расказваць вам пра ўнікальныя помнікі дойлідства, народныя рамёствы, каларытныя сядзібы, пушчы, рэкі ды мелавыя азёры з нерэальнай бірузовай вадой — засталося хіба што афарміць нашую цукерачку і трапна яе падаць.

Увогуле руку да гэтага прыкласці варта многім умельцам: турызм усё ж штука зборная, нібы тая мазаіка, — апроч уласна прыродных і культурных каштоўнасцяў, гэта яшчэ і транспартная сістэма, грамадскае харчаванне, гандаль, умовы пражывання, уменне абслуговага персаналу ды ўвогуле жыхароў «балакаць» па-замежнаму... Прасцей сказаць, што не стварае агульнай карцінкі для наведвальніка. Няблага, каб усё гэта было ўзгоднена, у сістэме. І верхні ўзровень абагульнення якраз у заканадаўцаў. Яны ў пэўнай ступені задаюць тон супольнай рабоце, вызначаюць агульныя прынцыпы.

СТАР. 3

Такой імпрэзай сустракалі дэпутатаў «Над Нёманам».

Алег САКАДЫНЕЦ гатовы прыняць выклік на рыцарскі бой.

ISSN 1990 - 763X

| Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 06.05.2010 г. (для б/н разлікаў) | | | |
|---|---|---|---|
| ▲ 1 долар ЗША | 2 976,00 | 1 чэшская крона | 149,51 |
| ▼ 1 еўра | 3 852,73 | 1 польскі злоты | 962,42 |
| 1 латвійскі лат | 5 461,05 | ▼ 1 расійскі рубель | 100,27 |
| 1 літоўскі літ | 1 118,67 | 1 украінская грыўня | 375,76 |

| Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ | |
|---|---|
| USD | 29,6812 |
| 10 UAH | 37,2412 |
| 1000 BYR | 9,9869 |
| EUR | 38,5143 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

**ПО ПОРУЧЕНИЮ ОАО «АГРОСТРОЙФИРМА ПМК-74-НАЛИБОКИ» (ПРОДАВЕЦ), КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ» (ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА)**

**ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

по продаже здания общежития, об. пл. 317,5 кв.м, расположенного по адресу: Минская область, Столбцовский район, д. Налибоки, ул. Гостинная, 10. Начальная цена с НДС – 20 908 440 бел. руб. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 10.11.2009. Задаток 10 % от начальной цены. Аукцион состоится **20.05.2010** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **19.05.2010** до 17.00 по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224 61 34, 500 47 12.**
**Сайт в интернете: www.rlt.by.**

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА**

**ПО ПОРУЧЕНИЮ ОАО «БЕЛОМО – ММЗ ИМЕНИ С.И. ВАВИЛОВА», КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»**

**ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

**по продаже складского комплекса, расположенного по адресу: Минский район, Колодищанский с/с, Промузел «Колодищи» в составе:**

**1)** Здание арочного складского помещения № 5, 679,5 кв.м; **2)** Здание арочного склада № 8, 697,5 кв.м; **3)** Здание арочного склада № 6, 373,3 кв.м; **4)** Здание склада, 652,8 кв.м; **5)** Здание котельной, 251,7 кв.м; **6)** Здание проходной, 36,6 кв.м; **7)** Здание сборно-щитового домика, 58,4 кв.м; **8)** Здание склада цемента и мела, 33,9 кв.м; **9)** Здание склада, 4316,5 кв.м; **10)** Здания блока металлических складов, 324,5 кв.м; 326,3 кв.м; **11)** Здание металлического склада, 68,2 кв.м; **12)** Здание склада древесного пека, 54,8 кв.м; **13)** Здание автовесов, 25,2 кв.м; **14)** Здание трансформаторной подстанции, 117,7 кв.м; **15)** Здание насосной станции, 57,5 кв.м; **16)** Здание блока складских помещений, 844,7 кв.м; **17)** Здания складов, 141,0 кв.м; 184,9 кв.м; 240,5 кв.м; 258,4 кв.м; **18)** Пристройка к сборно-щитовому домику, 70,5 кв.м, а также сооружений и оборудования. Начальная цена с НДС – 6 582 216 240 бел. руб. Площадь земельного участка – 7,9748 га. Задаток – 500 000 000 бел. руб. Порядок проведения аукциона и подробный перечень имущества подлежащего продаже оговорен в условиях его проведения. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 30.05.2009. Аукцион состоится **18.05.2010** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **17.05.2010** до 17.00 по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224 61 34, 500 47 12.**
**Сайт в интернете: www.rlt.by.**

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА**

**КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ» (ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА) ПО ПОРУЧЕНИЮ ОАО «БЕЛТОРГСТОЙ» (ПРОДАВЕЦ)**

**ПРОВОДИТ ПОВТОРНЫЙ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

по продаже объектов недвижимости в составе: **Лот № 1:** комплекс зданий и сооружений, расположенных по адресу: **г. Новополоцк, пер. Рижский, 12,** в составе: здание склада-модуля, об. пл. 927,7 кв.м (корп. 3); административно-бытовой корпус, об. пл. 527,8 кв.м; здание ведомственной охраны со складским помещением, об. пл. 51,4 кв.м (корп. 2); здание склада, об. пл. 152,3 кв.м (корп. 5); пристройка к сторожке, об.пл. 106,0 кв.м. (корп. 1); здание пилорамы, об.пл. 83,0 (корп. 4); КТП-25; сети водопроводные, сети канализационные. Начальная цена с НДС (снижена на 20 %) – 1 143 796 517 бел. рублей. Площадь земельного участка – 1,4945 га. **Лот № 2:** трансформаторная подстанция, об. пл. 56,3 кв.м, **г. Брест, ул. Красногвардейская, 129.** Начальная цена с НДС (снижена на 20 %) – 44 705 664 бел. руб. Площадь земельного участка – 0,0103 га. Задаток 10 % от начальной цены. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 16.03.2010. Аукцион состоится **25.05.2010** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **24.05.2010** до 17.00 по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224 61 34, 500 47 12.**
**Сайт в интернете: www.rlt.by.**

БЕЛАРУСБАНК
Открытое акционерное общество «Сберегательный банк «Беларусбанк»

СРОЧНЫЙ ВКЛАД в белорусских рублях

"Шанс"

СТАВКА РЕФИНАНСИРОВАНИЯ НАЦИОНАЛЬНОГО БАНКА РБ + 5% ГОДОВЫХ

Дополнительный доход по вкладу в виде выигрыша:
ХОЛОДИЛЬНИК, ТЕЛЕВИЗОР, СТИРАЛЬНАЯ МАШИНА, МИКРОВОЛНОВАЯ ПЕЧЬ.
Тиражи выигрышей проводятся два раза в год.

Условия вклада:
- ежемесячная капитализация;
- возможность пополнения суммы вклада;
- возможность открытия вклада на имя другого лица;
- возможность совершения расходных операций в любом размере по истечении 3-х месяцев;
- срок действия вклада – 3 года.

*— ставка рефинансирования Национального Банка РБ + 5% годовых.

Воспользуйтесь возможностью вклада «Шанс», участвуйте в розыгрыше и получите приз!

Держателям личных дебетовых пластиковых карточек ОАО «АСБ Беларусбанк» предоставлена возможность осуществить операцию пополнения вклада в инфокиосках банка путем перечисления денежных средств с картсчета на вкладной счет БЕСПЛАТНО.

Подробности — в учреждениях банка и на сайте www.belarusbank.by

Информация о процентах, выплаченных по вкладам, депозитам в течение последнего финансового года с разбивкой по месяцам размещена на информационных стендах в подразделениях банка и на сайте www.belarusbank.by
Сохранность и возврат вкладов в ОАО "АСБ Беларусбанк" гарантируются в порядке, установленном законодательством РБ.
УНП 100325912. Лицензия на осуществление банковской деятельности НБ РБ N 1 от 28.08.2008 г.

## У Беларусі ўдакладнены паўнамоцтвы Міжведамаснай камісіі па разгляду хадайніцтваў аб вызваленні юрыдычных асобаў і ІП ад спагнанняў

**Удакладнены паўнамоцтвы і зменены склад Міжведамаснай камісіі па разгляду хадайніцтваў аб вызваленні юрыдычных асобаў і індывідуальных прадпрымальнікаў ад адміністрацыйных спагнанняў. Гэта прадугледжана ўказам № 228 «Аб унясенні змяненняў і дапаўнення ва Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 17 кастрычніка 2005 г. № 481», які падпісаў кіраўнік дзяржавы.**

Нарматыўным актам устаноўлена, што парадак ўнясення на разгляд Прэзідэнта Беларусі хадайніцтваў аб вызваленні юрыдычных асобаў і індывідуальных прадпрымальнікаў ад адміністрацыйных спагнанняў, устаноўлены ўказам № 481, можа прымяняцца для вызвалення ад выплаты пені, налічанай у адпаведнасці з пунктам 9 парадку разлікаў паміж юрыдычнымі асобамі, індывідуальнымі прадпрымальнікамі ў Рэспубліцы Беларусь, зацверджанага ўказам Прэзідэнта Беларусі ад 29 чэрвеня 2000 года № 359.

Прадугледжана выплата суб'ектамі гаспадарання, якія атрымалі за кошт сродкаў бюджэтаў папярэднюю аплату і не выканалі або неналежна выканалі абавязацельства па пастаўцы тавару (прадукцыі), выкананні работ, аказанні паслуг у тэрміны, вызначаныя дагаворамі, пені пакупніку (заказчыку) за кожны пратэрмінаваны дзень з залічэннем яе ў даход адпаведнага бюджэту. Да прыняцця ўказа прававы механізм вызвалення ад гэтай пені адсутнічаў.

У сувязі з кадравымі перастаноўкамі карэктуецца склад міжведамаснай камісіі. У яе ўключаны міністр па падатках і зборах Уладзімір Палуян, міністр эканомікі Мікалай Снапкоў, міністр працы і сацыяльнай абароны Мар'яна Шчоткіна. Выключаны са складу камісіі Ганна Дзяйко, Мікалай Зайчанка, Уладзімір Патупчык.

Указ уступае ў сілу з дня яго афіцыйнага апублікавання.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

# БЕЛАРУСЬ І РАСІЯ ЯШЧЭ МОГУЦЬ НАГНАЦЬ АДСТАВАННЕ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што ў Беларусі і Расіі і раней былі рознагалоссі, але калі сустракаліся прэзідэнты дзвюх краін, заўсёды прымаліся глабальныя рашэнні. «І Саюзная дзяржава была задумана тады, і мы прайшлі вельмі вялікі шлях. І не было такіх эканамічных сутыкненняў у нас з Расійскай Федэрацыяй. І Ельцын заўсёды мяне падтрымліваў і беларускі народ. Заўсёды! Расіі тады было вельмі цяжка. Але ён падтрымліваў», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

На просьбу журналіста агенцтва ацаніць работу Дзмітрыя Мядзведзева на пасадзе Прэзідэнта, Аляксандр Лукашэнка заявіў, што не будзе даваць ніякіх ацэнак. Што ж датычыцца выказванняў аб тым, што Мядзведзеў нібыта знаходзіцца ў цені Пуціна, то Прэзідэнт Беларусі назваў гэта выдумкай журналістаў: «Ніякага там ценю не было. Патрэбны наогул нейкі час, каб у такой гіганцкай краіне чалавек, які ўпершыню прыйшоў да ўлады (Мядзведзеў жа ўпершыню прыйшоў да ўлады, зусім малады палітык, можна сказаць яшчэ, што і вопыту такога не было)... Ядзерная краіна — трэба быць акуратным, асцярожным. Ён і акуратна, і асцярожна працуе Прэзідэнтам».

«Як бачыце, апошнім часам Мядзведзеў зусім іншы, чым год-два таму. Ён дзейнічае як Прэзідэнт. Вазьміце пагадненне з Украінай па Севастопалі. Паглядзіце па Нарвегіі, па гэтым вектары. Ён жа вельмі шмат кардынальных рашэнняў прыняў з гэтым кіраўніцтвам — тое, што раней не было прынята. Ды і ўнутры краіны ён сябе пазіцыняе ўсё больш і больш як моцны Прэзідэнт, як і належыць па Канстытуцыі», — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы. Ён таксама дадаў, што паміж двума палітыкамі ў Расіі — прэзідэнтам і прэм'ерам — ёсць пэўны падзел паўнамоцтваў, аднак гэта іх уласны выбар.

Беларусь здабыла ў Захаду рэпутацыю адказнага партнёра, заявіў Прэзідэнт Беларусі.

«З намі ахвотна супрацоўнічаюць міжнародныя фінансавыя структуры, таму што ведаюць: калі мы нешта паабяцалі — абавязкова гэта выканаем», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Прэзідэнт нагадаў, што апошнім часам у Беларусі выбудоўваюцца вельмі плённыя адносіны з Захадам па лініі бізнэсу і фінансаў, развіваюцца кантакты з МВФ, Сусветным банкам, ЕБРР. «Гэта значыць, тут зроблена нямала», — падкрэсліў ён.

Кіраўнік дзяржавы таксама адзначыў наяўнасць кантактаў у палітычнай сферы на ўсіх узроўнях, уключаючы ўзровень Прэзідэнта. «Апошнім часам мы нямала зрабілі ў выбудоўванні нармальных, добрасуседскіх адносінаў з нашымі заходнімі партнёрамі», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Пры гэтым беларускі лідар дадаў: «Калі браць усё супрацоўніцтва ў цэлым, то я не сказаў бы, што зроблена ўсё, на што мы разлічвалі, і што Захад пайшоў нам насустрач».

«Ёсць добрыя зрухі ў нашых адносінах, ёсць нядрэнныя вынікі, але гэта працэс неспраўджаных надзей як з боку Захаду, калі чытаць тое, што вашы палітыкі заяўляюць, так і з нашага боку. Мы чакалі ад Захаду большага», — сказаў Прэзідэнт.

Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што беларуская дзяржава не пацерпіць ніякага націску з боку заходніх палітыкаў. «Нас ніхто не будзе пхаць у спіну, намі ніхто не будзе панукваць, намі ніхто не будзе камандаваць. Усім давядзецца змірыцца з тым, што тут ёсць суверэнная незалежная дзяржава, ёсць народ, гераічны народ. Мы кожнага трэцяга страцілі падчас вайны. І я лічу, што як Вялікабрытанія, Францыя, ЗША — нашы саюзнікі ў гэтай вайне, так і Германія павінны быць удзячны беларускаму народу. І калі Германія вінавата ў тым, што адбылося ў гісторыі, і яна павінна ведаць аб гэтым і кампенсаваць Беларусі — я не гавару аб фінансавай кампенсацыі, а хаця б у павазе і ўзаемаадносінах кампенсаваць усё тое, што здарылася, — так і краіны кааліцыі павінны не забываць аб тым, што беларускі народ вельмі шмат паклаў на алтар перамогі, нашай агульнай перамогі», — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы.

«Добрая ініцыятыва — «Усходняе партнёрства». Я лічу, што Еўрасаюзу сапраўды на граніцах, важных граніцах на ўсходзе, абсалютна не патрэбна нестабільная дзяржава, не патрэбны непрадказальныя рэжымы. Хіба ж было б дрэнна, калі б мы ў рамках «Усходняга партнёрства» змаглі і Украіну, і Беларусь, і іншыя краіны, якія ў гэтым удзельнічаюць, падцягнуць да ўзроўню заходнееўрапейскіх дзяржаў? Гэта было б нармальна: большы рынак, развіццё адносінаў, выгадная транзітная палітыка. Ужо колькі мы гаворым аб гэтым «Усходнім партнёрстве» — але ж нічога не адбываецца!» — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

«Ну што ж, гэта справа больш Еўрасаюза, мы пачакаем. Але гэта ўтварэнне, якое яшчэ не сфарміравалася, — «Усходняе партнёрства» — ужо сёння нам заяўляе: «Вось будзе нейкая парламенцкая арганізацыя ЕЎРАНЕСТ. І вось усе дзяржавы, якія ўваходзяць ва «Усходняе партнёрства», будуць прадстаўлены парламентарыямі, а Беларусь павінна быць прадстаўлена не толькі выбраным народам парламентам, але яшчэ і нейкімі самазванцамі. Чаму да нас такое стаўленне? — абурыўся беларускі лідар. — Што, у нашых дзяржаў — партнёраў па «Усходнім партнёрстве» не такія праблемы, як у Беларусі? Ды яшчэ больш праблем. Чаму вы да нас падыходзіце гэтак, а да іх інакш?»

...«Калі вы такіх крокаў хочаце, каб мы праз выбарчае заканадаўства ўсё тут зламалі, то гэтага не будзе ніколі. І наверце, не толькі пры мне не будзе. Які тут ні быў бы Прэзідэнт, калі, вядома, ён будзе прабеларускі, калі ён будзе дбаць аб сваёй краіне, сваім народзе, ён ніколі не пойдзе на тое, што патрабуе Захад», — упэўнены кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка пры гэтым падкрэсліў, што наша краіна поўнасцю адкрыта для супрацоўніцтва з Захадам. «Калі Еўропа гатовая і хоча з намі супрацоўнічаць па ўсіх напрамках, калі ласка, прыязджайце. Мы не можам закрыцца: у нас эканоміка адкрытая, мы 75—80 працэнтаў выраблената экспартуем. Па гэтай прычыне мы не можам закрыцца ад усяго свету і праводзім адкрытую палітыку», — адзначыў ён.

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, Мінск гатовы зрабіць «роўна столькі крокаў, наколькі да гэтага гатовы Захад». «Ведаеце, я не магу нават вам сказаць аб тых кроках, вельмі значных для нас, якія я зрабіў. І Захад мяне «кінуў», — дадаў кіраўнік дзяржавы. — І гэта нам дорага каштавала. І я зразумеў, яшчэ раз падкрэсліваю, што на Захадзе проста вялікая колькасць безадказных палітыкаў. Яны забываюць аб тым, што гаварылі ўчора. Непасля-доўныя. Вось, разумееце, у іх добра сёння, быццам с крызісу выходзім: а потым, маўляў, паглядзім, як складзецца...»

«Таму не трэба ад нас патрабаваць нейкіх крокаў. Мы робім вельмі шмат крокаў — сотні, можа, тысячы за год. Але крокаў, якія задавольваюць нас і наш народ... Але Захад чамусьці хоча нейкіх іншых крокаў — «аддай бясплатна прадпрыемства», так званая прыватызацыя, «рэнтабельнае, высокадаходнае прадпрыемства — аддай». Гэта, дарэчы, не толькі Захаду датычыцца. Я сказаў, як мы будзем у гэтым напрамку дзейнічаць», — рэзюмаваў Прэзідэнт.

Адказваючы на пытанне аб тым, якіх крокаў Мінск чакае ад Захаду, кіраўнік дзяржавы сказаў: «Што датычыцца эканомікі — зона свабоднага гандлю, сістэма абагульненых прэферэнцый. Чаму вы нас адтуль выключылі? Гэта што, вам на страту? Вы павінны былі дапусціць нас на роўных умовах без дыскрымінацыі на свае рынкі, мы ж вас не дыскрымінуем у Беларусі. Вы гэтага не зрабілі. І ўсё нам выстаўляеце нейкія ўмовы... Я яшчэ раз падкрэсліваю: я ведаю, да чаго зводзяцца гэтыя ўмовы: вам не падабаецца Лукашэнка. Давядзецца пацярпець — выбар зробіць беларускі народ».

Аляксандр Лукашэнка асабліва падкрэсліў неабходнасць зняцця як эканамічных, так і візавых абмежаванняў. «Усялякія санкцыі павінны быць зняты. Гэта, па-першае. Па-другое, візы для нашых грамадзян павінны быць такімі, як для нашых суседзяў. Вы ж багатыя, чаго вы нам заломліваеце цану 60 еўра?» — абурыўся Прэзідэнт.

Каментуючы пытанне аб магчымасці адмены смяротнай кары ў Беларусі, кіраўнік дзяржавы нагадаў, што пераважная большасць беларускага грамадства выказваецца за захаванне ў краіне вышэйшай меры пакарання. «У свой час мы ўвялі маратарый на смяротную кару як выключнае пакаранне, пераважная большасць, атрымліваюць, як і ў вас, пажыццёвае зняволенне. Калі толькі хоць самая малая зачэпка недзе ў суда ёсць, што можа быць дапушчана памылка, то ў нас ёсць альтэрнатыва — пажыццёвае зняволенне. Але, выбачайце, калі нядоглік і падонак здзекуецца над вашымі дзецьмі і забівае іх... Вось расіяне ўвялі мараторый на пакаранне смерцю. Спытайце ў кіраўніцтва Расіі і расіян: яны ў захапленні ад гэтага? Не!» — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Мінск не прыме любыя патрабаванні аб выдачы К. Бакіева.

«Да мяне афіцыйна ніхто не звяртаўся. І адразу хачу заявіць, што гэтыя звароты будуць дарэмныя, таму што яны ведаюць, які будзе адказ ад Лукашэнкі. Прэзідэнт Кыргызстана знаходзіцца пад абаронай беларускай дзяржавы і Прэзідэнта. Прэзідэнт Кыргызстана і сёння Прэзідэнт. Яго ніхто не пазбавіў паўнамоцтваў. Нават калі б ён захацеў пайсці ў адстаўку, то па Канстытуцыі яе няма каму прымаць — парламент жа таксама разагналі. Таму ён сёння адзіны легітымны чалавек. І ён жа не рвецца ў Кыргызстан, каб вярнуцца і зноў стаць Прэзідэнтам, хоць гэта было б зразумела. Ён адкрыта заяўляе, перажываючы за сваю краіну і народ, што ён гатовы аказаць дапамогу ў выхадзе з юрыдычнага тупіка ўсёй краіны і так званага часовага ўрада», — адзначыў беларускі лідар.

...Прэзідэнт Беларусі нагадаў, што толькі 9 месяцаў таму кыргызскі народ выбраў свайго Прэзідэнта. «Там назіралі ўсе пільна: і Захад, і Амерыка, і СНД. І ўсе ў адзін голас прызналі гэтыя выбары. Прызналі Бакіева законным Прэзідэнтам. Што здарылася праз 9 месяцаў? Каму ён стаў непажаданы?» — абурыўся беларускі лідар. «І з гэтага пункту гледжання — што мяне папракаць, тым больш Расіі? Гэта што ў іх, першы раз здарылася? Калі гэтага ж Прэзідэнта за рукі прывялі да ўлады, праўда, тады без стральбы, дзе апынуўся папярэдні Прэзідэнт Кыргызстана Аскар Акаеў, дзе? У Расіі. Яны спакойна працаўладкавалі яго. Я працаўладкаваў, груба кажучы, прыняў гэтага Прэзідэнта. Што тут не так? Або Расіі можна, а нам нельга?», — сказаў ён.

Аляксандр Лукашэнка, адказваючы на пытанне журналіста, выказаў упэўненасць, што кыргызскі сцэнарый у Беларусі немагчымы. «Вы добра ведаеце, што Беларусь — гэта не Кыргызстан. І любы, хто паспрабуе ў Беларусі зрабіць падобным чынам, будзе заўсёды, уважаючы, думаць: наколькі гэта будзе шкодна для яго самога. Гэта зрабіць сабе на шкоду. Беларусь — цэнтр Еўропы, цывілізаванага свету. Таму тут па прычыне іншых, у тым ліку, фактараў гэта немагчыма, — сказаў ён. — Што датычыцца таго, ці стаяла Расія за падзеямі ў Кыргызстане... У мяне звестак няма. Але заявы расійскіх палітыкаў у час гэтага дзяржаўнага перавароту і пасля яго насцярожваюць. Гэтак жа, як і вас».

На думку Прэзідэнта Беларусі, Расія і ЗША тым, што падтрымліваюць незаконнае фарміраванне і ўрад, які насільным шляхам прыйшоў да ўлады, па сутнасці, стварылі небяспечны прэцэдэнт.

Беларусь настойвае на пабудове Мытнага саюза на раўнапраўных прынцыпах.

На думку беларускага лідара, існуюць класічныя прынцыпы пабудовы таго ці іншага аб'яднання...

«У Еўрапейскім саюзе паміж еўрапейскімі дзяржавамі ёсць якія-небудзь мытныя пошліны? Няма. Ніякіх граніц: ні эканамічных, ні мытных, нават і пагранічных. Няма іх. Усё ўніфікавана, як у адной дзяржаве. І гэта правільна», — лічыць Прэзідэнт.

«А чаму мы, выбудоўваючы Мытны саюз, павінны зыходзіць з іншых прынцыпаў? Не павінны, — адзначыў кіраўнік беларускай дзяржавы. — Тут вырашылі зрабіць выключэнне. Гэта сведчыць аб чым? Што ў нас нераўнапраўныя адносіны: вось захацела адна дзяржава «нахіліць» другую — увялі мытныя пошліны. Вы лічыце, што ў гэтага аб'яднання ёсць перспектывы? Наўрад ці, калі мы будзем адыходзіць ад нашых дамоўленасцяў і калі мы будзем парушаць фундаментальныя прынцыпы пабудовы гэтага Мытнага саюза і гэтай арганізацыі».

У той жа час Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што Беларусь, Казахстан і Расія пакуль толькі ў пачатку шляху па фарміраванні Мытнага саюза. З 1 студзеня быў уведзены Адзіны мытны тарыф. З 1 ліпеня плануецца зняць усялякі кантроль на ўнутраных граніцах і перавесці яго на знешнія. «Вядома, калі там будзе дыскрымінацыя ў адносінах да нас, то нам такое аб'яднанне не патрэбна, нам гэта дыскрымінацыя не патрэбна. Але я лічу, што і Расія, і Казахстан (а ім гэта вельмі важна і з палітычнага, і з эканамічнага пункту гледжання, асабліва для Расіі), ніколі не пойдуць на разбурэнне свайго дзіцішча, на разбурэнне свайго дзіцяці. А калі не пойдуць, значыць, будуць будаваць на раўнапраўных, фундаментальных прынцыпах Мытнага саюза нашы адносіны», — перакананы кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт таксама падкрэсліў, што пакуль яшчэ дачасна гаварыць аб выхадзе Беларусі з Мытнага саюза. «Выходзіць, яшчэ не ўвайшоўшы, — наўрад ці гэта будзе правільна, — адзначыў ён. — Пажывём — пабачым. Паглядзім, як будзе складвацца сітуацыя. Але мы нацэлены на тое і прыхільнікі таго, каб гэта быў цесны саюз, пакуль трох дзяржаў, але я ўпэўнены, што, калі гэта ўсё нармальна пойдзе, да нас далучацца і іншыя».

«Беларусь заўсёды была краінай, якая выступала за інтэграцыю на постсавецкай прасторы», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. «І калі дэзінтэграцыйныя працэсы адбываюцца, яны нас не проста хвалююць, а мы вельмі перажываем наконт гэтага. Я вельмі выразна разумею, што сабою ўяўляе СНД, ЕўрАзЭС, АДКБ. Ну што гэта за арганізацыя, калі ў яе рамках адбываецца нешта падобнае да кыргызскіх падзей. Увяце, што ў НАТА ў нейкай краіне здарылася б такая падзея? Вы што, хочаце сказаць, што гэта засталося б без увагі арганізацыі? Не. Імгненна адрэагавалі б, на працягу некалькіх гадзін. У нас ужо мінула паўмесяца, па-мойму, — цішыня... Ну і што гэта за арганізацыя?» — абурыўся Аляксандр Лукашэнка.

Аляксандр Лукашэнка заявіў, што на гэты час няма фактараў, якія прымусілі б яго адмовіцца ад удзелу ў прэзідэнцкіх выбарах.

«Што датычыцца майго ўдзелу... Я рашэння гэтага не прымаў. І шчыра вам скажу, што я не сяджу і не ўзважваю за і супраць, я проста аб гэтым не думаю», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

«Але адкрыта вам скажу, што цяпер такіх фактараў, якія прымусілі б мяне адмовіцца ад удзелу ў гэтых выбарах, няма. Няма такіх фактараў, якія б, ведаеце, усяму народу давалі сігнал, што Лукашэнка не павінен удзельнічаць у гэтых выбарах, — адзначыў ён. — Напэўна, наадварот, калі б я адмовіўся, то народ бы мяне не зразумеў. Гэта нейкая баязлівасць... Ну, ідзі на выбары: прайграеш — прайграеш, выйграеш — выйграеш. Таму я спакойна да гэтага стаўлюся».

Аляксандр Лукашэнка таксама адзначыў, што не думаў над тым, у якім узросце пойдзе з прэзідэнцкай пасады. «Справа ж не ва ўзросце. А справа ў стане чалавека і ў магчымасці, у здольнасці забяспечыць той або іншы працэс і выканаць тыя абавязацельствы, якія ты на сябе бярэш. А народ, усё гэта бачачы, супастаўляе і галасуе за або супраць», — сказаў ён.

«Што датычыцца майго ўзросту, то я вам павінен сказаць, што я вельмі рана стаў Прэзідэнтам, таму вам ужо ў нейкай ступені, напэўна, надакучыў, — дадаў Аляксандр Лукашэнка. — А ў маім узросце толькі-толькі становяцца сталымі палітыкамі, толькі-толькі становяцца прэзідэнтамі. Раней — небяспечна».

На пытанне журналіста, ці ёсць у Аляксандра Лукашэнкі планы, пайшоўшы з прэзідэнцкай пасады, пакінуць гэту пасаду сваім сынам, ён адказаў: «У мяне такіх планаў, паверце, няма. Каб мой сын стаў прэзідэнтам? Я неяк гаварыў, што мае дзеці «наеліся» майго прэзідэнцтва, што наўрад ці яны захочуць быць прэзідэнтамі пасля мяне». Кіраўнік дзяржавы таксама дадаў, што ў Беларусі пасада Прэзідэнта ў спадчыну не перадаецца.

Нікому звонку не будзе дазволена змяніць у Беларусі ўладу, заявіў Аляксандр Лукашэнка.

«Нікому, як бы ні склалася тут сітуацыя, не будзе дазволена і ў яго не будзе ніякай магчымасці змяніць тут уладу і паставіць сваю, нават у амерыканцаў. Гэта немагчыма!» — сказаў кіраўнік дзяржавы, адказваючы на пытанне, ці існуюць нейкія сілы на Захадзе або Усходзе, якія жадаюць умяшацца ў ход прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі.

«Беларусы ж не ў бананавай краіне жывуць! Гэта адукаваныя, нармальныя людзі. І калі толькі вы папрабуеце ім навязаць волю — яны зробяць наадварот. Таму ні Расіі, ні Амерыцы, ні Еўрасаюзу не дазволена ўмешвацца празмерна і адкрыта ў нашы выбары», — адзначыў Прэзідэнт. «Таму я абсалютна не хвалююся, што недзе ў Расіі, або ў Еўрасаюзе, або ў Амерыцы ўжо нехта пачаў варушэнне, каб зняць дзейнага прэзідэнта і паставіць свайго», — дадаў ён.

У той жа час Аляксандр Лукашэнка не думае, што такія працэсы ўжо адбываюцца. На яго думку, Расіі нявыгадна тут мяняць дзейную ўладу. «Давайце возьмем Расію. У Расіі, можа, хтосьці і хацеў бы, каб тут быў іншы прэзідэнт. Чым жа дрэнны для іх Лукашэнка? Толькі тым, што ён не кланяецца, не сядзіць пад Крамлём і не просіць падачкі і мае сваю пазіцыю, адстойвае незалежнасць сваёй дзяржавы. Але ўсё астатняе ж тут прарасійскае. У нас дзяржаўныя мовы беларуская і руская. Але расіяне заўсёды настойваюць, каб руская мова культывавалася ў тых або іншых дзяржавах. Вельмі балюча рэагуюць, калі ўшчамляецца руская мова. У нас гэта ёсць? Не. Правы рускага чалавека ў нас ушчамляюцца? Не. Ды ў нас палавіна ўрада — рускія», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

«У нас што, крымінальная краіна, бандыцкая, карумпаваная? Не. Дай бог, каб Расія такая была. Мы што, не выконваем свае абавязацельствы, узятыя перад Расіяй па абароне, па іншых пытаннях? Не. Мы што, расійскія прыродныя рэсурсы не транспартуем праз сваю тэрыторыю на Захад? Ды не, нармальна ўсё. Тады што трэба? Ад дабра дабра не шукаюць — у нас ёсць такая прымаўка. Таму так, Лукашэнка вось такі — яго нельга нахіліць. Але, з іншага боку, тая палітыка, якую праводзіць Лукашэнка, — гэта ж карысць для Расіі. Дык чаго тут скакаць, кідацца і чагосьці шукаць новага?» — адзначыў Прэзідэнт. «Я не лічу, што ў Расіі палітычная эліта і нават кіраўніцтва краіны, для якога я не вельмі зручны, будуць некага шукаць тут», — дадаў ён.

Што ж датычыцца Захаду, то, на думку кіраўніка дзяржавы, яму было б выгадна, калі б у Беларусі не было Лукашэнкі. «Захад апладзіраваў бы, калі б заўтра тут не было Лукашэнкі. Расія — не, а Захад — бы апладзіраваў», — сказаў Прэзідэнт. «І я гэта добра разумею. Але выгадна было б толькі ў тым выпадку, калі б прыйшоў іх чалавек», — адзначыў беларускі лідар. «Усе, хто змагаецца супраць Лукашэнкі, заходнеарыентаваны. А з Расіяй яны проста спрабуюць заігрываць. Але ў Расіі дурняў няма, яны ж вельмі добра разумеюць і нармальна ацэньваюць тут сітуацыю. Наколькі, вядома, яны інфармаваны аб працэсах, якія адбываюцца ў Беларусі», — сказаў ён.

«Таму калі вы перажываеце наконт таго, што тут, за мяжой усе нейкія працэсы пачаліся, накіраваныя на зняцце прэзідэнта, то не перажывайце», — падагульніў Аляксандр Лукашэнка.

**Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### У ПРЭЗІДЭНЦКІХ РЭЙТЫНГАХ ПОЛЬШЧЫ ЛІДЗІРУЕ КАМАРОЎСКІ

**Спікер польскага Сойма Браніслаў Камароўскі па-ранейшаму лідзіруе ў прэзідэнцкіх рэйтынгах у Польшчы, сведчаць вынікі даследавання, праведзенага цэнтрам Millward Brown SMG KRC.**

Дзясятага красавіка ў авіякатастрофе пад Смаленскам загінуў прэзідэнт Польшчы Лех Качыньскі. У гэтай сувязі, па канстытуцыі краіны, паўнамоцтвы кіраўніка дзяржавы аўтаматычна перайшлі да спікера ніжняй палаты парламента Браніслава Камароўскага. Ён прызначыў дату правядзення датэрміновых выбараў на 20 чэрвеня. Магчымы другі тур выбараў адбудзецца 4 ліпеня.

Паводле звестак апытання, у першым туры Браніслаў Камароўскі можа атрымаць 45 % галасоў выбаршчыкаў, Яраслаў Качыньскі (экспрэм'ер, лідар партыі «Права і справядлівасць») — 30 %, Гжегаж Напаральскі (лідар Саюза дэмакратычных левых сілаў) — 5 %. У другім туры прэзідэнцкіх выбараў за Камароўскага гатовыя аддаць свае галасы 55 % палякаў, за Яраслава Качыньскага — 34 %. Пры гэтым 70 % рэспандэнтаў лічаць, што пасля трагічнай гібелі ў авіякатастрофе Леха Качыньскага, Браніслаў Камароўскі добра спраўляецца з выкананнем абавязкаў кіраўніка дзяржавы.

### МІНАБАРОНЫ РФ УДАКЛАДНІЛА ЗВЕСТКІ ПРА СТРАТЫ Ў ВАВ

Начальнік управлення Мінабароны РФ па ўвекавечанні памяці загінулых пры абароне айчыны, генерал-маёр Аляксандр Кірылін 5 мая паведаміў, што агульныя людскія страты СССР у выніку Вялікай Айчыннай вайны, паводле ўдакладненых звестак, склалі 26,6 мільёна чалавек. У тым ліку беззваротныя страты савецкіх узброеных сілаў склалі каля 8,6 мільёна чалавек. Паводле слоў генерал-маёра, удакладненыя лічбы будуць дакладзены кіраўніцтву Расійскай Федэрацыі, з тым каб іх зацвердзілі і афіцыйна апублікавалі.

### У ГРЭЦЫІ АДБЫЛІСЯ СУТЫКНЕННІ ДЭМАНСТРАНТАЎ З ПАЛІЦЫЯЙ

**Агульнанацыянальны страйк у Грэцыі прывёў да беспарадкаў. Як паведамляе АР, сутыкненні дэманстрантаў з паліцыяй адбыліся ў Афінах і Салоніках.**

У сталіцы каля 60 пратэстантаў паспрабавалі прадрацца праз шэрагі паліцыянтаў, якія ахоўваюць будынак парламента. Дэманстранты кідалі ў паліцыянтаў камяні, на што тыя адказалі выкарыстаннем слязістага газу. У цэнтры Афінаў некалькі дзясяткаў маладых людзей таксама кідалі бутэлькі з запальнай сумессю ў будынкі крамаў і банкаў. У выніку адзін з будынкаў банкаў у цэнтры Афінаў загарэўся, пажарныя паведамілі пра аднаго загінулага. У Салоніках пратэстанты, у большасці сваёй таксама маладыя людзі, разбілі вітрыны некалькіх крамаў і рэстаранаў.

Страйк быў абвешчаны ў адказ на прапанаваны ўрадам Грэцыі план скарачэння бюджэтных выдаткаў з мэтай атрымання фінансавай дапамогі ад краін ЕС. У прыватнасці, для атрымання крэдыту ўрад павялічыў падаткі і абвясціў пра скарачэнне зарплат і пенсій.

### МАСКОЎСКІЯ ЧЫНОЎНІКІ ЎПЕРШЫНЮ ДАЛІ СПРАВАЗДАЧУ АБ ПРЫБЫТКАХ: СВАІХ І РОДНЫХ

**Члены маскоўскага ўрада ўслед за справаздачай мэра Юрыя Лужкова ўпершыню апублікавалі інфармацыю пра свае гадавыя прыбыткі і маёмасць, а таксама аб прыбытках сваіх мужоў-жонак. Аказалася, што сталічныя чыноўнікі аддаюць перавагу ўкладвацца ў нерухомасць і любяць прадукцыю айчыннага аўтапрама і снегаходы. А ў прэфекта Заходняй акругі, піша GZT.ru, ёсць нават уласная царква.**

Нагадаем, як стала вядома напярэдадні, мэр Масквы зарабіў за 2009 год толькі 7,98 млн рублёў (каля 275,2 тыс. доларaў), у той час, як сукупны заробак яго жонкі, першай па памеры багацця жанчыны Расіі — Алены Батурынай — склаў 30,942 млрд рублёў (больш 1 млрд доларaў).

Паводле інфармацыі на сайце маскоўскага ўрада, апроч уласнай жонкі, Лужкова па ўзроўні заробку абагналі таксама чацвёра яго падначаленых. У тым ліку прэфект Паўночнай акругі Алег Мітволь, які зарабіў за год 18,194 млн рублёў. Самы багаты сталічны чыноўнік за мінулы год зарабіў амаль у тры разы больш за мэра. Шэраг маскоўскіх чыноўнікаў, верагодна, не бянтэжыць той факт, што багацце іх жонак часта значна перавышае іх уласнае. Жонка Уладзіміра Рэсіна зарабіла за 2009 год на 10 млн руб. больш за мужа. Яе прыбытак склаў 29,235 млн руб.

Самы ўражлівы спіс нерухомай маёмасці прадставіў у падатковую прэфект Юры Алпатаў. У яго валоданні, паводле дэкларацыі, — 17 зямельных участкаў (плошча самага вялікага з якіх складае 147 тыс. кв.м, а самага маленькага — 398 кв.м), шэсць жылых дамоў (плошчай ад 40 кв. м да 206 кв. м), тры кватэры (ад 36,4 кв.м да 201 кв. м), яшчэ чатыры жылыя будынкі і адзін нежылы на дачных участках. Самае цікавае: у яго дэкларацыі значыцца таксама валоданне будынкам царквы плошчай 150,8 кв. м.

Перажытае-незабытае

## І НІВОДЗІН З ІХ НЕ ВЯРНУЎСЯ...

**У маіх аднавяскоўцаў Лукер'і Трафімаўны і Арцёма Карпавіча Ахрамовічаў (светлай памяці ім абаім!) дзяцей было трое. Да вайны скончылі Бардзілаўскую сыраэднюю школу, былі здольныя, мо нават таленавітыя...**

Першы, Ілья, як інвалід з дзяцінства, меў права застацца дома, не ваяваць. Але на фронт пайшоў — дабравольцам і прапаў без вестак.

Другі, Валодзя, іграў на многіх музычных інструментах...

Партызаніў, загінуў у няроўным баі з фашыстамі каля вёскі Дражня Старадарожскага раёна, дзе і пахаваны.

Трэці, Аляксей, добра ведаў нямецкую мову, прыгожа маляваў. Да вайны паступіў у ваеннае вучылішча — скончыў яго экстэрнам і адразу на фронт. Там, пад Масквой, ён загінуў. А мог жа стаць знакамітым мастаком: маці вельмі доўга берагла яго лісткі з малюнкамі...

Адна за адной у хату да Лукер'і Трафімаўны і Арцёма Карпавіча Ахрамовічаў прыходзілі трагічныя весткі. Сілы жыць ім давала хіба дзіця — адзіная ўнучка, Галя. Куды б ні ішлі знявечаныя горам і да часу старыя дзед і бабуля, усюды бралі і яе.

Аднак сэрцы ў людзей не з каменю, не выносяць неадступнага гора: адзін за адным сужэнцы Ахрамовічы пайшлі з жыцця.

Галю вырасціла маці, Праскоўя Пятроўна, якая больш не выходзіла замуж — так і засталася ўдавой.

...Зараз Галіна Ільінічна ўжо сама бабуля — мае ўнукаў. Але заўсёды ўспамінае, як ёй, малой, хацелася, каб хто-небудзь родны і дужы падняў яе высока-высока, і яна б тады была вельмі шчаслівая!

Сваіх дзядзькоў Валодзю і Аляксея, свайго бацькі яна не памятае.

**Святлана Пятроўна БАЧЫЛА,** *в. Бардзілаўка, Мінскі раён.*

Салдат Сталінградскай бітвы Іван КУХНАВЕЦ:

# «Я НЕ СТАЎ БЕГЧЫ, ЯК БАЯГУС, І НЯМЕЦКІ СНАЙПЕР ПЕРАСТАЎ СТРАЛЯЦЬ»

**Дванаццаць імгненняў вайны. Частка 11.**

**СУВЯЗІСТ Іван Кухнавец удзельнічаў у легендарнай Сталінградскай бітве. Пасля яе ў Другой сусветнай вайне здарыўся карэнны пералом.**

**Салдаты гінулі мільёнамі. Побач з Іванам Кухнаўцом забівала таварышаў. Сам ён быў вымушаны пад адкрытым абстрэлам звязваць перабітыя сувязныя кабелі. Аднойчы нямецкі снайпер узяў Івана Рыгоравіча на прыцэл, заставалася толькі стрэліць. Але сувязіст Кухнавец застаўся жывы.**

**Якім чынам? Ветэран распавёў карэспандэнту «Звязды» пра свой шлях у Другой сусветнай.**

— Вайна пачалася на канікулах, я ўжо працаваў настаўнікам у адной са школаў Нараўлянскага раёна, — *ветэран перанёс нас у 22 чэрвеня 1941 года.* — Была нядзеля, моладзь сабралася на ганку пачатковай школы. Раптам да нас падыходзіць паштальён Надзя і кажа: *«Вайна пачалася!»* Становішча было перадваеннае, старэйшыя пра гэта шмат размаўлялі. Усе разышліся па дамах.

Назаўтра сельсавет усіх сабраў на прыстані, адтуль нас пехам павялі на станцыю Гараднянка, што ва Украіне. Ішлі доўга, было горача, у кагосьці рваўся абутак. Некаторыя казалі: *«Хадзем назад, немцы ўсё адно перамогуць»*. Мяне ж бацька пераконваў, што гэтага не здарыцца. Ён сам ваяваў з немцамі ў 1916-м, распавядаў нават пра братанне з іх салдатамі. Але ў Нямеччыне, паводле слоў бацькі, тады таксама была савецкая рэспубліка...

На станцыі нас размясцілі ў таварныя вагоны і павезлі да Тамбова. Там, за 7 кіламетраў ад горада, знаходзіўся спецыяльны лагер для навабранцаў.

Я трапіў у роту сувязі. Нас навучалі стральбе з вінтоўкі, як надзяваць процівагаз. Мы, сувязісты, засвойвалі тэлефонны апарат.

Справа падыходзіла да восені, мы пехам пайшлі ў бок Пензенскай вобласці. Грязь, чарназём, з цяжкасцю дайшлі да Каменкі. Там нас размясцілі па кватэрах. Хадзілі на

# ЛЕПШ ЗА ГОРЫ МОГУЦЬ БЫЦЬ ТОЛЬКІ...

# БЕЛАРУСКІЯ СЯДЗІБЫ

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

У ніжняй палаце парламента цяпер якраз працуюць над папраўкамі ў закон аб турызме. Яны нацэленыя на фарміраванне прывабнага іміджу краіны. Свой унёсак тут могуць зрабіць, на думку распрацоўшчыкаў, турыстычныя інфацэнтры. Ім у законапраекце прысвечаны асобны артыкул. Ён прадугледжвае стварэнне сістэмы такіх цэнтраў як у Беларусі, так і за яе межамі. Засноўваць іх, паводле праекта, маюць права мясцовыя ўлады, юрыдычныя і фізічныя асобы. Такія ўстановы — першая крыніца ведаў пра краіну: выдатнасці, шопінг, схема транспарту, прэзентаваныя ў буклетах, даведніках і адмысловых картах. У заходнееўрапейскіх гарадах, дарэчы, карты для турыстаў бясплатныя. У Кітаі таксама, там гэтыя цэнтры — прыемныя астраўкі англамоўнасці, дзе вам дапамогуць зарыентавацца, што паглядзець і як дабрацца. Добра, што і ў нашай краіне яны атрымліваюць прапіску, прынамсі заканадаўчую. Папраўкі, дарэчы, прадугледжваюць таксама адмену турыстычнага ваўчара як формы дагавору аказання паслуг. Карацей, і тут лібералізацыя, лібералізацыя і яшчэ раз лібералізацыя. Абмазгаваць, чым яшчэ дапамагчы тургаліне, дэпутаты профільнай камісіі вырашылі ў маляўнічых ваколіцах Панямоння (дзе і адбылося выязное пасяджэнне). І праўда што — лепш адзін раз пабачыць, чым сто разоў абгаварыць!

Гатовыя да падарожжа? Тады пачынаем!

## Прыдарожныя бядоты

Першае, на што звяртае ўвагу любы вандроўнік, апынуўшыся ў дарозе... **прыдарожны сэрвіс**! Пасля некалькіх гадзін у аўтобусе здарожваемся і мы. А на абраным прыпынку — адразу два аб'екты: дзяржаўны ды прыватны. Літаральна ў пары крокаў адзін ад аднаго. Канкурэнцыя ў жывым выглядзе. І паводле ўражанняў, у прыватніка атрымліваецца лепш. Да паслуг вандроўніка — стаянка, гасцініца (тысяч за 40 вам забяспечаць дах над галавой) і кавярня. Усё тут скіравана на чалавека. Нават дзверы ў кухню не глухія, з адтулінаю. «Калі вы замовілі мяса, то пачуеце, як яго адбіваюць і абсмажваюць, нацешыцеся апетытным водарам», — кажа гаспадар. Аднак і канкурэнты па суседстве стараюцца не адставаць, прывабліваць кліента. Дзеля гэтага абяцаюць кіроўцам маршрутак бясплатны кубак кавы. Лоўка! Адзін кубак кавы — і дзясятак пасажыраў маршруткі ў вас на ганку! Гасцініцы як такой тут няма, але ж у распараджэнні падарожніка — пакоі для адпачынку (3,3 тыс. руб у гадзіну), каб душ прыняць ці прыкархнуць за тэлевізарам.

Падчас абмеркавання сышліся на тым, што прыдарожны сэрвіс варта развіваць комплексна: каб разам і запраўка, і аўтасэрвіс, і кавярня, і начлег. І як запэўніў народных абраннікаў **наместнік міністра спорту і турызму Чэслаў ШУЛЬГА**, у распрацаванай канцэпцыі закладзены якраз такі падыход:

— Прыдарожны сэрвіс будзе развівацца на аснове наяўных заправак. У комплексе — сродкі размяшчэння, харчавання, сэрвіснага абслугоўвання, турыстычна-інфармацыйны цэнтр. Каб чалавек, спыніўшыся, мог у бяспецы пакінуць машыну, адрамантаваць, калі трэба, адпачыць, душ прыняць і так далей.

Крыху адпачыўшы, зноў выпраўляемся ў дарогу. Дэпутат **Пётр ЮЖЬК**, які курыруе праект папраўак у закон аб турызме, дзеліцца з намі сваімі ўражаннямі ад айчыннага сэрвісу:

— Неяк, памятаю, з Віцебска на Гомель ехаў: 300 км мінуў — не знайшоў месца, дзе перакусіць, а потым раптам адразу тры... Мы ж павінны развіваць усё гэта пад каго? Пад чалавека! Пад турыста — ці то нашага, ці то іншаземца. Тады вынік будзе. Патрэбна сістэма: не ляпіць па тры-чатыры аб'екты пры дарозе, а размяркоўваць іх — праз 25, 50 ці 100 км, скажам, — гэта ўжо трэба спецыялістам вызначаць, — каб чалавек не «пілій» тры гадзіны ў пошуках ежы ці вады...

Турыста трэба прывабліваць «разыначкай», перакананы намеснік старшыні пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, справах сям'і і моладзі:

— Заўжды цікава, а як яно было раней? Старадаўнія музыка, танцы, спевы, побыт — вось чым прыцягваць трэба. А нам варта падтрымліваць і стымуляваць людзей, у якіх

**На гэтым здымку бестурботныя дэпутаты яшчэ і не падазраюць, што іх чакае... падарожжа да дзікіх звяроў!**

аб'екты, якія мы сёння наведваем. Аналагічныя ёсць практычна ў кожнай вобласці. Але ж гэта толькі пачатак. Створаная першасная база — мы гатовыя прымаць замежнага турыста. У нас найбагацейшая гісторыя, і мы бачым цудоўныя ўзоры таго, як можна ўсё гэта падаваць неардынарна.

## Акамфортненая даўніна

Час за размоваю ляціць непрыкметна, і мы набліжаемся да Ліды (дарэчы, Ліда стане наступнай «сталіцай» дажынак). Там, у **сядзібе** «Над Нёманам», нас ужо чакаюць гаспадары — Валерый і Аксана. Увогуле на Гродзеншчыне каля 30 сядзібаў, але ж дэпутатаў вязуць у самую лепшую, якая за апошнія гады двойчы перамагла на рэспубліканскім конкурсе. Тут усё з нацыянальным каларытам і еўрапейскім размахам, гэткая «акамфортненая» даўніна (за некалькі дзясяткаў долараў у суткі). Каларытны млынок і раскошны зімовы сад, рамантычная альтанка і драўляны домік з панарамным акном да падлогі і відам на Нёман. Апроч камфорту і каларыту гасцям прапануюць актыўны адпачынак: сплаў на плытах улетку і катанне на санях узімку, пазнавальныя вандроўкі па наваколлі, рыбалку, паходы ў грыбы і ягады. У сядзібе гаворыць па-нямецку і па-англійску, таму тут любяць гасціць замежнікі. Аднак месца папулярнае і ў айчыннай публікі. Настолькі, што замовы на лета пастаянная кліентура робіць ужо цяпер... Гаспадыню нам адрэкамендавалі як майстрыху прыгатавання нацыянальных страў і настоек з наліўкамі па старабелорускіх рэцэптах, а гаспадара — як адзінага прафесійнага гусляра ў краіне. Мы ж цікавімся ў гусляра, чым заканадаўцы могуць дапамагчы яго бізнэсу.

— Здаецца, усё ўжо зрабілі, умовы добрыя. Мінімалку заплацію у год — і працуй, прымай гасцей. Крэдыты таксама льготныя — пад пяць адсоткаў. Але ж тут сабраліся людзі, якія будуць думаць, як далей... няхай яны захаваюць гэта, можа, яшчэ хоць бы гадоў на пяць, — выказвае сваё пажаданне гаспадар. — Мы дык ужо даўно працуем, а некаторыя толькі пачалі, і калі паставіць адразу жорсткія ўмовы падаткаабкладання, то не справяцца. Нас за сем гадоў ужо многія ведаюць, няма недахопу ў кліентах, а якія толькі пачынаюць — паспрабуй зацікавіць, трэба разынку нейкую. Мне яшчэ лягчэй у тым плане, што я раблю ўсё сваімі рукамі. А калі гэта ўсё аплачваць, то ніякіх грошай не хопіць! У нас жа была база — свой дом, практычна ўсё гатовае, заставалася толькі зрабіць вось невялічкія драўляныя домікі для каларыту... Ёсць дробязі, якія можна дадаць: яшчэ адну зямляначку (вунь, бачыце, свабоднае месца), тут вось скляпок цікавы з валуноў у сярэднявечным стылі, там — невялікую банкетную залу, чалавек на 12. Гэта нескладана, трэба толькі час знайсці — у перапынках паміж гасцямі.

Народныя абраннікі не абыходзяць увагай і практыку стварэння сядзібаў на базе СВК, выказваецца мноства аргументаў за мэтазгоднасць такога падыходу. І заняпалым гаспадаркам — новае жыццё, і турыстам — здаровае, натуральнае харчаванне.

Сядзіба выклікае ў дэпутатаў самыя прыемныя ўражанні, і некаторыя нават прызнаюцца, што песцяць мару аб падобным уласным куточку. Каб было дзе адпачываць на старасці. Спецыяльна да прыезду прадстаўнічых гасцей над Нёманам наладжаныя сярэднявечныя гульні са старадаўняй музыкай, танцамі, спевамі і рыцарскімі паядынкамі. Усё вельмі дынамічна і інтэрактыўна. Настолькі, што дэпутат Алег Сакадынец, вядомы сваёй непасрэднасцю і неардынарнасцю, адважна прымае выклік на рыцарскі бой. Аднак гэта яшчэ толькі кветачкі, ягадкі — наперадзе.

## Са славянскай шчодрасцю

У **Гарадзенскім маёнтку** дэпутатаў саджаюць у брычку і адпраўляюць напрасткі да... дзікіх звяроў! Тут ёсць асобныя тэрыторыі, дзе яны вольна гуляюць. Аднак народныя абраннікі ў захапленні. Задуманы як іміджавы праект Гродзенскага мясакамбіната, аграгурыстычны комплекс у Каробчыцах пакрысе становіцца рэнтабельным. Улетку тут бывае на выхадных каля дзвюх тысяч наведвальнікаў. Яно і зразумела: лясныя ўгоддзі з дзікімі жывёламі, сажалкі з рыбай, вальеры з экзатычнымі птушкамі, стайня ды манеж для язды конна — усё тут пастаўлена на шырокую нагу, са славянскім духам і славянскай шчодрасцю. Нетрывіяльны адпачынак у паўлінавым «музычным» суправаджэнні вам забяспечаны! А пасля актыўных забаў няблага падсілкавацца ў «Замку Зеваны» (у славянскай міфалогіі — багіня палявання), багата аздобленым дрэвам, скурамі і шыкоўнымі паляўнічымі трафеямі. У такім убранні добра частаваццца дзічынай і старадаўнім нацыянальным напоем — медавухай. А цэнтр коннага спорту «Амадэус», дзе гендырэктар Гродзенскага мясакамбіната Анатоль Грышук марыць аднойчы правесці Кубак міру, абяцае прыцягнуць сюды асаблівую кагорту замежных турыстаў — спадчынных заводчыкаў, заўзятых аматараў коней, гатовых укладваць у дарагое хобі салідную долю сямейнага багацця. Ёсць задума ладзіць тут і аўкцыёны...

Гатэльны сэрвіс дэпутаты таксама ацэньваюць проста на месцы. Кожны ўладальнік імкнецца заняць сваю нішу. Вось гэта гасцініца ў цэнтры горада, з развітай сістэмай зніжак. А тая — прываблівае цішшу, спакоем і элітарнасцю: тут ёсць крыты басейн з відам на сасновы бор і рэстаран, дзе ў кожнага афіцыянта ў актыве вышэйшая адукацыя і адна-дзве замежныя мовы. Кошт нумару, як падмецілі народныя абраннікі, — сярэдні заробак беларуса. Маўляў, для іншаземцаў гэта танна. А іншаземцаў і насамрэч хапае. Аднак і беларус — нярэдкі госць. Асабліва тут любяць спраўляць вяселлі.

На прыкладзе гродзенскага турысцка-інфармацыйнага цэнтра парламентарыі знаёмяцца з практыкай прыцягнення міжнародных грантаў, а на ўзоры Аквацэнтра — з удалым перараджэннем стратнага прадпрыемства ў папулярнае месца адпачынку. На змену сістэме сеансаў прыйшла пахвілінная тарыфікацыя (можна прыйсці ў любы зручны час і прабыць столькі, колькі душы заўгодна). Дзякуючы чыпавай сістэме пропуску, фіксуецца, дзе і колькі быў наведвальнік — калі ён затрымаўся больш запланаванага, не трэба некуды спецыяльна ісці і даплачваць, расплаціцца можна будзе на выхадзе. Так што адпачывай сабе на здароўе — турэцкая лазня, саўна, басейн з воднымі горкамі і масажнымі струменямі, цырульня, трэнажорная зала ды памяшканне для шэйпінгу... Басейн асабліва раяць для будучых мам (спецыяльныя праграмы для цяжарных і камфортныя ўмовы, падагрэў вады) і самых малых (вучаць плаваць з чатырох гадоў). Кажуць, тут нават можна праводзіць спаборніцтвы на міжнародным узроўні.

## Галоўны слоган — інвестыцыі

Гісторыка-культурнага і прыроднага хараства на Гродзеншчыне ўдосталь, а каб усё гэта нематэрыяльнае багацце зрабіць матэрыяльным — прыбытковым бізнэсам — патрэбны інвестыцыі. Ёсць задума скарыстаць для гэтага наяўную СЭЗ — далучыць сюды яшчэ і турыстычны сектар. У «Гроднатурінвест» плануецца ўключыць Аўгустоўскі канал з Нёманам, Радзівілкі, Сапоцкін і Свяцк. Для рэзідэнтаў новай СЭЗ прадугледжаная сур'ёзная падатковая палёгка, стварэнне інжынернай і транспартнай інфраструктуры таксама возьме на сябе бюджэт. Ад бізнэсоўца ж патрабуецца, каб аб'ём інвестыцый у тураб'ект быў не меншы за 200 тыс. еўра.

Дэпутатаў знаёмяць нават з канкрэтнымі інвестпрапановамі: напрыклад, культурна-рамесны комплекс з конным дваром, кузняй, ганчарнай майстэрняй ды этнавёскай. Увогуле прыярытэт будзе аддавацца агратурыстычным, гатэльна-рэстаранным, паляўнічым і рыбалоўным комплексам, кемпінгам, спа- і аквацэнтрам, аб'ектам спорту (лыжным і саначным трасам, каткам, тэнісным кортам, пляцоўкам для гольфа) і адпачынку (дыскатэкам, боўлінг-клубам, паркам атракцыёнаў).

— Гродзеншчына паказвае прыклад, што многае ў плане турызму ўжо робіцца, — падагульняе **наместнік міністра спорту і турызму Чэслаў ШУЛЬГА**. — Няхай не татальна, а толькі асобныя астраўкі дабрабыту, але ж калі лакаматыў зрушыўся, пасля пойдзе прасцей. У плане развіцця інфраструктуры Гродзенская вобласць, пасля Мінскай, з'яўляецца лідарам у краіне. І не толькі дзякуючы велізарнай спадчыне, але ўсё ж і падыходам мясцовай улады. Апошнім часам рэгулярна

ўводзіцца ў строй нешта значнае ў плане інфраструктуры — ці то гасцініца, ці то спартыўны комплекс. Усе тыя аб'екты, што мы пабачылі, уведзеныя ў строй літаральна апошнія два гады. Нягледзячы на тое, што мы ўсё часцей кажам пра крызіс, які бушуе вакол нас. І такія комплексы, як на Гродзеншчыне, з'яўляюцца ўжо і на Магілёўшчыне, Віцебшчыне...

Камфорт і развітая інфраструктура — гэта ўсё важна, але каб усім гэтым нацешыцца, няблага першнаперш патрапіць у краіну. І візавы рэжым — першая перашкода на гэтым шляху.

— Мы над гэтым працуем, — адзначае намеснік міністра. — З палякамі падпісана, з літоўцамі на выхадзе, з латышамі, я так разумею, недзе на падыходзе — пагадненне аб 50-кіламетровай (з палякамі месцамі 30-кіламетровай) бязвізавай зоне. Камбінаваныя туры ўздоўж мяжы, дзякуючы больш льготнаму наведванню, дадуць магчымасць мінімум у 1,5-2 разы павялічыць за наступную пяцігодку экспарт турпаслуг у прымежных тэрыторыях.

Наогул у вырашэнні візавага пытання міністэрства разлічвае пайсці паэтапна. Пачаць са скарачэння тэрмінаў атрымання візы, адмены павышаючых тарыфаў за тэрміновасць і гэтак далей... аж да ўвядзення бязвізавага рэжыму для краін ЕС. І, верагодна, гэта перспектыва 2012 года. Што яшчэ чакае галіну турызму ў будучыні?

— Галоўны слоган на наступную пяцігодку — **развіццё турызму праз інвестыцыі**, — акцэнтуе намеснік міністра. — Будзем стварацьдадатковыя ўмовы, каб прыйшоў інвестар і будаваў, будаваў, будаваў... Дзяржава будзе забяспечваць толькі жыццёва важныя сістэмы, такія як дарогі, энергетыка, водазабеспячэнне, астатняе павінен браць на сябе інвестар. Могуць быць сацыяльныя праекты, на ўмовах конкурснасці (50 адсоткаў бярэ дзяржава, 50 — інвестар). Гэта мы закладваем у канцэпцыю развіцця турызму на наступную пяцігодку ў плане фінансавання.

Прыярытэт — кропкавай падтрымцы. Падпісаная ўжо праграма развіцця Прыпяцкага рэгіёну. Актыўна распрацоўваецца праграма развіцця курортнай зоны Нарач. З падачы міністэрства там задумана стварыць магчымасці для адпачынку на любы густ. Ціхі адпачынак, з лячэннем і расслабленнем — ваколіцы Нарачы (мадэрнізацыя санаторыяў, новыя спацэнтры). Вясёлы, шумны, для моладзі — на Блакітных азёрах, і гэткая залатая сярэдзіна — Швакшты. Асобныя праграмы ёсць для гарадоў, напрыклад, па Полацку.

Набалелую праблему з гасцініцамі ў раёнах, асабліва каля нейкіх выдатнасцяў (усе мы ведаем, што, палюбаваўшыся нясвіжскай прыгажосцю, давядзецца вяртацца ў Мінск, бо з гасцініцамі там напружана). Як будуць вырашаць яе?

— Паводле праграмы прапаноўвалася прадугледзець больш танныя крэдытныя рэсурсы для тых, хто будзе будаваць гасцініцы турыстычнага класу (дзве-тры зоркі) у раённым цэнтры. Не пад 20 адсоткаў гадавых, як сёння, а пяць-сем, як еўрапейскі стандарт. Розніцу можа ўзяць на сябе бюджэт. Увогуле ў кожным раёне павінна быць некалькі відаў размяшчэння.

Сапраўды, галіне не хапае хіба што фінансавага стымулу, а прыродна-культурнага багацця — удосталь...

**Ала МАЧАЛАВА.**

# ХОЛДЫНГ ААТ «АГРАМАШСЭРВІС» — ТРОЙЧЫ ЛЕПШЫ

**Сто гадоў таму сельская гаспадарка трымалася на кані, плузе, сярпе і ўпартасці селяніна. Цяпер выраб прадукцыі ў гэтай сферы — вынік спалучэння высілкаў чалавека і складанай высокатэхналагічнай тэхнікі. Каб беларускія збожжа, малако і мяса заўсёды былі залогам харчовай бяспекі краіны, працуе холдынг ААТ «Аграмашсэрвіс». Тры гады запар у спаборніцтве сярод аб'яднанняў «Белагрэсэрвісу» магілёўскі холдынг займае першае месца.**

## Гарантыя працы

**ААТ «Задняпроўскі міжрайаграсэрвіс»** з'яўляецца дылерам буйных беларускіх заводаў, вытворцаў сельскагаспадарчай тэхнікі. Магілёўскія спецыялісты робяць перадпрадажную падрыхтоўку і забяспечваюць гарантыйнае абслугоўванне тэхнікі, вырабленай на МТЗ, «Амкадоры», «Гомсельмашы» і іншых прадпрыемствах.

— Аб'ёмы тэхнікі, якая праходзіць праз наш тэхнічны цэнтр, мільярдныя, — гаворыць **дырэктар Анатоль ФЯДОСАЎ**. — У асноўным яна пастаўляецца ў сельскія гаспадаркі па дзяржаўных праграмах. Наша справа — суправаджэнне. Мы гарантуем, што машыны, якія трапляюць у гаспадаркі, могуць адразу пачынаць працу.

Ужо сёлета прадпрыемства паставіла больш за 150 адзінак тэхнікі, а на гарантыйным абслугоўванні знаходзяцца 1,5 тысячы адзінак камбайнаў, трактароў, пагрузчыкаў і іншых.

Задняпроўскі міжрайаграсэрвіс мае добрую базу і кадры. У тэхнічным цэнтры працуе больш за 80 спецыялістаў, якія ў сезон, ад пасяўной да ўборачнай, працуюць па напружаным графіку з адным выхадным днём. Штодзень больш за два дзясяткі майстроў выязджаюць у сельскія гаспадаркі, каб ліквідаваць нясправаднасці тэхнікі. Калі не ўдаецца справіцца на месцы, на спецыяльнай платформе машыны забіраюць у Магілёў. Тут наладжаны аднаўленчы рамонт энерганасычаных трактароў, якія выйшлі са строю.

— Не ўсё адразу атрымліваецца, але айчынная тэхніка з кожным годам удасканальваецца, мадэрнізуецца, — каментуе Анатоль Фядосаў. — Мы таксама даём штуршок да яе развіцця, таму што засяроджваем увагу вытворцаў на пэўных недахопах. Тэхнічная думка працуе, і беларуская тэхніка становіцца лепшай.

Супрацоўнікі «Задняпроўскага міжрайаграсэрвісу» ўпэўнены ў добрых перспектывах свайго прадпрыемства: сяляне працуюць на тэхніцы, якую час ад часу даводзіцца рамантаваць. Сучасныя механізмы складаныя і патрабуюць ведання гідраўлікі і электронікі. Карацей, цяпер самастойна ключом не падціснеш і не падробіш, а патрэбен дасведчаны спецыяліст, веды і абсталяванне. Такія паслугі прапаноўвае сваім кліентам Задняпроўскі міжрайаграсэрвіс.

## «Мы спраўляемся з задачамі»

**Холдынг ААТ «Аграмашсэрвіс»** — адно з вядучых прадпрыемстваў Беларусі, якое працуе для сельскай гаспадаркі Магілёўскай вобласці: пастаўляе і рамантуе сельскагаспадарчыя машыны і абсталяванне, забяспечвае запаснымі часткамі да тэхнікі, пастаўляе ўгнаенні і хімічныя сродкі для раслінаў.

Пра працу холдынгу расказвае **генеральны дырэктар Мікалай Фёдаравіч ЧЭПІКАЎ**:

— У склад холдынгу ўваходзіць 28 прадпрыемстваў. Райаграсэрвісы працуюць у 20-ці сельскіх раёнах. Сёння мы выконваем функцыі, якія за савецкім часам мелі 4 асобныя арганізацыі — сельгастэхніка, сельгасхімія, сельэнерга і база забеспячэння. Цяпер усё гэта ў адным магутным «кулаку».

У дадатак апошнім часам мы сталі займацца ўласнай вытворчасцю тэхнікі для сяла на Казіміраўскім вопытна-эксперыментальным заводзе, ААТ «Агракамплект» і іншых.

Акрамя гэтага, дзеля справы рэфармавання стратных сельскіх гаспадарак, да нас далучаны 25 гаспадарак у 16 сельскіх раёнах. Усе яны былі стратныя, і мы іх ставім на ногі. Сёння, хоць гэта даволі складана, мы працуем без стратаў і своечасова плацім заробак. Мы спраўляемся з задачамі, якія стаяць перад намі.

**Узнагароды «Аграмашсэрвісу» захоўваюцца ў музеі развіцця сельскай гаспадаркі.**

***— Як вам гэта ўдаецца?***

— Карпатлівай працай. Мэтанакіравана працуем з кадрамі, праводзім штомесячныя нарады з выездамі на раён. Эканамічная служба вучыць спецыялістаў — галоўных бухгалтараў і намеснікаў па эканоміцы. Увогуле ў нашай сістэме працуюць 5 тысяч чалавек. Сярэдні заробак неблагі: летась ён склаў 768,8 тысячы рублёў.

Я шмат патрабую ад супрацоўнікаў і раблю стаўку на моладзь. Маладым людзям трэба даваць дарогу і вучыць іх. Яны сёння нашмат хутчэй за старэйшае пакаленне кемяць і арыентуюцца. За нашымі вопытнымі кадрамі — выдатныя арганізатарскія здольнасці, жыццёвая мудрасць. Але ўсё ж моладзь спрытная, добра ведае камп'ютары і арыентуецца ў інтэрнэце. Будучыня нашай арганізацыі — у новых тэхналогіях і падыходах.

***— Летась арганізацыі холдынгу забяспечылі выкананне асноўных прагнозных паказчыкаў сацыяльна-эканамічнага развіцця. Тэмпы росту прадукцыі і выкананых работ і паслуг склалі 116,3 % у параўнанні з 2008 годам. Тэмп росту прадукцыйнасці працы — 119,3 %. Якія задачы на сёлета?***

**Генеральны дырэктар холдынгу ААТ «Аграмашсэрвіс» Мікалай ЧЭПІКАЎ.**

— Яшчэ большыя. У прамысловай вытворчасці мы павінны даць рост у 20 %. Ці пад сілу нам такі высокі паказчык? Ну зразумела, а інакчай што мы тут робім? Выканаем! Прагнозныя паказчыкі для нашых прадпрыемстваў даводзіць раённая выканаўчая ўлада, і мы прыкладаем усе высілкі, каб кожнае структурнае падраздзяленне выканала планы.

***— Цяпер звычайна, калі нешта ўсё ж не атрымліваецца, спасылаюцца на крызіс і яго негатыўныя наступствы.***

— Калі шчыра, то я ўвогуле не люблю гэта слова і імкнуся не казаць пра крызіс. У нашай арганізацыі няма звычкі рабіць спасылкі на крызіс. Мы звычайна гаворым такім чынам: ёсць прагнозныя паказчыкі — і гэта закон, які трэба выконваць. Калі ты здольны працаваць — давай працаваць, калі не здольны — будзем шукаць іншага працаўніка...

***— ...і такім чынам вы разабраліся з крызісам.***

— Так. А калі больш сур'ёзна і канкрэтна, то палітыка дзяржавы накіравана на ўвагу да сяла і яго развіцця. Мы не можам не забяспечыць пастаўку ўгнаенняў і сродкаў для абароны раслінаў: калі вобласць разлічвае атрымаць 1,5 мільёна тон збожжа, то для дасягнення гэтага выніку, паводле агранамічных разлікаў, трэба зрабіць і пастаўкі. Гэта так жа сама, як на бохан хлеба патрэбна 20 грамаў дражджэй, іначай ён проста не падымецца. Так і з ураджаем.

І, па-другое, дзейнічае дзяржаўная праграма закупкі тэхнікі і лізінгу. Гэтым і займаецца «Аграмашсэрвіс»: бярэ крэдыты і размяшчае заказы. Апошнія гады сталі рабіць і тэхніку самі. Сельскагаспадарчая тэхніка сёння патрэбна, за яе плацяць грошы. Трэба карыстацца момантам! Без гэтага поспех прадпрыемства немагчымы.

Напрыклад, я даведаўся, што абласная ўлада плануе на наступны год націснуць на бульбаводства. Для гэтага, безумоўна, спатрэбіцца тэхніка. Я паставіў задачу, каб да 2011 года мы распрацавалі свае ўзоры тэхнікі для бульбаводаў.

Для абслугоўвання тэхнікі, якая паступае ў сельскія гаспадаркі з беларускіх прадпрыемстваў, стварылі дылерскія цэнтры. Праз Задняпроўскі міжрайаграсэрвіс у Магілёве паступае беларуская тэхніка. Але аб'ёмы павялічваюцца, таму мы адкрылі дылерскія цэнтры ў Касцюковічах і Кіраўску. У Шклове працуе цэнтр па абслугоўванні МАЗаў, і падобныя адчыняцца ў Бабруйску і Касцюковічах. Так што крызіс крызісам, але ён падказвае: хочаш жыць — пачынай круціцца.

***— У «Аграмашсэрвісе» створаны выдатны музей. Які з гістарычных этапаў развіцця прыладаў сельскагаспадарчай працы вас самога найбольш цікавіць?***

— Безумоўна, першыя трактары. І вы заўважце, якімі шпаркімі тэмпамі ідзе прагрэс. У 1980-ыя ў гаспадарках працаваў «МТЗ-50». Гэта ж быў самы каштоўны трактар, душа селяніна! На ім сеялі і аралі, і Савецкі Саюз за тым часам на сусветным рынку збожжам гандляваў. Мінула некалькі дзясяткаў гадоў, і сучасныя трактары і камбайны ўражваюць! І я часам мяркую, што ж будзе яшчэ праз столькі ж гадоў...

***— Чым, на ваш погляд, будуць апрацоўваць зямлю?***

— Замест вадзіцеля ў трактары будзе робат альбо кам'ютар, які будзе кіраваць. Праўда, праграму ўсё роўна будзе задаваць чалавек: земляроб будучыні будзе высокаадукаваным. Ды і сёння ёсць ужо правобраз будучай тэхнікі — сістэма GPS у сельскай гаспадарцы, калі праграма задаецца праз спадарожнік.

***— Значыць, сённяшні час параўнальны з першымі трактарамі па рэвалюцыйным зменам у тэхніцы?***

— Так. Мяркуйце самі: раней пасля камбайна заставалася 30 % збожжа на зямлі, а сёння — толькі 5 %. І прадукцыйнасць працы якая!

***— Якія будуць вашы пажаданні працоўнаму калектыву холдынгу ААТ «Аграмашсэрвіс»?***

— Зычу поспехаў і выканання прагнозных паказчыкаў. На кожнай планёрцы я нагадваю, што сёлета трэба годна завяршыць пяцігодку. Каб у нашых людзей павялічваўся заробак і рос дабрабыт, і каб настрой быў добры і радасны.

## Запатрабавана сялянамі

**ААТ «Казіміраўскі вопытна-эксперыментальны завод»** вырабляе тэхніку для сельскай гаспадаркі. У наменклатуры — больш за дзясятак найменняў.

Завод быў створаны 38 гадоў таму для рамонту кормаўборачнай тэхнікі, якая пастаўлялася з ГДР. У новай краіне і эканамічнай сітуацыі выйсцем аказалася вытворчасць новай сельскагаспадарчай тэхнікі. Завод фактычна перажыў сваё другое нараджэнне.

— Яшчэ ў 2006 годзе аб'ём выпрабленай прадукцыі склаў 2,5 мільярда, а ў 2009 годзе ў параўнальных цэнах — 32 мільярды, — прыводзіць дакладныя лічбы **дырэктар Аляксандр РАБЕКА**. — Так што рост вытворчасці адбыўся болей чым у 10 разоў. Сёлета мы чакаем павелічэння на чвэрць, і гэты паказчык пакуль складваецца: у 1 квартале аб'ёмы ўзраслі на 50 %.

Сённяшні дзень прадпрыемства — зернесушыльныя комплексы прадукцыйнасцю 30 тон у гадзіну. У самым пачатку завод супрацоўнічаў з польскай фірмай, якая выпрабляла львіную долю дэталяў, але сёння большасць з іх вырабляюць прама ў Магілёве. За апошнія гады Казіміраўскі завод вырабіў і ўсталяваў 56 зернесушыльных комплексаў у Магілёўскай і іншых абласцях.

**СЭУ «Днепр» — будучыня сельскай гаспадаркі.**

Прадпрыемства таксама вырабляе агрэгаты для апрацоўкі глебы, раскідвальнікі мінеральных і арганічных угнаенняў, абсталяванне для выпойвання цялят і перасоўныя даільныя ўстаноўкі. Завод імкнецца працаваць па праграме імпартазамяшчэння, стварацьпаводле замежных аналагаў сваю якасную і запатрабаваную ў сельскай гаспадарцы тэхніку.

Летась у Магілёве сталі працаваць над новай машынай. Яе рабочая назва — сродак энергетычны ўніверсальны «Днепр». СЭУ — гэта будучыня Казіміраўскага завода, і выгляд гэтай перспектыўнай машыны мае незвычайны, футурыстычны. Вялікія і тоўстыя колы (шыны-абалонкі) дазваляюць вільготнай вясной не памяць пасевы і паспяхова зрабіць падкормку, унесці ўгнаенні.

**Музей развіцця сельскай гаспадаркі.**

Сучасная хата для пастуха, выкананая са шклапластыку — яшчэ адна навінка. Утульнае спальнае месца і стол, дах над галавой у непагадзь. На заводзе імкнуцца, каб тэхнічная думка нашай інжынернай службы адпавядала патрабаванням беларускіх сялян.

**Падрыхтавала Ілона ІВАНОВА.**
**Фота Ірыны САВОСІНАЙ.**

Радавыя Перамогі

Ветэран Улас КЛІМУШКА:

# «Фотаздымкі, лісты франтавых сябровак берагу як музейныя рэліквіі, але самая лепшая жанчына — мая Соня»

91-гадовы ветэран, гумарыст і дыпламат агарошыў мяне амаль з парога, калі, ледзь акінуўшы вокам, сказаў: «Да мяне з абласной газеты прыязджала зусім маладая дзяўчына Леначка, а вы, відаць, даўно працуеце». Давялося пацвердзіць, што ў параўнанні з каляжанкай-прыгажуняй Леначкай, маладым спецыялістам, я, сапраўды, сталы журналіст, бо працую ўжо два дзясяткі гадоў. Затым шляхетны і бадзёры Улас Уласавіч запрасіў у хату і пачаў свой аповед пра вайну. І расказваў не так, як большасць ветэранаў: пра баі і паходы, пра цяжкасці, страх і рызыку, а пра тое, што найболей захавала памяць, што мілейшае сэрцу. Як непапраўны аптыміст, Улас Клімушка лічыць, што страшнае, цяжкае не тое што зусім забываецца, але адыходзіць недзе на задні план — такая ўжо абарончая рэакцыя арганізма. А светлае — помніцца. Бо жывы чалавек і на вайне жывы чалавек, і там ён шукае нешта, што хоць на час адцягне ўвагу ад баёў і паходаў.

Ветэран дастае з вялікай архіўнай папкі фотаздымак. З карткі глядзіць шыкоўная прыгажуня — жыхарка горада Мараўская Астрава тагачаснай Чэхаславакіі Вера. Гэта было мімалётнае знаёмства, але памяць засталася. Савецкія салдаты вызвалілі чэхаславацкі горад. Людзі сустракалі іх як сапраўдных вызваліцеляў, з кветкамі, нехта выносіў з дому пачастунак, іншыя стараліся хоць на словах падзякаваць. Маладому разведчыку Уласу спрыяла ў стасунках дасканалае веданне польскай мовы. У Чэхаславакіі польскую таксама добра разумелі. Першай, каго ён сустрэў на вуліцы, была дзяўчына са шчырай усмешкай. Яна папрасіла што-небудзь на памяць. У салдата не знайшлося іншага сувеніра, толькі зорачка ад пілоткі. Яе і адшпіліў. А яна пашкадавала, што не мае з сабой уласнага фотаздымка: «Вось дома магла б яго падарыць». Тады баец рашуча звярнуўся да камандзіра з просьбай адпусціць яго на пэўны час. Правёўшы дзяўчыну да хаты, вярнуўся з яе фотаздымкам, які беражэ ўжо 65 гадоў. Болей сустрэцца з Верай радавому Клімушку не давялося.

«О, гэтай кабеце, калі яна жывая, ужо гадоў дзевяноста», — прамаўляе, зазірнуўшы цераз плячо мужа, жонка ветэрана. І амаль няўлоўная іронія праслізвае ў словах. Усё-такі Соф'я Уладзіславаўна на дзесяць гадоў маладзейшая за еўрапейскую прыгажуню. А наогул, яе паблажлівасці, разуменню, памяркоўнасці ў адносінах да мужавага характару можна і павучыцца. Да яго франтавых рэліквій і ўспамінаў яна ставіцца з павагай. У яго захоўваецца цэлая перапіска яшчэ з адной дзяўчынай ужо з іншага чэшскага горада.

Улас Уласавіч дастае лісты з адмыслоўага канверта і падрабязна цытуе. А потым расказвае, як іх аднойчы, ужо пасля Перамогі, адпусцілі ў кіно. Часць заставалася ў Чэхаславакіі пэўны час. Там ён пазнаёміўся з дзяўчынай, узяў адрас. Салдата паклікалі армейскія справы, ён вярнуўся ў раён дыслакацыі сваёй часці. А перапіска з замежнымі грамадзянамі байцам рэгулярнай арміі была строга забароненая. Забарона забаронай, але наш няўрымслівы канспіратар знайшоў выйсце: ён пазнаёміўся з салдатам, чыя часць была побач з домам дзяўчыны. Таму свае лісты ён акуратна складваў трохвугольнікам і накіроўваў таварышу. А той потым перадаваў іх па ўказаным адрасе дзяўчыне. Паспеў напісаць ёй і атрымаць ад яе некалькі пісьмаў... Паспеў, пакуль не выклікаў «асабіст» і не паставіў пытанне рубам: «Ці хочаш ты скласці кампанію белым мядзведзям?». Хлопец з беларускай вёскі ведаў, што з гэтай службай канфліктаваць небяспечна, таму пачаў пісаць ёй толькі пра лёгкае і прыемнае. Адразу пасля вяртання на радзіму былы франтавік скончыў педвучылішча ў Брэсце і атрымаў накіраванне ў пачатковую школу. Правучыў дзесятак сорак гадоў, за сваю працу атрымаў званне выдатніка народнай асветы БССР.

Але не толькі чытаць і пісаць вучыў дзяцей вясковы настаўнік. Ён стараўся прывіць выхаванцам патрэбу жыць у гармоніі з прыродай, разумець яе. Разам з дзецьмі яны пасадзілі тысячы маладых дрэўцаў у парках і скверах. А яшчэ Улас Уласавіч любіў эксперыментаваць у сваёй раслінай гаспадарцы, вынаходзіць нешта новае. Выпісваў прыродазнаўчыя часопісы, праводзіў доследы на прышкольным участку. «У мяне бэз цвіў, калі я хацеў», — з усмешкай кажа ветэран. У яго вясковай школе гэта была падзея, своеасаблівы святочны рытуал. Сем гадоў запар бэз расцвітаў як па камандзе акурат напярэдадні 8 сакавіка. У архіве настаўніка захаваўся нумар раённай газеты амаль 30-гадовай даўніны, дзе на здымку яго каляжанкі-настаўніцы ў жаночы дзень стаяць з букетамі бэзу. А яшчэ літаральна некалькі гадоў таму ўжо на сваім падворку ветэран вырасціў індыйскі агурок, што важыў восем з паловай кілаграмаў. Тады яго з рэкардсменам-гуркom таксама здымалі.

У вёсцы першыя сустрэчныя жанчыны на пытанне, дзе жыве Улас Клімушка, растлумачылі так: дзе ля веснічак расце вялікая туя, там і яго хата. Потым Соф'я Уладзіславаўна расказала, як ён беражліва гадаваў дрэўца з насення. Гэтая туя гадоў колькі расла ў хаце, у вазоне, а цяпер вось стала вялікім дрэвам. Іх падворак і гародчык увесь у кветках. Пачатак красавіка, а тут цвітуць ярка-жоўтыя нарцысы, іншыя краскі толькі вылазяць з зямлі. З гаспадаркі ў Клімушкаў толькі куры ды маленькі сабачка Мухтарык. Гаспадыня сказала, што іх сабака трапіў пад машыну, вось яны і ўзялі малога шчанючка. А ўжо гэты Мухтарык — выкапаны кот, трэцца аб ногі па-кацінаму, а з гаспадыніных рук не злазіць. Абое яны яшчэ памалу працуюць у агародзе, падтрымліваюць адно аднаго і радуюцца, што не сталі абузай дзецям. Дзве дачкі Клімушкаў жывуць у Брэсце, сын аж у Латвіі. Налета, як усё будзе добра, Улас і Соф'я адсвяткуюць 60-годдзе сумеснага жыцця.

— Якія тут сакрэты даўгалецця, — зноў шырока ўсміхаецца ветэран, — я ўсё жыццё любіў людзей, любіў прыроду, нікому зла не жадаў. Праўда, я ніколі не курыў, да гарэлкі таксама не быў ахвочы. Стараўся быць патрэбным людзям.

Вось і цяпер ветэран час ад часу выступае ў мясцовай газеце, вядзе прыродазнаўчую рубрыку. З вялікай цікавасцю прачытала адзін з апошніх яго допісаў пра зімоўку крыжадзюба. Дагэтуль я, напрыклад, не ведала, што пасля смерці гэтай птушкі яе цельца захоўваецца яшчэ 10-15 гадоў з-за таго, што за жыццё ў арганізме яе назапашваецца вельмі багата смалістых рэчываў. Цяпер Улас Уласавіч рыхтуе матэрыялы на вясновыя тэмы.

**Святлана ЯСКЕВІЧ. Фота аўтара.**
*Жабінкаўскі раён.*

# ПА ДОБРЫ НАСТРОЙ — НА ПОШТУ

Дзейныя асобы

...Працоўны дзень начальніка аддзялення паштовай сувязі афіцыйна пачынаецца ў 8.00. Але Марына Іванаўна Доўжык прыходзіць на паўгадзінкі раней: да таго часу, як прывязуць пошту, трэба падрыхтаваць дакументы і карэспандэнцыю для адпраўкі ў раён. А пасля кола спраў пачынае круціцца як заведзенае: прыняць пісьмы, ведамасці на выплату пенсій, размеркаваць сярод паштальёнаў 750 асобнікаў (для вёскі лічба прыстойная) газет і часопісаў — гэта толькі пачатак. Сучасныя пошты — свайго роду цэнтры, якія прапаноўваюць цэлы спектр паслуг. Паштальёны панеслі газеты і добрыя весткі ў дамы вяскоўцаў, а ў аддзяленне паціху ідуць людзі. Кожны са сваім.

— Марыначка, паглядзі, колькі там свету ў мяне «нагарэла»? А яшчэ за тэлефон, ваду і вываз смецця хачу заплаціць, — завітала на пошту гаваркая, бойкая Мікалаеўна.

А вось зазірнуў сарамлівы школьнік: праверыць «латарэйку» і яшчэ раз паспытаць зманлівага, але такога прыцягальнага азартнага шчасця.

Хтосьці папаўняў рахунак свайго мабільніка, камусьці даспадобы прыйшліся таннейшыя, у параўнанні з мясцовым магазінам, тавары штодзённага попыту, якімі гандлюе і пошта... Людзі ішлі і ішлі, некаторыя затрымліваліся, каб абмеркаваць між сабой мясцовыя навіны (ведама ж, вёска), а яшчэ час ад часу званіў тэлефон. І для кожнага ў прыветлівай Марыначкі, Марыны Іванаўны, знаходзіліся і добрыя словы, і цёплая ўсмешка. Таму грэх было не спытаць, як жа ёй удаецца цягам кожнага дня з усімі быць такой добразычлівай, прыязнай? Людзі, як вядома, розныя...

— Так... Але ж я ўсіх тут ведаю, кожнаму рада і хачу, каб, завітаўшы сюды, яны забыліся пра свае непрыемнасці, каб хацелі прыйсці ізноў.

Што, відаць, заканамерна, бо ў памяшканні пасля рамонту прыгожа і ўтульна, тут новая мэбля і высокая культура абслугоўвання, што прыемна здзіўляе пакуль не спешчаных гэтым жыхароў Волмы і яе ваколіц.

І ўсё ж цёпла і камфортна кліентам пошты найперш ад святла чалавека, які тут працуе.

Марына Іванаўна на сваёй пасадзе начальніка ўжо чацвёрты год. Да гэтага была прадаўцом, бухгалтарам. Так што ёй не прывыкаць ні да адказнасці (грошай, справаздач, дакументаў...), ні да стасункаў з людзьмі. І дапамагаюць тут не толькі прафесійная арганізаванасць і душэўная чуласць, але і выдатная матэматычная памяць. Прынамсі, тэлефонныя нумары амаль усіх мясцовых абанентаў захоўваюцца ў галаве Марыначкі не горай, чым у камп'ютары.

Разуменне і маральная падтрымка заўсёды чакаюць жанчыну і на «другім фронце»: муж і дзве дарослыя дочкі даўно звыкліся, што пасада ў яе адказная. Як, дарэчы, і актыўная грамадзянская пазіцыя: некалькі гадоў запар Марына Іванаўна была дэпутатам мясцовага сельскага Савета.

...Працоўны дзень заканчваўся, але ў голасе начальніка пошты не адчувалася ні стомы, ні раздражнення: чакала свайго часу штодзённая, выніковая справаздача. Каб назаўтра ўсё пачалося зноў — з падрыхтоўкі дакументаў, са свежых газет, плацяжоў, кліентаў... Аднак Марына Іванаўна сваю працу не лічыць аднастайнай. Мо таму, што кожны раз здзяйсняе маленькі цуд — дорыць людзям добры настрой.

**Ірына ДРАБЫШЭЎСКАЯ. Фота аўтара.**

# НАЗІРАЦЬ ЗА СОКАЛАМ У РЭЖЫМЕ ОН-ЛАЙН

**Усе, хто мае камп'ютар, могуць сёння назіраць за гняздом сокала-пустальгі ў рэжыме рэальнага часу 24 гадзіны ў суткі. Трансляцыя ажыццяўляецца праз вэб-камеру, якая стаіць у нішы шматпавярховага дома ў Брэсце, паведаміў рэдакцыі спецыяліст па экалагічнай адукацыі грамадскай арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны» Руслан ШАЙКІН.**

Камера абсталявана інфрачырвоным падсвечваннем, што дазваляе назіраць за птушкамі нават у поўнай цемры. Цяпер у брэсцкай пары ў гняздзе толькі 5 яек, але іх можа быць і больш. Другое гняздо з вэб-камерай знаходзіцца ў Гродне за скульптурай Святой Алены, на фасадзе Бернардзінскага касцёла. Тут трансляцыя чакае свайго выхаду ў эфір. У гняздоўі птушынай сям'і з Гродна 4 яйкі.

Самец і самка сокала-пустальгі маюць розны знешні выгляд. «Тата» сям'і ўпрыгожвае сваю вопратку выразнымі «вусікамі», мае папялістага колеру галаву, шэры хвост і рыжа-карычневыя крылы. Самка пустальга ўся рыжа-карычневая з чорнымі плямкамі. Сокал-пустальга адрозніваецца ад іншых сокалаў тым, што можа паспяхова жыць як на адкрытых тэрыторыях у прыродным натуральным асяроддзі, так і ў гарадах на шматпавярховых будынках. Харчуецца пустальга мышападобнымі грызунамі. Сваіх гнёздаў гэты сокал не будуе, таму займае хаткі крумкачоў ці тэхнічныя адтуліны ў высокіх будынках. Найбольш вялікая папуляцыя гарадской пустальгі жыве ў Брэсце — каля 45 пар. Зафіксавана пустальга ў Гродне, Мінску, Гомелі і Баранавічах.

У рэжыме он-лайн жыццё сям'і сокала-пустальгі можна назіраць праз сайт http://birdwatch.by/pustalgabrest.

Уважліва назірайце за гняздоўем, у якім хутка з'явяцца птушаняты.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Беларусы і свет

# Ці пяроймем мы славацкі вопыт?

**Славакія навучылася нядрэнна зарабляць на турыстах. Шанаваць гісторыю браты-славяне ўмеюць — чаго толькі варты храм св. Духа XIII ст. у Жэгры, які разам з чатырма іншымі аб'ектамі ўнесены у Спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА!**

— Кажуць, калі Бог дзяліў зямлі, то славак спазніўся, — расказвае легенду **пасол Славакіі ў Беларусі Марыян СЕРВАТКА**. — Амерыканцы і рускія атрымалі вялікія краіны, італьянцы і харваты — краіны прыгожыя, беларусам дасталася краіна з мноствам азёраў, рэк і лясоў... Славакам жа Бог аддаў маленькую краіну, якую пакідаў для сябе — каб мець магчымасць ездзіць туды ў адпачынак.

На сёння Славакія — турыстычная краіна, якая па максімуму выкарыстоўвае свой патэнцыял. Адно з апошніх ноу-хау — фестываль прывідаў.

— Фестываль прывідаў — міжнародны, — расказала «Звяздзе» **дырэктар прадстаўніцтва славацкага ўпраўлення па турызме ў Расійскай Федэрацыі Любіца АЛУШЫЦАВА**. — Ён праходзіць штогод у першыя два тыдні мая ў Бойніцкім замку. У асобных залах вас сустракаюць асобныя прывіды, якія могуць распавесці казку пра замак. Мноства гульняў і забаў — як для дзяцей, так і для дарослых. На фестываль прыязджаюць акцёры з розных краін Еўропы, можна нават сустрэць прывідаў з замкаў Шатландыі і Альпійскіх гор.

Мінулай восенню на Гродзеншчыне ўпершыню прайшоў фестываль «Гальшанскі замак». Пра ідэю прывідаў тады таксама шмат гаварылі, паабяцаўшы на наступны год выкарыстаць гэтую ідэю на ўсе сто. Хочацца верыць, што так і будзе. Тым больш ёсць нагода — сёлета замак у Гальшанах святкуе 400-годдзе.

**Ілья ЛАПАТО.**

## Аўтамабіль за гашыш

**Малдаванін разлічваў рэалізаваць у Мінску частку партыі наркотыку і на выручаныя грошы набыць машыну.**

Зрэшты, у дзялка былі вялікія планы па арганізацыі канала пастаўкі і збыту ў беларускай сталіцы дурману. Праваахоўнікі своечасова астудзілі пыл 26-гадовага грамадзяніна Малдовы. Як паведамілі ў аддзяленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінгарвыканкама, малдаваніна затрымалі супрацоўнікі аддзела па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі Маскоўскага РУУС пры сілавой падтрымцы байцоў палка міліцыі спецыяльнага прызначэння ў буйным гандлёвым цэнтры па праспекце Дзяржынскага. У яго было знойдзена больш за 100 грамаў гашышу, а пры вобыску ў нумары гасцініцы канфіскавана яшчэ паўкіло гэтага наркотыку. Паводле аператыўных звестак, гашыш затрыманы, яго, дарэчы, наркаман са стажам самастойна вырабляў у сябе на радзіме. У Мінску ён планаваў прадаць частку наркотыку, за выручку набыць аўтамабіль, на якім меркаваў выехаць у Расію для збыту часткі гашышу, што застанецца.

**Ігар ГРЫШЫН.**

Прамая лінія

# АЛЕРГІЧНУЮ РЭАКЦЫЮ ТРЭБА СПЫНІЦЬ

*(Працяг. Пачатак у нумарах за 4 і 5 мая.)*

**На вашы пытанні адказала дацэнт кафедры алергалогіі і прафпаталогіі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі Людміла МАСЛАВА.**

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

***☎— Мінск, Аляксандр. У мяне паліноз. Прымаю таблеткі другога пакалення — цэтрын, але ўсё роўна моцнае чханне застаецца. Ці можна сумяшчаць прыём таблетак другога пакалення з прэпаратамі першага?***

— Можна. А можна павялічыць колькасць прэпарата другога пакалення і прымаць не адну таблетку, а дзве. Выпіць іх раніцай і ўвечары, або раніцай і ўдзень. А наогул трэба ўвосень ісці да алерголага, рабіць пробы і вырашаць пытанне аб лячэнні алергенамі — праводзіць алергенспецыфічную імунную тэрапію, самую эфектыўную тэрапію пры палінозе.

***☎— Мінск, Сяргей. Ці выклікае прывыканне сальбутамол? Ці існуюць яго аналагі? Дзе ў Мінску можна прайсці курс спелеатэрапіі? Калі яго трэба праходзіць: падчас абвастрэння ці ў перыяд рэмісіі? І яшчэ: у нас на прадпрыемстве штотыдзень праводзяцца міні-суботнікі па ўборцы тэрыторыі і г.д. Ці можна атрымаць вызваленне ад іх на час абвастрэння палінозу?***

— Сальбутамол прывыкання не выклікае. Прэпарат падобнага дзеяння — бератэк. Спелеатэрапію прымаць трэба ў перыяд рэмісіі. Падобную паслугу прапануюць некаторыя паліклінікі, а таксама 10-я гарадская бальніца Мінска. У час абвастрэння палінозу ўборкай тэрыторыі лепш не займацца.

***☎— Навагрудак, Вольга Уладзіміраўна. 49 гадоў. На працягу года ў мяне назіраецца моцная закладзенасць носа, прычым адналкава сябе адчуваю ў кватэры, на працы, вуліцы, летам і зімой. Усё пачалося з раздражнення на павеках, на скуры твару, шыі, раніцай чхала. Адно з ускладненняў — страта нюху. Звярталася да лор-урача, прызначылі фліксаназэ. Пакуль прымаю — дыхаю. Думала, алергенам стаў сплаў металу ў роце. У 2007 годзе ўстанавіла масты з металакерамікі. Зрабіла ў 10-й клініцы Мінска пробы на нікель, хром і кобальт. Вынік адмоўны. Алерголага ў Навагрудку няма. У Гродне пробаў на алергены мала, накіраванне ў Мінск не даюць. Калі ехаць самой, то за кансультацыю і пробы трэба нямала плаціць. Куды мне звяртацца, якімі павінны быць далейшыя дзеянні?***

— У першую чаргу трэба звяртацца да алерголага ў Гродна.

***☎— Брэсцкая вобласць, Арына, маці 9-гадовага сына. Ці можа стэрыльнае навакольнае асяроддзе спрыяць узнікненню алергій? Ці праўда, што дзеці і дарослыя, якія менш хварэюць на інфекцыйныя захворванні, абавязкова будуць пакутаваць ад алергічных захворванняў?***

— Не, неабавязкова.

***☎— Асіповічы, Вера Аляксандраўна. У мяне алергія, кажучы простай мовай, на поўсць катоў. З нейкага часу я ката ўжо не трымаю. А пытанне такое: калі ўлічыць, што аснова алергій — моцны імунітэт, ці можна разлічваць на тое, што з узростам, скажам, гадоў пасля 50, праблема знікне?***

— У прынцыпе, такое магчыма.

***☎— Мінск, Святлана. Па якіх асноўных прыкметах урачы адрозніваюць пнеўманію ад алергічнага бронхалёгачнага аспергілёз? Чытала, што апошні выклікаецца грыбамі, якія жывуць у тым ліку ў харчовых прадуктах, пыле і вадзе. Глядзела і нашумелую стужку «Цвіль»... Па сутнасці, пазбегнуць сутыкнення з грыбкамі і цвіллю нерэальна. Якія парады вы маглі б даць адносна таго, як зрабіць такія кантакты бяспечнымі?***

— Такія кантакты небяспечныя толькі для тых, хто адносіцца да групы рызыкі развіцця алергіі. Гэта, напрыклад, тыя, чые бацькі пакутуюць ад алергічнага захворвання, хто мала знаходзіўся на грудным выкормліванні і г.д.

***☎— Жлобін, Крысціна. 30 гадоў. Калі ёсць запаленне слізістай вока, то гэта алергічны кан'юнктывіт ці кантактны дэрматыт? Як лечыцца такі стан? Ці можна пасля лячэння карыстацца якой-небудзь касметыкай — дэкаратыўнай і па доглядзе за скурай? І ці варта адмаўляцца ад касметыкі, калі прычынай алергіі***

***☎— Мінск, Наталля Кірылаўна. 38 гадоў. У мяне — кантактны дэрматыт на руках. Дэрматолаг сказаў не насіць гадзіннік з металічным бранзалетам, паменш мачыць рукі вадой, хатнюю працу з выкарыстаннем розных хімічных сродкаў выконваць толькі ў пальчатках. Пасля такой работы мыць рукі вадой і змазваць крэмам. Я так і раблю. На пачатку, калі мне прапісвалі лячэнне, я піла аевіт і тыдні два мазала рукі трыдэрмам. Як часта на працягу года трэба піць аевіт? Ці можна без рэкамендацыі ўрача прымяняць пры абвастрэннях мазь трыдэрм?***

— Аевіт піць неабавязкова. Пры абвастрэннях мазь трыдэрм прымяняць можна.

***☎— Віцебск, Елізавета. 31 год. Ці ёсць які-небудзь моцнадзейны сродак, які дапамагае зняць ацёк і сверб, які ўзнікае ў выніку харчовай алергіі?***

— Трэба спачатку звярнуцца да алерголага і вырашыць пытанне, ці ёсць у вас менавіта харчовая алергія.

***☎— Мінск, Галіна. У мяне апошнім часам месцамі свярбіць цела. Дэрматолаг не знайшоў прычыны, тэрапеўт — таксама, цяпер запісалася на прыём да алерголага. А што вы параіце?***

— У першую чаргу вам трэба даабследавацца: зрабіць фібрагастраскапію, ультрагукавое даследаванне органаў брушной поласці, шчытападобнай залозы, пракансультавацца ў дэрматолага. З вынікамі абследавання звярніцеся да алерголага. Пад'ездзе на кансультацыю ў Гомельскую абласную бальніцу, дзе ёсць алергалагічнае аддзяленне. Калі там не справяцца з праблемамі, спецыялісты накіруюць вас на нашу кафедру алергалогіі ў Мінск. Але пачынаць трэба са сваіх алерголагаў.

***☎— Мсціслаў, Іна. Апошнім часам у мяне пастаянна з аднаго боку закладзены нос. Магчыма, гэта алергія на пылок травы. Як пазбавіцца яе?***

— Я не ўпэўнена, што гэта паталогія алергічнай прыроды. У вас закладзена толькі адна палова носа, а калі рыніт звязаны з алергіяй, то ўзнікае двухбаковая закладзенасць. Ва ўсякім выпадку магу парэкамендаваць вам набыць спрэй назанекс. Рабіце па адным упырскванні ў кожную ноздру штодзень раніцай. Раваем вельмі важна сачыць за харчаваннем дзіцяці. Не давайце яму тыя прадукты, ад якіх абвастраецца дэрматыт. Для таго, каб канчаткова вызначыцца з прадуктамі харчавання, трэба здаць аналіз крыві і па яго выніках спецыялісты вызначаць, якія прадукты не рэкамендуюцца. Калі ж толькі дыетай вы не спраўляецеся з гэтай паталогіяй, то трэба, каб урач выпісаў супрацьалергенныя прэпараты.

***☎— Рэчыца, Любоў Станіславаўна. У мяне на кісцях рук праяўляецца ці то экзэма, ці то атыповы дэрматыт. Прычым, калі я была на бальнічным, праявы зніклі, а выйшла на працу — з'явіліся зноў. З чым гэта можа быць звязана і дзе прайсці абследаванне?***

— У першую чаргу трэба ведаць, з якімі рэчывамі і прадметамі вы маеце справу на працы...

***— Я стаматолаг. Працую з цэментамі, антысептыкамі, карыстаюся латэкснымі пальчаткамі.***

— Кантактны дэрматыт можа ўзнікаць як ад латэксных пальчатак, так і ад таго, да чаго вы яшчэ дакранаецеся. Спачатку трэба вам самой паспрабаваць высветліць, з чым вы маеце справу, потым з гэтымі рэчывамі зрабіць пробы. Яшчэ я парэкамендавала б вам прайсці і больш глыбокае абследаванне: зрабіць фібрагастраскапію, ультрагукавое даследаванне органаў брушной поласці, шчытападобнай залозы, пракансультавацца ў дэрматолага. З вынікамі абследавання звярніцеся да алерголага. Пад'ездзьце на кансультацыю ў Гомельскую абласную бальніцу, дзе ёсць алергалагічнае аддзяленне. Калі там не справяцца з праблемамі, спецыялісты накіруюць вас на нашу кафедру алергалогіі ў Мінск. Але пачынаць трэба са сваіх алерголагаў.

***☎— Мсціслаў, Іна. Апошнім часам у мяне пастаянна з аднаго боку закладзены нос. Магчыма, гэта алергія на пылок травы. Як пазбавіцца яе?***

— Я не ўпэўнена, што гэта паталогія алергічнай прыроды. У вас закладзена толькі адна палова носа, а калі рыніт звязаны з алергіяй, то ўзнікае двухбаковая закладзенасць. Ва ўсякім выпадку магу парэкамендаваць вам набыць спрэй назанекс. Рабіце па адным упырскванні ў кожную ноздру штодзень раніцай. Раваць гэта трэба на працягу абвастрэння хваробы. А восенню, калі ўсё адцвіце, варта звярнуцца да алерголага і зрабіць пробы для таго, каб канчаткова вызначыцца, ці вінаваты пылок у вашым рыніце.

***☎— Мінск, Алена. Скажыце, наколькі моцна антыгістамінныя прэпараты прыгнятаюць імунітэт? У дзіцяці пасля прафілактычных прышчэпак узнікае абвастрэнне атыповага дэрматыту і кан'юнктывіту. Я планую адмовіцца ад прышчэпкі, якая робіцца ў 7 гадоў. Ці правільна гэта?***

— Па-першае, антыгістамінныя прэпараты другога пакалення не прыгнятаюць імунітэт. Такіх доказаў няма. Па-другое, прышчэпкі таксама патрэбны, яны абараняюць ад сур'ёзных захворванняў. Проста гэтыя прышчэпкі павінны праводзіцца ў стане адноснага здароўя дзіцяці. Трэба, каб скура была спакойнай у гэты час. Акрамя таго, перад планаванай прышчэпкай трэба папрымаць антыгістамінныя прэпараты, каб папярэдзіць абвастрэнні з боку скуры. Прымаць іх трэба за тры дні да прышчэпкі і на працягу трох дзён пасля яе.

***☎— Ляхавіцкі раён, Валянціна Антонаўна. Дачцэ 23 гады. Вясной і летам на сонцы ў яе з'яўляецца высыпка на руках, жываце, шыі. Што гэта можа быць?***

— Гэта вельмі падобна на крапіўніцу. Але для ўдакладнення дыягназу вам трэба звярнуцца да ўрача. Таксама неабходна зрабіць дадатковыя абследаванні: фібрагастраскапію, ультрагукавое даследаванне органаў брушной поласці, здаць біяхімічны і агульны аналіз крыві, аналіз мачы. І з гэтымі абследаваннямі паказацца тэрапеўту і алерголагу.

***☎— Стоўбцы, Зінаіда Васільеўна. Куды мне трэба звярнуцца, каб правесці пробы на лекавыя прэпараты?***

— Гэта можна зрабіць у Мінскай абласной бальніцы. Там кансультуе алерголаг. Але перад гэтым трэба ўзяць накіраванне ў свайго ўчастковага ўрача. Калі ж пасля кансультацыі ў алерголага ў вас застануцца пытанні, то вас могуць накіраваць да нас, у Мінск, на кафедру алергалогіі.

**Святлана БАРЫСЕНКА, Вольга ШАЎКО.**
*(Працяг будзе.)*

# Сонца «бушуе»

**Астрафізікамі Фізічнага інстытута імя Лебедзева Расійскай акадэміі навук была зафіксаваная на Сонцы магнітная бура павышанай магутнасці.**

Як патлумачыў інфармацыйнаму агенцтву «РІА Навіны» вядучы навуковы супрацоўнік лабараторыі рэнтгенаўскай астраноміі Сонца, доктар фізіка-матэматычных навук Сяргей Багачоў, магнітнай бурай называюць з'яву, калі геамагнітны індэкс КР дасягае ўзроўню 5 і вышэй. Менавіта такія паказчыкі і фіксавалі навукоўцы з 16 гадзін па маскоўскім часе 2 мая да 10 гадзін 3 мая, гэта значыць, 18 гадзін запар. І хоць апошні ўсплёск актыўнасці на Сонцы не з'яўляецца рэкордным, тым не менш гэта самая працяглая магнітная бура са жніўня 2005 года. Прычым гэта ўжо трэцяя буйная магнітная бура ў гэтым годзе. Папярэднія дзве адбыліся 5 і 12 красавіка. Самай жа буйной успышкай за апошняе дзесяцігоддзе стала бура, што назіралася на Сонцы з 29 па 31 кастрычніка 2003 года і доўжылася 60 гадзін.

Цікава, што буру 5 красавіка і буру 2 мая раздзяляюць 27 дзён — гэта роўна адзін абарот Сонца вакол восі. На думку даследчыка, бура 12 красавіка таксама будзе мець паўтор праз тыдзень, а менавіта 9 мая. Гэта значыць, што 9 мая можа адбыцца буйны геамагнітны шторм...

Як вядома, пасля магутных успышак на Сонцы могуць назірацца перабоі з сувяззю і парушэнні ў працы электраабсталявання. Праўда, звычайных людзей больш хвалюе пытанне, як размерная сонечная актыўнасць можа адбіцца на іх здароўі. Наконт гэтага ў медыкаў аднадушнага меркавання няма. У тэорыі ўплыву магнітных бур на чалавека ёсць прыхільнікі, якія прытрымліваюцца таго меркавання, што гравітацыйныя хваляванні, звязаныя з уздзеяннем Космасу, намнога меншыя ў параўнанні з тымі, якім людзі падвяргаюцца ў паўсядзённым жыцці (трасяніна, паскарэнні, тармажэнні ў грамадскім транспарце, рэзкі спуск і пад'ём і г.д.). Таксама заўважана, што да 50 працэнтаў жыхароў планеты здольныя да адаптацыі, гэта значыць, да змяншэння рэакцыі на магнітныя буры, якія ідуць адна за адной з інтэрвалам у 6-7 дзён. Што маладыя людзі ўвогуле не адчуваюць на сабе ўздзеяння магнітных бур, але з узростам адчувальнасць да іх павялічваецца. Пасля 60 гадоў магнітныя буры тым ці іншым чынам адбіваюцца на здароўі ўжо практычна кожнага чалавека, чаму спрыяе цэлы «букет» хранічных захворванняў.

Каб зразумець, якія ж чынам магнітныя буры ўплываюць на здароўе чалавека, трэба мець на ўвазе, што ўласныя магнітныя палі маюць усе жывыя істоты. Вагаецца магнітнае поле Зямлі — вагаецца і магнітнае поле чалавека. Кроў, складовай часткай якой з'яўляюцца малекулы жалеза, пад гэтым уздзеяннем пачынае паводзіць сябе інакш: у дробных сасудах-капілярах, якія разносяць па ўсім арганізме кісларод, кроў пачынае застойвацца, павялічваецца яе згусальнасць, што правакуе ўзнікненне тромбаў. Такое парушэнне цыркуляцыі крыві ў людзей з рознымі захворваннямі сэрца і сасудаў можа прывесці да сапраўднай «аварыі»: інфаркту або інсульту. Цяжка прыходзіцца і нервовай сістэме: уплыў Космасу можа праяўляцца як у рэзкіх перападах настрою, млявасці, хуткай стамляльнасці, разбітасці, беспрычыннай трывозе, так і ў раздражняльнасці і павышанай агрэсіўнасці. Спецыялісты нават знайшлі сувязь паміж павелічэннем колькасці спроб суіцыдаў і дарожна-транспартных здарэнняў і магнітнымі бурамі, якія бушуюць у гэты час у атмасферы Зямлі. У прыватнасці, аўстралійскія псіхіятры ўстанавілі, што падчас магнітных бур павялічваецца колькасць суіцыдаў сярод жанчын. Расійскія кардыёлагі прадставілі доказы таго, што частата інфарктаў, прыступаў стэнакардыі і інсультаў узрастае падчас магнітных бур. А балгарскія навукоўцы даказалі сувязь паміж магнітнымі бурамі і скачкамі ў людзей артэрыяльнага ціску.

Для таго, каб прасцей перажыць складаныя ў геафізічным плане дні, медыкі раяць усім метэазалежным людзям пазбягаць фізічных нагрузак, строга прытрымлівацца дыеты, адмовіцца ад салёных і вострых страў, і, зразумела, ад алкаголю, часцей праветрываць памяшканне, абмежаваць колькасць выкураных цыгарэт, прымаць лекі, рэкамендаваныя ўрачом, і выконваць усе яго рэкамендацыі. Не пашкодзіць і прыём заспакаяльных прэпаратаў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# ДОБРУШСКІ ФАРФОР — ПАД ПАДАЗРЭННЕМ?

## у «Беллегпраме» мяркуюць, што адбылася наўмысная падмена стандартаў

**Расійская Федэральная служба па нагляду ў сферы правоў спажыўцоў і дабрабыту чалавека распаўсюдзіла афіцыйнае паведамленне аб выяўленні ў посудзе Добрушскага фарфаравага завода павышанага ўтрымання кадмію і свінцу.**

Як гаворыцца ў паведамленні, размешчаным на сайце www.rospotrebnadzor.ru , упраўленнем Расспажыўнагляду па Забайкальскім краі ў арганізацыі рознічнага гандлю выяўлены фарфаравы посуд вытворчасці ЗАТ «Добрушскі фарфаравы завод», які не адпавядаў патрабаванням па гранічна дапушчальнай колькасці хімічных рэчываў, што вылучаюцца з матэрыялаў, якія кантактуюць з харчовымі прадуктамі. У прыватнасці, у ходзе лабараторных даследаванняў было ўстаноўлена, што ўтрыманне кадмію перавышала дапушчальную норму ў добрушскім посудзе ў 242 разы, а свінцу — у 60 разоў.

«Улічваючы, што рэалізацыя няякаснай прадукцыі, якая ўтрымлівае кадмій і свінец у колькасці, вышэйшай за дапушчальныя ўзроўні міграцыі хімічных рэчываў, цягне пагрозу для жыцця і здароўя людзей, неабходна прыняць адпаведныя меры з адборам узораў для правядзення лабараторных даследаванняў і інфармаваннем Расспажыўнагляду ва ўстаноўленым парадку», — гаворыцца ў лісце за подпісам Галоўнага дзяржаўнага санітарнага ўрача Расійскай Федэрацыі Генадзя Анішчанкі.

Аднак у канцэрне «Беллегпрам» з абвінавачаннямі расійскага боку катэгарычна нязгодныя. «У Беларусі і Расіі дзейнічаюць розныя дапушчальныя нормы вылучэння свінцу і кадмію ў керамічным посудзе, а таксама розныя метады выпрабаванняў, — гаворыцца ў афіцыйнай заяве прэс-службы канцэрна. — Разам з тым Добрушскі фарфаравы завод кантралюе адпаведнасць свайго посуду як беларускім, так і расійскім нарматывам.

Апошнія выпрабаванні посуду праводзіліся 5 красавіка 2010 года ў адпаведнасці з ДАСТ Р ІСО 6486-2-2007, які прымяняецца ў Расіі. Гэтыя выпрабаванні паказалі, што ўтрыманне свінцу і кадмію адпавядаюць як беларускаму, так і расійскаму ДАСТам. Фактычнае ўтрыманне свінцу і кадмію або не было выяўлена, або было ніжэйшым за дапушчальныя нормы ў 100—1000 разоў.

Разыходжанне звестак можна патлумачыць тым, што Цэнтр гігіены і эпідэміялогіі Забайкальскага краю, які правяраў партыю беларускага посуду, праводзіў выпрабаванні па методыцы ДАСТ 30178-96 «Сыравіна і прадукты харчовыя», а не па патрабаваннях ДАСТ Р ІСО 6486-2-2007, што сведчыць пра наўмысна няправільнае прымяненне стандартаў і, адпаведна, непраўдзівасць вынікаў» .

У прэс-службе канцэрна «Беллегпрам» сцвярджаюць, што афіцыйныя прэтэнзіі па якасці ад расійскіх пакупнікоў ці кантралюючых арганізацый у адрас ЗАТ «Добрушскі фарфаравы завод» не паступалі, аднак на прадпрыемстве ўзмоцнена работа па кантролі за захаваннем гранічна дапушчальных нормаў утрымання шкодных рэчываў. Пры гэтым Расспажыўнагляд, у сваю чаргу, сцвярджае, што пратаколы лабараторных выпрабаванняў ад 9 красавіка былі накіраваныя на Добрушскі фарфаравы завод факсімільнай сувяззю яшчэ 15 красавіка гэтага года.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# МЫ ВЫБІРАЕМ АДПАЧЫНАК

## ці адпачынак выбірае нас?

### Суб'ектыўныя нататкі на палях праграмы адной выставы

Начальнік турыстычнага аддзела Нацыянальнага парка «Белавежская пушча» знаёміць наведвальнікаў са зместам экскурсій па пушчы.

У Брэсце прайшла выстава-кірмаш «Турызм. Лета-2010». Найбольш пастараліся паказаць сябе аграгурыстычныя сядзібы. І гэта зразумела. Ім трэба заяўляць пра сябе, прывабліваць кліента, напрацоўваць навыкі прэзентацыйнай работы. Гаспадары сядзібаў частавалі наведвальнікаў дранікамі, піражкамі і блінамі, прапаноўвалі прадэгуставаць фірмовыя напіткі. Многія экспазіцыі выглядалі ярка, прыгожа, прыцягвалі ўвагу нават пахам смачных страў. Каталог адпачынку ў вёсцы, выпушчаны акурат да гэтай выставы, рэкламуе паслугі больш за шасці дзясяткаў сядзібаў. Кожная з іх прапануе нейкую сваю фішку цікавага і змястоўнага адпачынку. Так, дасціпныя гаспадары адной з сядзібаў уключылі ў спіс забаў нават працатэрапію ў выглядзе касьбы, колкі дроў і праполкі агароду.

Варта адзначыць, што дастойна выглядаў пакет прапаноў Нацыянальнага парку «Белавежская пушча». Акрамя традыцыйных турыстычных маршрутаў: пешых, веласіпедных, аўтамабільных, — турыстычны аддзел пушчы распрацаваў шэраг новых паслуг. Яго начальнік Святлана Бядок з задавальненнем знаёміла гасцей са зместам тураў выхаднога дня, у тым ліку і для школьнікаў. Цяпер ёсць магчымасць прымаць у Камянюках школьныя групы з размяшчэннем іх у недарагіх гасцінічных нумарах. Цікавыя экскурсіі для вучняў прэзентаваў і абласны цэнтр дзіцяча-юнацкага турызму і экскурсій. 15 розных вандровак па даступных цэнах могуць значна пашырыць кругагляд сучаснага школьніка, узбагаціць яго веды пра родны край. Цікавасць, безумоўна, выклікалі і павільёны некаторых раёнаў: хто спрабаваў прывабіць патэнцыяльнага кліента бездзежскімі фартушкамі, а хто — апетытнымі мотальскімі каўбасамі...

А вось традыцыйная індустрыя адпачынку — айчынныя санаторыі — выглядалі надта сціпла. Адзінае, што яны маглі прапанаваць наведвальнікам, — падрабязны спіс санаторыяў ды знаёмства з маляўнічымі мясцінамі на карцінках, месцамі дыслакацыі кожнага з іх. Бо на ўсе пытанні гасцей наконт магчымага курса лячэння і адпачынку на лета, адказ быў нязменны: даўно няма. Больш за тое, калега спрабавала замовіць пуцёўку ў папулярным санаторыі «Бярэсце» яшчэ ў студзені, але атрымала адмову. У іх на лета выкупілі пуцёўкі яшчэ ў лістападзе, так прынамсі, ёй патлумачылі. Цікава, што на заўвагу аднаго госця выставы наконт папярэдняга продажу расіянам, яму хуценька запярэчылі: не, маўляў, нашы паспяшаліся. Але верыцца ў гэта з цяжкасцю. Калі аўтар гэтых радкоў пісала рэпартаж з вадохрышчанскага купання ў раёне санаторыя «Надзея», то мела магчымасць упэўніцца, што вельмі шмат яго кліентаў менавіта прыезджыя з Расіі. Для грамадзян суседняй краіны нашы цэны выглядаюць ледзь не смешнымі ў кантэксце іх заробкаў. Таму ім вельмі выгадна адпачываць і лячыцца ў нас. Нашым санаторыям таксама выгадны такі кантынгент адпачывальнікаў. Бо ў кошт пуцёўкі цяпер уваходзіць толькі пражыванне і харчаванне з мінімумам працэдур. Асноўныя медыцынскія паслугі даводзіцца аплочваць дадаткова. Расіяне ж не скупяцца, для іх наш мільён з гакам за пуцёўку — гэта не грошы. А што ж застаецца нам? Нам прапануюць замаўляць пуцёўкі за поўны кошт ледзь не за год. Але ж не заўсёды свой адпачынак можна планаваць за такі доўгі тэрмін наперад. У рэшце рэшт, айчынныя санаторыі павінны аздараўляць сваіх працаўнікоў. Для гэтага яны і былі створаны, хай сабе і папярэднімі пакаленнямі. Можа, ёсць сэнс уводзіць нейкі ліміт для сваіх, як тых песень на радыё? Нас жа просяць увесь час падтрымліваць айчыннага вытворцу. Але чаму ж не падтрымаць айчыннага працаўніка як крыніцу падаткаў і спажыўца сваіх тавараў і паслуг? А то прыехалі санаторыі на кірмаш паказаць сябе і расказаць, што ў іх ёсць прапановы на познюю восень і зіму. Чамусьці Валынскае турыстычнае агенцтва расказвала не толькі пра маляўнічасць Шацкіх азёраў і іх гаючае паветра, а таксама пра перавагі адпачынку на моры. Іх спецыялісты прывезлі цэлы спіс санаторыяў Крыма з указаннем цэнаў за месца ў нумары на любы час: з мая па верасень. Цэны розныя і паслугі розныя, ад 4-разовага харчавання з усім комплексам працэдур да пражывання са сняданкамі. Дагавор можна было заключыць прама на месцы. Што ж застаецца сціпламу айчыннаму працаўніку: падтрымліваць санаторна-курортны комплекс суседняй дзяржавы?

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# ЗНОСІЦЬ НЕЛЬГА ПАКІНУЦЬ

**90-гадовую бабулю-ветэрана і яе суседзяў, пажылую пару 80-ці год, прымушаюць знесці гаражы за свой кошт. З такімі скаргамі ў рэдакцыю газеты звярнуліся гаспадары гэтых гаражоў. Свой выбар яны патлумачылі тым, што мясцовай уладзе яны ўжо не вераць...**

Тры невялікія металічныя гаражы месяцца каля падстанцыі дома № 12 па вуліцы Малчанскага горада Маладзечна. За імі — катлаван, экскаватары і гурбы пяску.

— Вось тут яны збіраюцца ставіць часовыя вагончыкі для рабочых, — паказвае палачкай 80-гадовы Фёдар Хацяневіч. — Што ім, месца не хапае? Тут вунь, бачыце, прыбудоўка стаіць. Гэта мая. Я кажу, разбурайце яе. Але яны не хочуць яе зносіць, а хочуць, каб мы за свой кошт іх знеслі ды і штраф за незаконнае будаўніцтва заплацілі (па заканадаўстве ад 20 да 50 базавых велічынь).

Тры металічныя гаражы жыхары дома № 12 паставілі яшчэ ў 1970-х.



ПРЕДПИСАНИЕ

— Нам проста далі зямлю, і ўсё, — расказвае Фёдар Пятровіч. — Першапачаткова гаражы стаялі не тут. Іх перанеслі, калі дом паралельна нашаму будавалі. У нас тады пыталі дазвол, і гаражы акуратненька перанеслі. Дакументы? Хутчэй за ўсё, недзе згубіліся.

— Нас папярэдзілі, каб не капалі ямы пад гаражамі, таму што там ідуць кабелі, — кажа Станіслаў Кавецкі, які ставіць машыну ў адзін з гаражоў. — Вядома ж, хочам захаваць гэтыя гаражы, таму што, калі іх пераносілі, нам сказалі, што нічога тут будавацца не будзе. Няўжо з-за часовых вагончыкаў мы пазбавімся гэтых гаражоў?

— Мне ўжо 80 год. Жонка — інвалід першай групы, ляжачая, вось ужо чатыры гады яна ляжыць, а я інвалід другой групы. А вы ж ведаеце, як гэта — старога чалавека даглядаць, — кажа Фёдар Пятровіч. — На машыне я і ў аптэку, і ў паліклініку... Куды мне гараж зносіць. Ды і самастойна я яго нікуды вывезці не магу. Стары ўжо. Вунь інфаркт нядаўна быў. Ды ўрэшце, хай ужо і зносяць, колькі нам тут засталося, але ж за гэта вунь колькі грошай прыйдзецца заплаціць. А якая ў нас пенсія...

Ветэран Вялікай Айчыннай вайны Еўдакія Міхайлаўна Махцюк зараз знаходзіцца ў ляжачым стане. У гэты гараж ставяць машыну дзеці яе пляменніка.

— Я ў домакіраўніцтва — а мне там: «Зносьце гараж!». Самавольнае будаўніцтва. Штраф ад 20-ці да 50-ці базавых, — кажа жонка пляменніка Зінаіда Цеплакова. — Ну што гэта такое? Хтосьці ім жа гэтую зямлю даў? Не магла бабуля самавольна нешта захапіць. Яна інтэлігентная жанчына, да Берліна дайшла разам з мужам-палкоўнікам... Гараж гэты вельмі патрэбны, таму што я на машыне і ў шпіталь, і ў краму... Я — інвалід дзяцінства, і мне нельга цяжар цягаць. Унукі ў яе далёка... Адна я ды суседка даглядаем яе...

— А што да нашых, мясцовых, звяртацца. Не дапамогуць яны, — кажуць уладальнікі гаражоў.

**Яўген ЧАЕЎСКІ, начальнік ЖРЭУ № 1, да якога належыць дом № 12 па вуліцы Малчанскага:**

*— Будаўнікам там перашкаджаюць самавольна пабудаваныя гаражы. А чаму яны іх самавольна паставілі, я не ведаю. Яны ж ні падаткі не плацяць, нічога. Праблема гэтая ўзнікла цяпер, таму што не звярталі мы на гэтыя гаражы ўвагі. Яны нікому не перашкаджалі. Хоць гэта і незаконна.*

*Іх трэба даўно было прыбраць, а ўладальнікаў пакараць. Іх і цяпер трэба пакараць. Мы вось рыхтуем дакументы, каб на іх падаваць у суд. Чаму яны не зарэгістравалі свае пабудовы? Калі б яны афіцыйна атрымалі дазвол і паставілі гэтыя гаражы, то ў чым была б праблема? Ёсць у нас такія гаражы і зараз у горадзе. Ім даў дазвол выканкам. Хай паспрабуюць спачатку ў выканкам схадзіць і атрымаць дазвол. Атрымаюць — хай стаяць сабе гэтыя гаражы. Не атрымаюць — не маюць права.*

*Не нам гэтыя гаражы перашкаджаюць, яны будаўнікам перашкаджаюць, таму што яны падпадаюць пад пляму забудовы. Нават калі б там і забудовы не было, іх усё роўна патрэбна было б прыбіраць. Таму што чалавек заняў дзяржаўную зямлю. Была ў мяне тут з восьмай кватэры жанчына, якая за бабуляй глядзіць, казала — прыбірайце гэтыя гаражы. Нікому яны тут не патрэбныя. Толькі не штрафуйце — вось адна просьба.*



*У крайнім выпадку мы можам паслугу аказаць, каб вывезці іх бясплатна...*

*Мы размовы праводзілі, папярэджвалі. І калі чалавеку прыйшло папярэджанне, то ён павінен не адразу ў «Звязду» пісаць, а пайсці спачатку ў выканкам. У нас жа ёсць улада, куды можна звярнуцца. А яны адразу ў «Звязду», і што гэта за народ?*

**Настасся ЗАНЬКО.**

**АД АЎТАРА:**

З аднаго боку, пазіцыя ЖРЭУ ясная — закон ёсць закон. Няма дакументаў — значыць, гаражы самавольна занятыя, з усімі наступствамі. Іншых варыянтаў заканадаўчыя акты не даюць. Але з пункту гледжання звычайнага, чалавечага: як пазбавіць інвалідаў і ветэранаў сродкаў для перамяшчэння? Ды яшчэ накладваць на іх штраф, які ў некаторых роўны пенсіі? Ці ёсць выйсце з сітуацыі?

Здарова есці

# Беларусаў абяцаюць карміць смачна, карысна і галоўнае — сваім!

**«Чалавек ёсць тое, што ён есць» — гэты крылаты выраз, што прыпісваецца нямецкаму філосафу Людвігу Фейербаху, як ніколі актуальны ў XXI стагоддзі, у час папулярнасці так званай заходняй мадэлі харчавання (фастфуд, паўфабрыкаты, рафінаваныя прадукты і г.д). Яна стала галаўным болем не толькі для дыетолагаў, але і ўвогуле для медыкаў самых розных спецыяльнасцяў — анколагаў, кардыёлагаў, эндакрынолагаў.**

Просты прыклад: калі харчавацца толькі фастфудам, то, паводле назіранняў урачоў, ужо праз некалькі гадоў у арганізме ўтвараюцца атэрасклератычныя бляшкі (нават у 10-гадовых дзяцей), павялічваецца ў некалькі разоў рызыка цукровага дыябету 2 тыпу, раку тоўстай кішкі... «Заходняя мадэль харчавання ўзмацняе і без таго характэрны для беларусаў дэфіцыт незаменных біялагічна актыўных пажыўных рэчываў: вітамінаў, мінералаў, амінакіслот, клятчаткі, пекціну. Вось чаму так важна як мага раней змяніць свае харчовыя стэрэатыпы і выпрацаваць звычку здаровага харчавання», — падкрэслівае загадчык кафедры агульнай гігіены Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, кандыдат медыцынскіх навук, спецыяліст па здаровым харчаванні Наталля Бацукова.

Садзейнічаць гэтаму закліканая лінія прадуктаў здаровага харчавання для ўсёй сям'і «Даліна злакаў», распрацаваная кампаніяй «Анега» для суайчыннікаў. Як падкрэсліваюць вытворцы, пераваг у гэтай лініі адразу некалькі: выкарыстанне толькі беларускіх прадуктаў і толькі натуральных кампанентаў, без аніякіх «Е», фарбавальнікаў і іншых шкодных дадаткаў, а таксама шырокі асартымент прадукцыі — 32 найменні, ад улюбёных дзецьмі кукурузных палачак да батончыкаў мюслі, ад сухіх сняданкаў да разнастайных хлябцоў, у тым ліку з начыннем. «І, што немалаважна, — адзначае дырэктар кампаніі «Анега», ідэйны натхняльнік стварэння гандлёвай маркі «Даліна злакаў» Сяргей Мета, — наша прадукцыя будзе даступнай для беларускіх сем'яў — прыкладна на 15—20 % таннейшай, чым у канкурэнтаў». Для прыкладу: упакоўка хлябцоў «На раз» (16 г) у магазінах будзе каштаваць усяго 360 рублёў! У найбліжэйшы час у гандлёвую сетку краіны плануецца запусціць таксама іншыя віды хлябцоў, кукурузныя палачкі і сухія сняданкі, уліпені — хлябцы-аладкі і так званыя «ролы з начыннем», у жніўні — рассыпчатыя мюслі, а ў верасні — батончыкі мюслі.

Як расказалі тэхнолагі прадпрыемства, адметнасць «Даліны злакаў» у тым, што выходныя прадукты не абсмажваюцца, а падвяргаюцца цеплавой і механічнай апрацоўцы літаральна 40—60 секунд, што дазваляе захаваць у іх максімум карысных рэчываў і вітамінаў. Дадаткова ўсе прадукты ўзбагачаюцца кменам, імбірам, вотруб'ем або пекцінаўтрымальнай клятчаткай. Дастаткова з'есці ўсяго 1 такі хлябец, каб арганізм атрымаў столькі ж клятчаткі, колькі ад 8 кавалкаў белага батона, а 140 г хлябцоў цалкам задавальняюць сутачную патрэбу арганізму ў хлебе. Адзінае, на што звяртаюць увагу медыкі — прадукты з вотруб'ем неабходна запіваць дастатковай колькасцю вадкасці, каб не перагружаць кішэчнік. У астатнім жа такое харчаванне рэкамендаванае абсалютна ўсім катэгорыям насельніцтва: ад дзяцей да пенсіянераў, ад здаровых мужчын да цяжарных жанчын. «Гэта больш, чым проста лінія прадуктаў — гэта цэлая філасофія здаровага ладу жыцця, — сцвярджае Сяргей Мета. — У кожным з нас, пэўна, жыве генетычная памяць — як пахне зерне на току, якое яно духмянае і смачнае... Каб узгадаць гэтыя адчуванні, увесці ў штодзённы рацыён беларусаў здаровыя і карысныя прадукты, мы і прыдумалі лінію «Даліна злакаў». У мяне ўвогуле ёсць аддаленая мара, каб на вуліцах нашых гарадоў замест шапікаў з фаст-фудам паўсталі кіёскі са здаровым харчаваннем, халадзільнікі з садавіной і гароднінай для прыгатавання свежавыціснутых сокаў...».

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**

# У КОЖНЫМ АБ'ЕКЦЕ — ПЛАЦЕЖНЫЯ ТЭРМІНАЛЫ

**Увайшла ў сілу пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь і Нацыянальнага банка, якая прымалася ў мэтах удасканальвання парадку рэалізацыі і выкарыстання касавых падсумоўваючых апаратаў і спецыяльных камп'ютарных сістэм на тэрыторыі краіны.**

У адпаведнасці з пастановай, юрыдычныя асобы і індывідуальныя прадпрымальнікі, што вядуць гандаль і (ці) аказваюць платныя паслугі насельніцтву, пры стварэнні аб'ектаў, размешчаных у раённых і абласных цэнтрах, гарадах абласнога падпарадкавання і ў Мінску, абавязаныя ўстанавіць у іх плацежныя тэрміналы для рэгістрацыі аперацый, што праводзяцца з выкарыстаннем банкаўскіх пластыкавых картак. Пры гэтым колькасць тэрміналаў у адносінах да колькасці касавых кабін або кантрольна-касавых вузлоў названых аб'ектаў павінна складаць 100 працэнтаў.

Змены датычацца таксама парадку выкарыстання касавых падсумоўваючых апаратаў. Новай рэдакцыяй прадугледжана, што касавыя падсумоўваючыя апараты, білетадрукавальныя машыны і таксометры, зарэгістраваныя ў падатковым органе: на працягу пяці гадоў з даты ўключэння іх мадэляў (мадыфікацый) у Дзяржаўны рэестр, выкарыстоўваюцца на працягу шасці гадоў з даты першай рэгістрацыі касавых падсумоўваючых апаратаў, білетадрукавальных машын і таксометраў у падатковым органе; па заканчэнні названых пяці гадоў — да наступлення аднаго з наступных абставінаў: выключэння іх мадэляў (мадыфікацый) з Дзяржаўнага рэестра ці да заканчэння шасці гадоў з даты першай рэгістрацыі ў падатковым органе.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ЗАГЛЯНУЎ У АДРЫНУ

Калі жыхар в. Малая Каўпеніца, што пад Баранавічамі, зазірнуў у сваю адрыну, то знайшоў там мёртвае немаўля. Было ўстаноўлена, што дзіця нарадзіла сужыцелька гаспадара. Пракуратура высвятляе, што паслужыла прычынай смерці дзіцяці.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

# АСЦЯРОЖНА! МАГЧЫМА МАХЛЯРЫ

## Падазраецца, што аб'явы з просьбай аб дапамозе хворай дачцэ, якія з'явіліся на мінскім вакзале, — несапраўдныя

«Дапамажыце выратаваць дачку! Тэрмінова патрэбныя грошы на правядзенне найскладанейшай аперацыі па перасадцы жывога донарскага сэрца. Патрэбная сума — 45 тыс. еўра» (гл. фота). Аб'явы такога кшталту з'явіліся ў падземным пераходзе да сталічнага вакзала ў сераду мінулага тыдня. Літаральна на кожным слупе наклеены папяровыя лісты фармату А3 з заклікамі пералічыць грошы на рахунак Беларусбанка, які належыць Сцяпанаву Аляксею Іванавічу. Мінакі спыняюцца, махаюць галовамі і ўздыхаюць, нехта накіроўваецца ў банк. Вырашыўшы ахвяраваць колькі грошай са свайго студэнцкага кашалька, я пайшла ў бліжэйшае аддзяленне Беларусбанка.

— Дзяўчына, гэта, на наш погляд, махляры, — даведаўшыся пра мае намеры, падзялілася сваімі думкамі **загадчыца прывакзальнага аддзялення Беларусбанка № 527\355 Наталля ХАЛЯВІНСКАЯ**.

— Чаму? — здзівілася я (па шчырасці, мне нават і ў галаву такая думка не прыйшла).

— Справа ў тым, што калі гэты мужчына прыйшоў да нас, мы адразу яму прапанавалі стварыць дабрачынны рахунак, але ён адмовіўся і папрасіў стварыць просты, — расказала спадарыня Наталля.

Як высветлілася, мужчына — грамадзянін Расійскай Федэрацыі, прапісаны ў Піцеры.

— Але самае дзіўнае, што кожны дзень ён здымае са свайго рахунку грошы. Яны штодня паступаюць. Звычайна, калі людзі збіраюць сродкі на дабрачыннасць, то грошы назапашваюцца ці пераводзяцца на замежныя рахункі, — дзеліцца падазрэннямі Наталля Халявінская. — І ён не пакінуў ніякіх кантактаў сваіх. Мы ўжо папярэдзілі службу бяспекі банка. А вы лепш перавядзіце грошы каму-небудзь з тых, хто афіцыйна стварыў дабрачынны рахунак.

ПОМОГИТЕ СПАСТИ ДОЧЬ !

**Настасся ЗАНЬКО.**

# ЯК ЗАСТРАХАВАЦЬ ДЗЯЦЕЙ АД КІШЭЧНЫХ ІНФЕКЦЫЙ?

## Медыкі і педагогі робяць высновы пасля ўспышкі сальманелёзу ў Пінску

**Хто вінаваты і што неабходна зрабіць, каб папярэдзіць у будучыні ўспышкі вострых кішэчных інфекцый пры арганізацыі харчавання ва ўстановах адукацыі? Як паўплываць на свядомасць людзей, адказных за дзіцячае харчаванне? Як мінімізаваць чалавечы фактар? Якой форме арганізацыі харчавання дзяцей аддаць перавагу? Ці можна выхаваць у школе здаровыя харчовыя звычкі, калі ў сям'і дзіця харчуецца, так бы мовіць, на хуткую руку? Гэтыя пытанні адрасаваў удзельнікам сумеснай калегіі міністэрстваў адукацыі і аховы здароўя міністр адукацыі нашай краіны Аляксандр Радзькоў.**

Як вядома, у сакавіку ў дзіцячым садзіку № 29 горада Пінска адбылася буйная ўспышка сальманелезу. Ахвярай гэтай інфекцыі сталі 102 чалавека: 99 дзяцей і 3 дарослых. Для нашай краіны, пасля трохгадовага зацішша без успышак вострых кішэчных інфекцый у арганізаваных дзіцячых калектывах, гэта стала надзвычайным здарэннем. У ходзе эпідэміялагічнага расследавання высветлілася, што крыніцай распаўсюджвання інфекцыі была кухар — востры бактэрыяносьбіт сальманелёзу.

— Мяне, прызнаюся, хвалюе пытанне, ці не занадта мы апошнім часам захапіліся ўпрыгажэнствам, выключна знешнім дэкорам? — падзялілася сваімі думкамі з членамі калегіі **Галоўны дзяржаўны санітарны ўрач Рэспублікі Беларусь Валянціна КАЧАН**. — Нам вельмі хочацца здзейсніць рэвалюцыю ў пошуку новых формаў арганізацыі харчавання, але ж пры гэтым ні ў якім разе не павінна адыходзіць на другі план бяспека! А ў пінскім дзіцячым садку ўзнікненне групавога захворвання стала прамым наступствам неналежнага выканання функцыянальных абавязкаў работнікамі харчовага блока, а таксама многімі службовымі асобамі. **Зразумела, што спрацаваў і чалавечы фактар, але ж галоўная прычына здарэння крыецца ў тым, што расслабіўся кіраўнік...**

Сальманелы былі выяўлены на харчовым блоку і ў гатовай прадукцыі, і на стэлажах, і на посудзе, і на абсталяванні, з чаго можна зрабіць выснову пра грубыя парушэнні ў дзіцячым садку санітарных нормаў і правіл, у прыватнасці, пра тое, што персаналам не захоўваўся рэжым мыцця кухоннага і сталовага посуду, няякасна праводзілася ўборка памяшканняў харчовага блока, не захоўваліся элементарныя правілы асабістай гігіены... Масавае інфіцыраванне выхаванцаў адбылося пасля спажывання дзецьмі тварожнага суфле, якое повар размешваў рукамі, хоць тэхналогія прадугледжвала выкарыстанне міксера. Рэалізацыі харчовага шляху перадачы інфекцыі паспрыяла і зношанасць тэхналагічнага абсталявання: тэрмін эксплуатацыі жаравой шафы, у якой гатавалася суфле, перавысіў 30 гадоў, прычым з-за адсутнасці індыкатара тэмпературы кантраляваць рэжым прыгатавання было немагчыма. А параканвекцыйная печы, неабходнай для прыгатавання тварожнага суфле згодна з тэхналогіяй, увогуле не было на харчовым блоку. І дзе ў такім разе штодзённы кантроль за прыгатаваннем ежы з боку адміністрацыі, медыцынскага персаналу, тэхнолагаў аддзела адукацыі? Да таго ж і двухтыднёвае меню ў садку было распрацавана без уліку наяўнасці неабходнага тэхналагічнага абсталявання.

**Стаўка кухара ў дашкольнай установе складае 196 тысяч рублёў, медыцынскай сястры па дыетычным харчаванні — 254 тысячы рублёў. Ці варта здзіўляцца, што толькі ў дашкольных установах Мінска сёння маюцца 374 вакансіі кухара, кухоннага работніка, кладаўшчыка і 256 вакансій медыцынскіх сёстраў?..**

«Паколькі акрамя аб'ектыўных фактараў, якія ўплываюць на ўзровень захворвання вострымі кішэчнымі інфекцыямі (такіх як сезоннасць і цыклічнасць), непасрэдны ўплыў аказвае і цэлы шэраг суб'ектыўных фактараў, вельмі важным з'яўляецца павышэнне адказнасці кадраў, задзейнічаных у сістэме дзіцячага харчавання», — падкрэсліла Валянціна Качан. Аднак **намеснік міністра адукацыі Казімір ФАРЫНО** быў вымушаны канстатаваць, што ў аб'ектах харчавання ўстаноў адукацыі акрэслілася ўстойлівая тэндэнцыя цякучасці кадраў, якая звязана, у першую чаргу, з нізкімі заробкамі. Так, стаўка кухара ў дашкольнай установе складае 196 тысяч рублёў, медыцынскай сястры па дыетычным харчаванні — 254 тысячы рублёў. Ці варта здзіўляцца, што толькі ў дашкольных установах Мінска сёння маюцца 374 вакансіі кухара, кухоннага работніка, кладаўшчыка і 256 вакансій медыцынскіх сёстраў. Пра які прафесіяналізм і матывацыю персаналу можа весціся гаворка пры такой аплаце іх працы?

### Меню — сёння на заўтра

Казімір Фарыно паведаміў, што пошук аптымальнай мадэлі арганізацыі харчавання ва ўстановах адукацыі працягваецца. У большай частцы агульнаадукацыйных устаноў, як правіла, размешчаных у сельскай мясцовасці, функцыі па арганізацыі харчавання перададзеныя органам кіравання адукацыяй ці самім установам адукацыі. Гэта спрыяе зніжэнню кошту харчавання за кошт адсутнасці нацэнкі грамадскага харчавання і выкарыстання атрыманай ці вырашчанай навучэнцамі сельскагаспадарчай прадукцыі. Аднак пры гэтым узнікае мноства праблем, звязаных з захаваннем нарыхтаванай прадукцыі, правядзенне вытворчага (лабараторнага) кантролю, набыццём спецыялізаванага аўтатранспарту і іншыя, рашэнне якіх з'яўляецца для органаў адукацыі вельмі складаным.

У гарадах жа найбольш эфектыўнай формай арганізацыі харчавання з'яўляецца развіццё камбінатаў школьнага і студэнцкага харчавання, якія служаць базавымі прадпрыемствамі для забеспячэння сталовых устаноў адукацыі паўфабрыкатамі і іншай харчовай прадукцыяй. На думку Казіміра Фарыно, звесці да мінімуму негатыўны ўплыў чалавечага фактара можна з дапамогай цэнтралізацыі і індустрыялізацыі школьнага харчавання. Да таго ж гэта паспрыяе і больш эфектыўнаму выкарыстанню бюджэтных сродкаў.

— Неабходнай умовай развіцця сістэмы якаснага харчавання з'яўляецца ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы аб'ектаў харчавання ўстаноў адукацыі і прывядзенне яе ў адпаведнасць з сучаснымі патрабаваннямі, — падкрэсліў Казімір Фарыно. — Трэба адзначыць, што ў рэгіёнах у ходзе рэалізацыі тэрытарыяльных праграм толькі за апошнія тры гады былі выкананыя капітальныя рамонтныя работы на харчовых блоках больш як 1,2 тысячы ўстаноў адукацыі. Пры гэтым на правядзенне капітальных і бягучых рамонтаў і мадэрнізацыю аб'ектаў харчавання было выдаткавана больш за 70 млрд рублёў. Распачалося аснашчэнне сталовых сучаснымі відамі высокапрадукцыйнага абсталявання, якое забяспечвае ашчаднае прыгатаванне ежы з мінімальнымі стратамі вітамінаў і мікраэлементаў. Заслугоўвае ўвагі вопыт работы ў гэтым напрамку сталіцы, дзе ў сталовых 17 працэнтаў агульнаадукацыйных устаноў устаноўлены 45 параканвектаматаў. Для максімальнага ахопу навучэнцаў гарачым харчаваннем і паляпшэння яго якасці ва ўстановах адукацыі ўкараняюцца новыя тэхналогіі прыгатавання ежы і прагрэсіўныя формы абслугоўвання, такія як папярэдні заказ страў па меню заўтрашняга дня, абслугоўванне з элементамі «шведскага стала», водпуск страў у шматпарцыённым посудзе. Па папярэдніх заказах працуюць каля 45 працэнтаў агульнаадукацыйных устаноў. На камбінатах школьнага харчавання ўжо пераслалі здзіўляцца, калі са школы ім прыходзіць заказ вячэрняга меню рэстарана. Атрымала развіццё практыка арганізацыі на базе ўстаноў адукацыі работы стацыянарных буфетаў, школьных кавярняў, кафетэрыяў і бараў. Дарэчы, чыпсы і газіроўка даўно знаходзяцца ў школьных буфетах пад забаронай. І гэта цалкам заслуга санітарнай службы.

### Школьная кухня — зона рызыкі?

Асобна Казімір Фарыно спыніўся на праблемах, якія патрабуюць тэрміновага вырашэння. Адна з іх — неадпаведнасць грашовых нормаў выдаткаў на харчаванне фізіялагічным нормам харчавання.

— Па гэтай прычыне ў большасці дашкольных, дзіцячых інтэрнатных устаноў і навучальных устаноў прафтэхадукацыі адзначаецца невыкананне да 40 працэнтаў нормаў харчавання па асноўных бялковых прадуктах (мясе, рыбе, тварагу і г.д) і садавіне, — паведаміў Казімір Фарыно. — Пры гэтым меню нярэдка складаецца з улікам кошту прадуктаў харчавання, а не фізіялагічнай патрэбы дзяцей у біялагічна каштоўных рэчывах, у сувязі з чым у рацыёнах пераважае вугляводная мадэль харчавання.

У Міністэрстве адукацыі лічаць, што ***ёсць сэнс павялічыць бацькоўскую плату за дзіцячы садок, каб зрабіць харчаванне дзяцей больш паўнавартасным.*** Такі вопыт ёсць у Полацку, дзе бацькі даплачваюць 15 тысяч рублёў за харчаванне дзяцей штомесяц, што дазваляе практычна цалкам выконваць фізіялагічныя нормы харчавання, у тым ліку па соках і садавіне. У гэтым жа напрамку праводзіцца работа ў дашкольных установах Віцебска, Гомеля, Гродна, Жодзіна, Наваполацку, Оршы і іншых.

Але самым праблемным, на думку Казіміра Фарыно, з'яўляецца стан матэрыяльна-тэхнічнай базы харчблокаў у навучальных установах: ад 50 да 68 працэнтаў устаноўленага на харчблоках ва ўстановах адукацыі тэхналагічнага і халадзільнага абсталявання з-за працяглага тэрміну эксплуатацыі маюць высокую зношанасць і патрабуюць замены.

Па-ранейшаму маюць месца парушэнні тэхналогіі прыгатавання страў і рэалізацыі няякаснай прадукцыі.

— Хачу заўважыць, што для забеспячэння кантролю за арганізацыяй харчавання ва ўстановах адукацыі створаны саветы па харчаванні і бракеражныя камісіі. У большасці ўпраўленняў і аддзелаў адукацыі ўведзены пасады інжынераў-тэхнолагаў. Разам з тым, успышка ў дзіцячым садзіку ў Пінску прадэманстравала, што кантроль за забеспячэннем якаснага харчавання навучэнцаў ажыццяўляецца недастаткова эфектыўна, а работнікі харчблокаў не заўсёды сумленна ставяцца да выканання сваіх абавязкаў, — падкрэсліў Казімір Фарыно.

У сувязі з напружанай эпідэмічнай сітуацыяй па захворванні вострымі кішэчнымі інфекцыямі, якая склалася ў Беларусі з пачатку года (у першым квартале адбыўся рост ВКІ на 30 працэнтаў), у сакавіку санэпідслужбай былі праведзеныя запланаваныя праверкі харчблокаў устаноў адукацыі. Парушэнні патрабаванняў санітарных нормаў і правілаў былі выяўлены на харчблоках 30 працэнтаў ад агульнай колькасці

# ВЫКЛЮЧНАЯ НАСТОЙЛІВАСЦЬ І ПЛЁННАЯ ПРАЦАВІТАСЦЬ вядуць па жыцці

## Міхаіла Уладзіміравіча Мясніковіча, якому 6 мая спаўняецца 60 гадоў

Паназіраўшы за актыўнасцю і нястомнасцю М.У. Мясніковіча ў пошуку новых карысных для Беларусі праектаў у розных сферах дзейнасці і напорыстасці ў іх ажыццяўленні, нізашто не паверыш, што Міхаілу Уладзіміравічу спаўняецца 60 гадоў. Гэткай няўрымслівасці і выніковасці можа пазайздросціць і каторы малады. І гэта, напэўна, не дзіўна, калі ведаць, як і ў якіх умовах гартаваўся характар цяперашняга старшыні Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук.

Ён закончыў 10 класаў Сноўскай сярэдняй школы, што ў Нясвіжскім раёне. На год раней я закончыў 11 класаў гэтай жа школы. Нас вучылі адны настаўнікі. І няхай гэта не прагучыць надта пафасна — найперш вучылі таму, каб маглі выхаванцы стаць сапраўднымі грамадзянамі сваёй краіны. Бо разумелі і дабіваліся гэтага разумення ад вучняў, што чалавек без каранёў — не жылец на гэтым свеце, што повязь са справамі папярэднікаў — неабходная ўмова развіцця любога народа, любой краіны. Настаўнікі хацелі, каб мы ўсвядомілі, што чалавек, адданы свайму краю, знітаваны са сваім народам, не стане Іванам без роду і племені, не будзе рабіць крыўды роднай зямлі, не будзе шкодзіць ёй. І толькі нашмат пазней я зразумеў глыбінную сутнасць той навукі, знайшоў доказ праўдзівасці настаўнікавых слоў. Зразумеў, калі ўпершыню пачуў значна больш за сказанае ў школьных падручніках пра паўстанцаў Кастуся Каліноўскага і іхні пароль з водгукам: «Каго любіш? Люблю Беларусь. То ўзаемна». Аказваецца, гэтая сутнасная любоў невынішчальна жыла ў нашым народзе насуперак любым нягодам і рознай неспрыяльнасці. Жыла, жыве і, спадзяюся, жыцьме.

А тады, у сярэдзіне шасцідзясятых, нас вучылі гэтаму найперш заўзятыя краязнаўцы — настаўнік беларускай літаратуры Іван Іосіфавіч Калоша і настаўнік чарчэння Пётр Іванавіч Пазняк. Вадзілі пешшу, вазілі на роварах па гістарычных мясцінах нясвіжскай зямлі, каб мы самі, сваімі нагамі змералі яе, сваімі вушамі пачулі легенды і паданні пра мінулае, на свае вочы пабачылі, як і чым жывуць сучаснікі, якія помнікі гісторыі і культуры пакінулі нам папярэднікі. Тады і даведаўся я, неснаўчанін, што вёска Сноў некалі была не адна, паблізу, практычна зліўшыся з ёю, стаялі Горны Сноў, Дольны Сноў, дзе на бровары працаваў Янка Купала, Новы Сноў, дзе нарадзіўся тады яшчэ проста Міша Мясніковіч.

Нашы настаўнікі вучылі нас удумліва чытаць гісторыю сваёй зямлі, сваіх вёсак і хутароў, сваіх родаў. З гэтай навукі вырас, выпеставаны няўрымслівасцю і сапраўдным талентам І.І. Калошы, выдатны школьны музей, які дагэтуль здзіўляе сваёй прадуманасцю і багаццем экспанатаў. Нашы мудрыя настаўнікі вучылі нас радзімазнаўству і радзімалюбству — як на мой розум, то найвышэйшай з усіх навук. Рабілі гэта шчыра і захоплена, кваліфікавана, разумна і даходліва. Ды так, каб — на ўсё жыццё, каб без хлусні і падману, каб свядома. Яны дабіліся гэтага.

Для чаго такі вялікі ўступ, калі я хачу сказаць пра аднаго з выпускнікоў Сноўскай школы Міхаіла Уладзіміравіча Мясніковіча? А менавіта для таго, каб засведчыць, што навука нашых настаўнікаў не прапала марна, пасеянае імі насенне радзімазнаўства і радзімалюбства дало добры ўраджай, умалотны плён якога сёння спажывае не адно беларуская навука, а і ўся наша краіна. Бо клопаты Старшыні Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук не абмяжоўваюцца толькі і выключна навукай. Для дзяржаўнага дзеяча такога высокага рангу гэтага было б відавочна замала. Не таго калібру натура, не такой загартоўкі характар. Сноўскай загартоўкі, значыцца. Ён — сын сваёй зямлі, моцна знітаваны з ёй сваімі памкненнямі і родавымі повязямі. Глыбока асэнсаваўшы і пераняўшы запаветы продкаў, ён зразумеў неацэнную каштоўнасць працы для людзей. Калі дзеіць — то на ўвесь абсяг сваіх здольнасцяў. Калі ствараць — то з найбольшай карысцю для народа і краіны, каб не сорамна перад землякамі. Калі аддаваць іншым тое, што ўмееш сам, — то не жменькай, а прыгаршчамі, ды яшчэ з каптуром.

Так вучылі нас у Сноўскай сярэдняй школе. Так робіць сёння адзін з яе выпускнікоў — Міхаіл Мясніковіч. Ён годна прадаўжае плеяду тых выхаванцаў, якімі ганарыцца не адно Сноў і сноўская зямля. На шчасце, людзей высокага палёту, што сталіся выбітнымі асобамі нашай краіны, гэтая зямля выхавала шмат. Назаву хоць бы некаторых з іх. Я.В. Аляксанкін — шматгадовы старшыня калгаса імя Калініна, кандыдат навук, Герой Сацыялістычнай Працы. М.А. Карчміт — заснавальнік створанага ў новым часе агракамбіната «Сноў», Герой Беларусі. Р.І. Клім — алімпійскі чэмпіён, заслужаны дзеяч фізічнай культуры Беларусі, кандыдат педагагічных навук. Я.І. Ждан — мастак сцэны, заслужаны дзеяч культуры Беларусі. А.С. Падгайскі — спявак, заслужаны артыст Беларусі. Яны супольна з сотнямі, тысячамі выбітных людзей Нясвіжчыны стваралі тую дабрадзейную аўру, што змушала моладзь ва ўсёй паўнаце раскрываць свае здольнасці, цягнуцца за лепшымі сваімі папярэднікамі, стымулявала пошук рэальных падстаў, каб пераўзысці іх, бо іначай спыніўся б прагрэс, затармазіўся б поступ наперад. М.У. Мясніковіч — адзін з тых, хто пераўзышоў, хто своечасова зразумеў гэтую ісціну, засвоіў і надзіва шчодра праяўляе ў навуковай, дзяржаўнай і грамадскай дзейнасці.

Мяне заўсёды падкупляла тая настойлівасць, з якой Міхаіл Уладзіміравіч дабіваўся свайго. Свайго не дзеля сябе, а для той справы, якой ён самаддана служыў і служыць. Значыць — для людзей. Дзівіла яго мэтанакіраванасць — калі наважыў, абавязкова даб'ецца, зробіць, выканае. Прызнаюся, што з-за сваёй неарганізаванасці я не здолеў давесці да выніковасці сваю навуковую працу, не дапісаў кандыдацкую, хоць мой навуковы кіраўнік, выдатны паэт і не менш выдатны вучоны-філолаг Алег Антонавіч Лойка штурхаў мяне і ў спіну, і ў шыю, — закруціў жыццёвы вір. Не менш вірлівым быў той час і для Міхаіла Уладзіміравіча. Аднак жа ён здолеў арганізаваць сябе і свае справы, свой час такім чынам, каб і з асноўнымі працоўнымі абавязкамі спраўляцца паспяхова, і ў навуцы сказаць сваё слова. Ён выдатна даказаў, што не адольвае дарогі той, хто стаіць на месцы. Гэта ж якой даўжыні суткі трэба было мець, які запас трываласці, якую бязадмоўную напорыстасць, каб падчас адказнай дзяржаўнай працы, калі кожная хвіліна вымагала дзейнасці і рознай чыноўнай мітусні, абараніць кандыдацкую, а пасля і доктарскую дысертацыі?

Давайце прызнаем, што ягоная кар'ерная лесвіца (ёсць такая ў кожнага чалавека, і не будзем самі сабе хлусіць, што мы абыякавыя да яе прыступкаў) доказна сведчыць пра рэалізацыю тых адметных якасцяў характару, што запачаткаваліся яшчэ ў дзяцінстве, шліфаваліся ў школьныя гады і ўдала развіваліся з кожным новым крокам па жыцці. Я не буду пералічваць усе пасадныя перамяшчэнні Міхаіла Уладзіміравіча, кожны можа знайсці гэта ў шматлікіх энцыклапедычных даведніках, але я цвёрда перакананы — гэта былі ўласнай працай, настойлівасцю, энергіяй, здатнасцю, творчым падыходам і высокай адказнасцю заслужаныя чарговыя прыступкі па лесвіцы, што вядзе ўгару. Адначасова хацеў бы зазначыць, што не бесцялесны анёл Міхаіл Уладзіміравіч, а жывы чалавек — са сваім характарам, сваімі звычкамі, схільнасцямі, недахопамі. І гэта аніколькі не змяншае значнасці здзейсненага ім.

Мяне, чалавека знаёмага з дыпламатычнай працай, па-добраму здзіўлялі праявы дыпламатычнага таленту Міхаіла Уладзіміравіча. Гэта ж якімі здольнасцямі трэба было валодаць, каб адстойваць інтарэсы свайго народа перад спрактыкаванымі замежнымі чыноўнікамі, каб з карысцю для сваёй краіны развязваць вельмі няпростыя эканамічныя і фінансавыя праблемы на міжнародным і міждзяржаўным узроўні, калі нас слухалі, але не заўсёды хацелі чуць. Не меншага дыпламатычнага ўмельства вымагала ўнутраная палітыка, у тым ліку эканамічная, кадравая. Міхаіл Уладзіміравіч спраўляўся з усімі хітраспляценнямі з найменшымі выдаткамі, лагодзячы розныя супярэчлівыя погляды і меркаванні, вылушчваючы самыя эфектыўныя і выгадныя рашэнні.

Мо таму навука і стала яго другой натурай, што прыклад землякоў быў поклічным і мабілізуючым. Не менш як 30 навукоўцаў апошняга часу выхавала нясвіжская зямля. Падаецца, у Нясвіжы спакойна можна было б адкрыць філіял Нацыянальнай акадэміі навук, кадраў хапіла б на паўнавартасную навуковую і даследчую працу. Думаецца, што менавіта навука, падсвечаная багатай практыкай дзяржаўнай дзейнасці, адкрыла дарогу М. Мясніковічу да спраўджання свайго бачання з'яў, падзей, шляхоў развіцця грамадства і эканомікі, яе міжнародных повязяў і ўплыву на наш агульны дабрабыт.

Мяне заўсёды захапляла ягоная працавітасць, апантанасць справай, невычарпальнасць ідэй і прапаноў. Назаўсёды запомніліся крыху ўсмешлівыя вочы — ніякая стома не гасіла там жывы агеньчык цікаўнасці, спагадлівасці, прыязнасці, не прыцьмявала прагу дзеяння. А да людскіх вачэй у мяне асаблівае стаўленне. Лічу, што ў іх уся праўда. Як бы хораша ні прамаўлялі вусны, якое б красамоўства з іх ні злятала, а вочы заўсёды высвецяць праўду: альбо пацвердзяць сказанае, альбо абвергнуць. У адрозненне ад языка вочы не хлусяць. І вельмі хацелася б, каб ніколі ў Міхаіла Уладзіміравіча не ўзнікала патрэбы адводзіць вочы.

А яшчэ, відаць, са школьных гадоў засталося ў М.У. Мясніковіча жаданне ісці нятоптанымі сцежкамі, імкненне быць першым. Не, мо не так і не столькі першынстваваць самому (хоць і гэта не загана), а найбольш дабівацца першынства, клапаціцца пра першаадкрыцці ў той сферы дзейнасці, якой ён на гэты момант аддаваў свае здольнасці. Так вучылі не адно Сноўскія настаўнікі, але і папярэднікі, для якіх важнейшым напрамкам пошукаў і намаганняў было першаадкрыццё. Такіх папярэднікаў на нясвіжскай зямлі было шмат ва ўсе часы. А сёння ўжо Міхаіл Уладзіміравіч Мясніковіч — адзін з іх для сучаснай моладзі. Значыць, не парвецца повязь часу, не перапыніцца пераемнасць традыцый і добрых спраў. А ў выніку — пабагацее зямля нясвіжская добра дзейнымі людзьмі, узбагаціцца зямля беларуская карыснымі справамі для людскога дабра.

Таму Міхаілу Уладзіміравічу — многія леты, магутнасці духу і нястомнасці ў прадукаванні і ажыццяўленні новых ідэй дзеля дабра і карысці народа, які вывеў яго на шырокі прасяг, і якому М.У. Мясніковіч служыць з поўнай самааддачай і найплённай выніковасцю.

**Анатоль БУТЭВІЧ.**

# ЧАЛАВЕК, ЯКІ ЖЫВЕ СЁННЯ

***…Дзецям у Аўцюкоўскай школе загадалі сачыненне напісаць, як хто правёў лета. І абавязкова зрабіць выснову.***

***Малы аўцюк накрэмзаў: «Летам я пасвіў кароў».***

***Выснова: «Каб тыя каровы падохлі».***

***Гарадскі чалавек пытае ў аўцюка:***

***— Чым адрозніваюцца памінкі ад вяселля?***

***— На памінках, каласок, на аднаго выпівоху меней.***

***— А што такое глупства?***

***— Усё! Апроч баб.***

***У інваліда вайны восем дзяцей.***

***— Цікава, як вы маглі іх займець? — пытае журналіст.***

***— А што, каласок, магу, тое і раблю, — адказвае аўцюк.***

***Ён жа неяк фатаграфаваў нябожчыка. Навёў апарат... І даў звыклую каманду:***

***— Не варушыся, каласок, здымаю...***

Уладзімірам Ліпскім. Менавіта ён, Уладзімір Сцяпанавіч, адкрыў свету «планету Аўцюкі», менавіта ён, па прызнанні былога начальніка аддзела культуры Калінкавіцкага райвыканкама Валянціны Альбінаўны Тугай стаў бацькам цяпер ужо традыцыйнага фестывалю беларускага народнага гумару.

— Яго была ідэя!.. Здаецца, у 1995-м ён прапанаваў зрабіць у Аўцюках свайго роду «з'езд гумарыстаў». З усёй краіны! — успамінае спадарыня Валянціна. — Тадышняму старшыні нашага райвыканкама Мікалаю Апанасавічу Пранкевічу думка спадабалася, ён згадзіўся. А далей усё закруцілася. Уладзімір Сцяпанавіч прапанаваў месца — пад дубамі, у лесе паміж Вялікімі і Малымі Аўцюкамі. Ад яго ж зыходзілі прапановы максімальна прыблізіць свята да людзей — на ўваходзе ў вёскі адкрыць па мытні, пайсці па вуліцах, па хатах... Што вельмі важна — самі аўцюкоўцы ўскалыхнуліся, падтрымалі гэту ідэю, а ўжо як рыхтаваліся! Тым больш што госці былі з Балгарыі, з Расіі, з Украіны, з Прыбалтыкі... А якія людзі ў журы — Ніл Гілевіч, Генадзь Бураўкін, Віктар Казько, Міхаіл Дрынеўскі, Мікола Чарняўскі, Валянцін Блакіт (светлай памяці!), Тадэвуш Стружэцкі, Анатоль Бутэвіч, Валерый Гедройц, Алесь Пісьмянкоў... У першы раз, прызнаюся, вельмі страшна было, бо вопыту правядзення падобных святаў (рэспубліканскага ўзроўню!) у нас аніякага... «Кіраваў працэсам» сам Уладзімір Сцяпанавіч... З яго лёгкай рукі ўжо шэсць фестываляў прайшло. За ўсіх людзей скажу: тое лета, калі фестывалю няма, для ўсяго раёна нейкае пустое. Калі ж чакаем — задзейнічаны ўсе службы, усе арганізацыі. Ды і Аўцюкоў цяпер не пазнаць — не тыя людзі (з форсам!), не тыя вёскі — добраўпарадкаваныя, прыбраныя... Без Ліпскага, без фестываляў да іх не ўчора рукі дайшлі б, а так...

Трэба адзначыць, што фестываль народнага гумару — далёка не адзінае, што можа запісаць на асабісты рахунак добрых спраў спадар Ліпскі: звыш 60 кніг (у тым ліку дзіцячых), старшынства ў Беларускім дзіцячым фондзе (цягам дваццаці гадоў), рэдактарства ў часопісе «Вясёлка» (цягам больш, чым 30...).

А ўсіх — сёння — 70!.. Гадоў... Альбо 25 тысяч 550 дзён (як аблічыў Уладзімір Сцяпанавіч). І меў рацыю, бо лічачы не гады, а менавіта дні (кожны з адпушчаных Богам!), можна паспець болей.

**Валянціна ДОЎНАР.**

**P.S.** *Суб'ектыўны погляд... Лепшая з кніг — «Жыві сёння».*

**P.P.S.** *Ад усёй вялікай грамады аўцюкоўцаў: «З юбілеем, шаноўны Уладзімір Сцяпанавіч! Здароўя, натхнення, новых ідэй!.. А яшчэ — заставацца гэткім жа свайм: простым і блізкім. Да ўсіх людзей. На новыя тысячы дзён.*

**УТВЕРЖДЕНО**
*Протокол заседания Наблюдательного совета ОАО «АСБ Беларусбанк»*
*29.03.2010 № 9*

**ЗАВЕРЕНО**
*Департамент по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь*
_____ *В.Г.Кулаженко*
*17.04.2010*

БЕЛАРУСБАНК

# КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ

## об открытой продаже облигаций восемьдесят четвертого – девяностого выпусков

Открытого акционерного общества «Сберегательный банк «Беларусбанк»

**Раздел 1**

**ОБЩИЕ СВЕДЕНИЯ ОБ ЭМИТЕНТЕ**

**1. Полное и сокращенное наименование эмитента (на белорусском и русском языках)**

Наименование эмитента на белорусском языке:

полное: Адкрытае акцыянернае таварыства «Ашчадны банк «Беларусбанк»;

сокращенное: ААТ «Акцыянерны Ашчадны банк «Беларусбанк» (ААТ «ААБ Беларусбанк»);

наименование эмитента на русском языке:

полное: Открытое акционерное общество «Сберегательный банк «Беларусбанк» (в дальнейшем именуемое «Банк»);

сокращенное: ОАО «Акционерный Сберегательный банк «Беларусбанк» (ОАО «АСБ Беларусбанк»).

**2. Место нахождения эмитента, телефон, факс, электронный адрес (e-mail)**

Место нахождения: Республика Беларусь, 220050, г. Минск, ул. Мясникова, 32.

телефон: (017) 218 84 08;

телефон/факс: (017) 222 26 26;

e-mail: info@belarusbank.by.

**3. Номера расчетного и/или валютного счетов эмитента, на которые будут зачисляться средства, поступающие при проведении открытой продажи облигаций**

Денежные средства от открытой продажи облигаций восемьдесят четвертого – девяностого выпусков (в дальнейшем именуемые совокупно «Облигации») будут поступать на соответствующие балансовые счета 4940, открытые в филиалах, центрах банковских услуг Банка, а также в ОПЕРУ центрального аппарата Банка.

**4. Наименование периодического печатного издания, в котором будет публиковаться бухгалтерская отчетность эмитента в составе, определенном законодательством, и сроки ее публикации**

Бухгалтерская отчетность по итогам работы Банка за 2008 год опубликована 28.03.2009 в газете «Звязда» (№ 58). По итогам работы Банка за 2009 год и последующие годы указанная информация будет опубликована не позднее трех месяцев со дня окончания отчетного финансового года в газете «Звязда».

**5. Наименование депозитария, обслуживающего эмитента**

Депозитарием эмитента является депозитарий Банка (номер государственной регистрации Банка – 056, код депозитария Банка – 005), расположенный по адресу: Республика Беларусь, 220050, г. Минск, ул. Мясникова, 32, действующий на основании специального разрешения (лицензии) на право осуществления профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам № 02200/0385601 (зарегистрирована в реестре лицензий Министерства финансов Республики Беларусь: № 5200-1246-1044, срок действия – до 29.07.2012).

**6. Размер уставного фонда эмитента**

Уставный фонд Банка составляет 2288787859000 (Два триллиона двести восемьдесят восемь миллиардов семьсот восемьдесят семь миллионов восемьсот пятьдесят девять тысяч) белорусских рублей.

**7. Место, время и способ ознакомления с проспектом эмиссии облигаций**

С Проспектом эмиссии облигаций восемьдесят четвертого – девяностого выпусков Открытого акционерного общества «Сберегательный банк «Беларусбанк» можно ознакомиться на официальном сайте Банка по адресу: http://www.belarusbank.by/.

С копией указанного Проспекта можно ознакомиться визуально во всех пунктах продажи Облигаций: в филиалах-областных (Минском) управлениях, филиалах, центрах банковских услуг Банка, структурных подразделениях Банка, филиалов, центров банковских услуг, а также в ОПЕРУ центрального аппарата Банка ежедневно (кроме выходных и нерабочих праздничных дней) в течение операционного дня соответствующего учреждения Банка.

**Раздел 2**

**СВЕДЕНИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОЙ ПРОДАЖИ ОБЛИГАЦИЙ**

**8. Дата принятия решения о выпуске облигаций и наименование органа, принявшего это решение**

Решение о восемьдесят четвертом – девяностом выпусках облигаций Открытого акционерного общества «Сберегательный банк «Беларусбанк» в соответствии с подпунктом 10.2 Устава Банка принято Наблюдательным советом Банка 29.03.2010, протокол № 9.

**9. Форма выпуска облигаций, объем эмиссии, количество и номинальная стоимость облигаций**

Облигации выпускаются в документарной форме.

| № выпуска | Объем эмиссии | Количество облигаций, штук | Серия, номера облигаций | Номинальная стоимость облигации |
|---|---|---|---|---|
| 84 | 20.000.000 евро | 20.000 | ВЫ84 00001 - 20000 | 1000 евро |
| 85 | 15.000.000 евро | 30.000 | ВЭ85 00001 - 30000 | 500 евро |
| 86 | 5.000.000 евро | 25.000 | ВЮ86 00001 - 25000 | 200 евро |
| 87 | 25.000.000 долларов США | 25.000 | ВЯ87 00001 - 25000 | 1000 долларов США |
| 88 | 15.000.000 долларов США | 30.000 | ГА88 00001 - 30000 | 500 долларов США |
| 89 | 35.000.000.000 белорусских рублей | 35.000 | ГБ89 00001 - 35000 | 1.000.000 белорусских рублей |
| 90 | 25.000.000.000 белорусских рублей | 50.000 | ГВ90 00001 - 50000 | 500.000 белорусских рублей |

**10. Цель выпуска облигаций**

Выпуск Облигаций осуществляется в целях привлечения временно свободных денежных средств физических лиц, резидентов и нерезидентов Республики Беларусь, приобретающих Облигации не в целях предпринимательской деятельности (в дальнейшем именуемые «Физические лица»), и направления полученных средств на пополнение ресурсной базы Банка.

**11. Сведения об обеспечении исполнения обязательств по облигациям**

Выпуск Облигаций осуществляется Банком по согласованию с Национальным банком Республики Беларусь (письмо от 06.04.2010 № 15-17/46) в пределах 80 процентов нормативного капитала Банка в соответствии с подпунктом 1.8 пункта 1 Указа Президента Республики Беларусь от 28.04.2006 № 277 «О некоторых вопросах регулирования рынка ценных бумаг».

**12. Период проведения открытой продажи облигаций**

После опубликования настоящей Краткой информации, заверенной в установленном порядке Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь, Банк проводит открытую продажу Облигаций с 01.06.2010 по 30.11.2011, если больший срок не будет определен Правлением Банка. Срок открытой продажи Облигаций может быть сокращен в случае полной реализации всего объема эмиссии Облигаций.

**13. Место и время проведения открытой продажи облигаций**

Открытую продажу Облигаций осуществляют филиалы, центры банковских услуг Банка, структурные подразделения Банка, филиалов, центров банковских услуг, а также ОПЕРУ центрального аппарата Банка ежедневно в течение операционного дня соответствующего учреждения Банка.

Облигации продаются по их номинальной стоимости в валюте номинала. Владельцами Облигаций Банка в период открытой продажи могут быть Физические лица.

**14. Срок обращения облигаций**

Срок обращения Облигаций – 730 календарных дней (с 01.06.2010 по 31.05.2012). День начала размещения и день начала погашения Облигаций считаются одним днем.

**15. Дата начала погашения облигаций**

Дата начала погашения Облигаций – 31.05.2012

**16. Размер дохода по облигациям, условия его выплаты**

По Облигациям установлен процентный доход (в виде процента к номинальной стоимости Облигации), равный:

8 (Восьми) процентам годовых – по облигациям 84-86 выпусков, номинированным в евро;

8 (Восьми) процентам годовых – по облигациям 87-88 выпусков, номинированным в долларах США;

ставке рефинансирования Национального банка Республики Беларусь (с учетом ее изменения) плюс 6 (Шесть) процентных пунктов – по облигациям 89-90 выпусков, номинированным в белорусских рублях.

Выплата процентного дохода по облигации производится:

периодически (один раз в три месяца – по облигациям 84, 85, 87, 88, 89, 90 выпусков; 1 раз в шесть месяцев – по облигациям 86-го выпуска), начиная со дня окончания соответствующего периода начисления процентного дохода;

в течение срока обращения Облигаций;

при условии предъявления Физическим лицом оригинала Облигации в Банк.

Процентный доход по облигациям 84-88 выпусков рассчитывается по следующей формуле:

$$Д = \frac{Нп \times Пп}{100} \times \left( \frac{Т365}{365} + \frac{Т366}{366} \right), \text{ где:}$$

Д – процентный доход по Облигации соответствующего выпуска;

Нп – номинальная стоимость Облигации соответствующего выпуска;

Пп – ставка процентного дохода (процентов годовых);

Т365 – количество дней периода начисления процентного дохода, приходящееся на календарный год, состоящий из 365 дней;

Т366 – количество дней периода начисления процентного дохода, приходящееся на календарный год, состоящий из 366 дней.

Процентный доход по облигациям 89-90 выпусков рассчитывается по следующей формуле:

$$Д = (П1*Нп*t1 + П2*Нп*t2 + \ldots. + Пп*Нп*tn) / (365(366)*100), \text{ где:}$$

Д – процентный доход по Облигации соответствующего выпуска;

П1, П2, Пп – ставка процентного дохода (процентов годовых) за соответствующую часть периода начисления процентного дохода, в пределах которой действующая ставка рефинансирования Национального банка Республики Беларусь была неизменной, равная действующей ставке рефинансирования Национального банка Республики Беларусь плюс 6 п.п.;

Нп – номинальная стоимость Облигации соответствующего выпуска;

tl, t2, tn – количество дней в соответствующей части текущего периода начисления процентного дохода, в пределах которой ставка рефинансирования Национального банка Республики Беларусь была неизменной.

Выплата процентного дохода по Облигациям производится в наличном либо безналичном порядке. В случае если день начала выплаты процентного дохода выпадает на нерабочий день, выплата процентного дохода осуществляется, начиная с первого рабочего дня, следующего за нерабочим днем.

При выплате процентного дохода наличной иностранной валютой по облигациям 84 – 88 выпусков, номинированным в иностранной валюте, Банк покупает у владельца облигации часть процентного дохода в размере менее минимального номинала банкноты иностранной валюты по обменному курсу покупки иностранной валюты, установленному в обменном пункте (кассе), осуществляющем(ей) покупку, на момент совершения операции выплаты процентного дохода.

Выплата процентного дохода по Облигациям осуществляется филиалами, центрами банковских услуг Банка, структурными подразделениями Банка, филиалов, центров банковских услуг, а также ОПЕРУ центрального аппарата Банка (независимо от места продажи Облигации) в течение операционного дня соответствующего учреждения Банка.

При досрочном погашении Облигации сумма неполученного процентного дохода рассчитывается по дату ее досрочного погашения включительно.

**17. Период начисления процентного дохода по облигациям**

Начисление процентного дохода осуществляется за период со дня, следующего за днем фактической продажи Банком Облигации, по 31.05.2012 включительно (за исключением случая предъявления Облигации к досрочному погашению). Со дня истечения срока обращения Облигации (31.05.2012) процентный доход не начисляется.

Первый процентный доход по соответствующей Облигации начисляется со дня, следующего за днем ее продажи Банком, по день начала выплаты процентного дохода за период начисления процентного дохода, в котором была продана Облигация, включительно. Последующие процентные доходы (включая последний) начисляются со дня, следующего за днем начала выплаты процентного дохода за предшествующий период начисления процентного дохода, по день начала выплаты процентного дохода по данному периоду начисления процентного дохода включительно (дату начала погашения – 31.05.2012).

**18. Даты выплаты процентного дохода**

Процентный доход выплачивается в дату окончания соответствующего периода начисления процентного дохода:

по облигациям 84, 85, 87, 88, 89, 90 выпусков:

| Порядковый номер периода | Начало периода | Конец периода, дата выплаты процентного дохода | Продолжительность периода (дней) |
|---|---|---|---|
| 1 | 02.06.2010 | 31.08.2010 | 91 |
| 2 | 01.09.2010 | 30.11.2010 | 91 |
| 3 | 01.12.2010 | 28.02.2011 | 90 |
| 4 | 01.03.2011 | 31.05.2011 | 92 |
| 5 | 01.06.2011 | 31.08.2011 | 92 |
| 6 | 01.09.2011 | 30.11.2011 | 91 |
| 7 | 01.12.2011 | 29.02.2012 | 91 |
| 8 | 01.03.2012 | 31.05.2012 | 92 |
| ИТОГО | | | 730 |

по облигациям 86-го выпуска:

| Порядковый номер периода | Начало периода | Конец периода, дата выплаты процентного дохода | Продолжительность периода (дней) |
|---|---|---|---|
| 1 | 02.06.2010 | 30.11.2010 | 182 |
| 2 | 01.12.2010 | 31.05.2011 | 182 |
| 3 | 01.06.2011 | 30.11.2011 | 183 |
| 4 | 01.12.2011 | 31.05.2012 | 183 |
| ИТОГО | | | 730 |

В случае если дата выплаты процентного дохода выпадает на нерабочий день, выплата осуществляется в первый рабочий день, следующий за нерабочим днем. Проценты на сумму процентного дохода по Облигациям за указанные нерабочие дни не начисляются и не выплачиваются. Под нерабочим днем в настоящей Краткой информации считаются выходные дни, государственные праздники и праздничные дни, установленные и объявленные Президентом Республики Беларусь нерабочими днями.

**19. Условия и порядок досрочного погашения выпуска облигаций**

Облигация может быть предъявлена к досрочному погашению, но не ранее рабочего дня, следующего за днем истечения:

шести месяцев со дня продажи Банком облигаций 84-88 выпусков;

трех месяцев со дня продажи Банком облигаций 89-90 выпусков.

При этом предъявителю оригинала Облигации выплачивается ее номинальная стоимость и неполученный процентный доход по дату досрочного погашения Облигации включительно.

При досрочном погашении Облигации выплата части номинала Облигации и/или части процентного дохода не производится.

**20. Порядок погашения облигаций**

Погашение Облигации осуществляется, начиная с 31.05.2012, в отношении лица, предъявившего оригинал Облигации в Банк к погашению.

Погашение Облигации (независимо от места ее продажи) осуществляют филиалы, центры банковских услуг Банка, структурные подразделения Банка, филиалов, центров банковских услуг, а также ОПЕРУ центрального аппарата Банка ежедневно в течение операционного дня соответствующего учреждения Банка.

При погашении Облигации владельцу возмещается номинальная стоимость Облигации, а также уплачиваются все неполученные процентные доходы наличными деньгами либо в безналичном порядке в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

При погашении Облигации выплата части номинала Облигации и/или части процентного дохода не производится.

**21. Условия и порядок возврата средств инвесторам при запрещении выпуска Облигаций Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь**

В случае запрета Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь выпуска Облигаций, Банк в срок не позднее 30 дней с момента принятия указанного решения возвращает владельцам Облигаций денежные средства, направленные на покупку Облигаций, с уплатой процентов за пользование денежными средствами (с даты, следующей за датой продажи Облигации, до даты ее возврата, но не позднее дня истечения 30 дней с момента принятия вышеуказанного решения) по процентной ставке, указанной в части первой пункта 16 настоящей Краткой информации.

**22. Дата и номер государственной регистрации облигаций**

Облигации зарегистрированы Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь:

дата государственной регистрации Облигаций – 17.04.2010;

номер государственной регистрации Облигаций:

84 выпуска: 5–200–02–0553;

85 выпуска: 5–200–02–0554;

86 выпуска: 5–200–02–0555;

87 выпуска: 5–200–02–0556;

88 выпуска: 5–200–02–0557;

89 выпуска: 5–200–02–0558;

90 выпуска: 5–200–02–0559.

**Заместитель Председателя Правления – начальник ОПЕРУ Открытого акционерного общества «Сберегательный банк «Беларусбанк»** **Г.С.Господарик**

**Главный бухгалтер Открытого акционерного общества «Сберегательный банк «Беларусбанк»** **И.П.Лысоковская**

http://www.belarusbank.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 28.08.2008 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.

# Беларускія геральдысты пра «Пагоню» не забываюць

«Пагоня» мае статус гістарычнага сімвала і выкарыстоўваецца ў гербах тэрытарыяльна-адміністратыўных адзінак, паведамілі журналістам члены **Геральдычнага савета пры Прэзідэнце** на прэс-канферэнцыі, прысвечанай Дню Дзяржаўнага герба і сцяга, які традыцыйна адзначаецца ў нашай краіне ў другую нядзелю мая.

— Добры прыклад — у апошнім нумары часопіса «Армія» надрукаваны нарукаўны знак воінскай часці, якая дыслацыруецца ў Рэчыцы. Там асноўным сімвалам з'яўляецца герб горада Рэчыца — харугва з серабрыстым вершнікам з мячом. Гэта адказ тым, хто задае пытанні, ці выкарыстоўваем мы нашу гістарычную сімволіку. Выкарыстоўваем. Магчыма, не ў тых маштабах, як некаму хацелася б па палітычных або ідэалагічных меркаваннях, але мы ніколі яе не выразалі нажніцамі, пакідаючы толькі чырвоныя зоркі ці чырвона-зялёнае спалучэнне, — заявіў **Віктар ЛЯХАР, намеснік начальніка вайсковага інфармацыйнага агенцтва «Ваяр»**, член **Геральдычнага савета пры Прэзідэнце.**

У сваю чаргу **дырэктар Дэпартамента па архівах і справаводстве Мінюста Уладзімір АДАМУШКА** дадаў, што выява «Пагоні» выкарыстоўваецца на гербах Лепеля, Рэчыцы, Верхнядзвінска. Дарэчы, самай знакавай падзеяй у 2009 годзе геральдысты для сябе бачаць аднаўленне герба Віцебскай вобласці, на якім намаляваны ўзброены сярэбраны вершнік на чырвоным полі.

— Сімволіка Віцебшчыны была апошняй з абласных, прынятая да разгляду і зацвярджэння Указам Прэзідэнта, — кажа **Марына ЕЛІНСКАЯ, сакратар Геральдычнага савета пры Прэзідэнце**. — Праца над гэтым гербам ішла некалькі гадоў, было шмат прапаноў, але, тым не менш, я лічу, што ўзяла верх гістарычная праўда: герб цалкам адноўлены, прычым да апошняга цвіка на падкове каня, — сказала Марыя Міхайлаўна.

Цікава, што геральдыстам Беларусі працы па аднаўленні геральдычных сімвалаў тэрытарыяльных і адміністратыўна-тэрытарыяльных адзінак хопіць яшчэ не на адзін год:

Герб Віцебскай вобласці, зацверджаны Указам Прэзідэнта № 277 ад 2 чэрвеня 2009 года, уяўляе з сябе французскі шчыт, у чырвоным полі якога намаляваны сярэбраны вершнік у даспехах, які трымае ў правай руцэ над галавой меч, у левай — шчыт з залатым шасціканцовым крыжам. Герб вянчае вялікая залатая гарадская карона з пяццю зубцамі, знізу яго абрамляюць дзве залатыя дубовыя галіны, увітыя і злучаныя блакітнай стужкай.

— На сёння ў дзяржаўны геральдычны рэестр унесеныя гербы і сцягі 186 адміністратыўна-тэрытарыяльных і тэрытарыяльных адзінак, — паведаміў Уладзімір Адамушка. — Калі глядзець па рэгіёнах, то ў Брэсцкай вобласці — 38, Гродзенскай — 27, Віцебскай — 37, Мінскай — 30, Гомельскай — 32, Магілёўскай — 22.

Дарэчы, літаральна ў бліжэйшы час геральдычных сімвалаў на Міншчыне стане болей — ужо падрыхтаваны праект Указа Прэзідэнта аб зацвярджэнні сцягоў Любані і Любанскага раёна, Капыля і Капыльскага раёна, Узды і Уздзенскага раёна, Крупак і Крупскага раёна, Валожына і Валожынскага раёна, Старых Дарог і Старадарожскага раёна, Клецка і Клецкага раёна, Чэрвеня і Чэрвеньскага раёна.

— Сёння ўсе вобласці маюць свае гербы, усе гарады маюць свае геральдычныя сімвалы, працэнтаў 90 раённых гарадоў маюць сваю геральдыку, а вось што датычыцца вёсак і іншых адміністрацыйных адзінак, то сёння гэта непачаты край працы, — адзначыў Уладзімір Адамушка і дадаў, што геральдысты не ставяць мэтай поўную гербалізацыю ўсіх населеных пунктаў. — Мы фармулюем задачу так: калі захацелі мець сімволіку, то калі ласка, мы не супраць, будзем разглядаць, але каб гэта адпавядала ўсім правілам геральдыкі.

Віктар Ляхар расказаў, як прыкладна адбываецца працэс стварэння герба:

— Як правіла, штуршком да таго, што ў населенага пункта з'яўляецца жаданне мець сваю геральдыку, становіцца будучы юбілей ці добры прыклад суседзяў. Тады кіраўніцтва ўспамінае, што нядрэнна б гораду ці якой-небудзь тэрыторыі мець свой сімвал. Потым ствараецца ініцыятыўная група (як правіла, гэтым займаюцца ідэолагі ў выканкамах), праводзіцца конкурс. Дарэчы, конкурс — вельмі цудоўная з'ява, бо гэта патрыятызм, гэта калегіяльнасць, гэта агульны дух, гэта проста творчасць. — Але ў геральдыкі жорсткія законы і правілы, таму звычайна на такіх конкурсах сур'ёзных геральдычных рашэнняў не прымаецца і ініцыятыўная група вымушана звяртацца да мастака-геральдыста. Потым ствараецца агульная канцэпцыя, абмяркоўваецца, робіцца эталонная выява, яна выносіцца на абмеркаванне Геральдычнага савета, ёй даюць ацэнку эксперты, і, калі ўсе стадыі пройдзеныя, зацвярджаецца Указам Прэзідэнта.

Як расказалі геральдысты, зараз рыхтуецца новае выданне кнігі пра гербы і сцягі Беларусі (апошняе выданне яе было ў 2006 годзе). Новая кніга будзе дапоўненая на трэць, чакаецца, што яна ўбачыць свет або ў канцы 2010, або ў пачатку 2011 года.

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

# Ці з'явіцца нагрудны знак да 600-годдзя перамогі над Грунвальдам?

**СЁЛЕТА адзначаецца 600-гадовы юбілей перамогі войскаў Польшчы і Вялікага княства Літоўскага над тэўтонамі пад Грунвальдам. Наша газета ўжо пісала, што ваенным мастаком Віктарам Ляхарам быў распрацаваны праект памятнага медаля знарок да гэтай даты, а цяпер мы пацікавіліся ў аўтара, як прасоўваецца праца над нагрудным знакам.**

— У пачатку гэтага года Геральдычны савет узнімаў пытанне аб тым, што 2010 год знамянальны не толькі разгромам фашыстаў, але і разгромам нямецкіх рыцараў. Скажу болей, нават канцэптуальна ставілася задача падаць інфармацыйна гэта так, што Грунвальдская бітва — папярэдніца разгрому фашыстаў у 1945-м, што гэта сімвал яднання зацікаўленых бакоў. І адным з элементаў інфармацыйнага забеспячэння было стварэнне ўзнагароды на гэтую тэму, — расказаў **Віктар ЛЯХАР, намеснік начальніка вайсковага інфармацыйнага агенцтва «Ваяр», член Геральдычнага савета пры Прэзідэнце.** — Таму я намаляваў канцэптуальны малюнак, а да такіх мерапрыемстваў, як правіла, малюецца воін-пераможца, які топча адоленага ворага. Прыкладна ў такой жа канцэпцыі намаляваны і медаль да 600-годдзя Грунвальдскай бітвы: вершнік з мячом і шчытом, ідэнтычны гербу Вялікага княства Літоўскага, топча тэўтонскага рыцара, які стаіць на каленях. Я лічу, што атрымалася прыгожая і цікавая кампазіцыя.

Віктар Ляхар расказаў, што быў сабраны пакет дакументаў, была атрымана станоўчая ацэнка ад Геральдычнага савета, улічаны ўсе заўвагі прафесійных гісторыкаў. Такім чынам, на сёння вобраз узнагароды цалкам гатовы, але ўзнікла невялічкая праблема — хто будзе фінансаваць выпуск нагруднага знака.

— Недарэчнасць заключаецца ў тым, што патрэбны орган ці ведамства, якое скажа: «Так, мы будзем ствараць гэты медаль, мы яе прафінансуем!». На сёння такога органа няма. Таму, каб медаль не загінуў на паперы, у якасці ініцыятараў выступіў рыцарскі клуб «Рыцары Вялікага княства», але хто яе будзе чаканіць? Хацелася б, каб Міністэрства абароны, Міністэрства адукацыі, Міністэрства культуры і іншыя зацікаўленыя бакі знайшлі ўзаемаразуменне і, самае галоўнае, прафінансавалі гэтае пытанне, — лічыць Віктар Ляхар.

**Уладзімір АДАМУШКА, дырэктар Дэпартамента па архівах і справаводстве Міністэрства юстыцыі, намеснік старшыні Геральдычнага савета пры Прэзідэнце Беларусі** расказаў, што некалькі дзён назад у Геральдычны савет матэрыялы наконт гэтага нагруднага знака паступілі ад грамадскага аб'яднання «Рыцары Вялікага княства» і што савет будзе гэтыя матэрыялы разглядаць.

— Разам з тым я падтрымліваю Віктара Ляхара і схіляюся да таго, каб да гэтай справы больш далучылася Міністэрства абароны, усё-такі гэтая тэматыка бліжэй да іх ведамства, — сказаў Уладзімір Адамушка.

Нагрудны знак «Памятны медаль у гонар 600-годдзя Грунвальдскай бітвы» мае круглую форму і прамавугольную калодку еўрапейскага ўзору чырвонага, зялёнага і белага колераў, на рэверсе пералічаныя харугвы, якія здабылі перамогу пад Грунвальдам.

— Я асабіста закладаў чырвона-зялёна-белыя колеры толькі ў тым сэнсе, што яны адлюстроўваюць рэлігійныя канфесіі саюзнага войска: чырвона-белыя для хрысціян, зялёныя — для татарскай конніцы Вялікага Княства Літоўскага, — падкрэсліў Віктар Ляхар.

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

## Усміхнемся!

— Піражок будзеш?
— Буду!
— З бульбай ці з мясам?
— З півам!

☺

**Калі ў вас няма трэнажора з бегавой дарожкай, можна нашмараваць ступні вазелінам і бегаць на месцы.**

☺

У рэстаране.

— Афіцыянт! Прынясіце дзверы! Я хачу выйсці!

Тэлесеткі

# «Замах» паводле мемуараў

Да 65-годдзя Перамогі Першы канал прымеркаваў прэм'еру ваеннага дэтэктыва «Замах» (Беларусь-Расія, 2010). Гэта 8-серыйная карціна — ужо трэці сумесны праект Белтэлерадыёкампаніі і расійскіх партнёраў, а таксама другая пасля серыялу «Снайпер» сумесная работа беларускага рэжысёра Аляксандра Яфрэмава і расійскага акцёра Дзмітрыя Пяўцова.

У аснове сюжэту фільма «Замах» — напад дыверсантаў на аднаго з самых паспяховых расійскіх генералаў Івана Чарняхоўскага. Той загінуў з-за выбуху бомбы побач з ягоным аўтамабілем, і дагэтуль невядома, была гэта выпадковасць або спланаваны замах... Зрэшты, кінаверсія гэтай гісторыі на рэальныя падзеі толькі намякае, бо звязаныя з цалкам выдуманым персанажам генералам Данілавым (Дз. Пяўцоў). Сама ж гісторыя пачынаецца яшчэ напярэдадні Вялікай айчыннай вайны: генерал Данілаў і капітан Косцін аказваюцца закаханымі ў адну і тую ж дзяўчыну Джан, саперніцтва з-за якой працягваецца і ў ваенны час.

Горад, дзе жыве Джан, захопліваюць гітлераўскія войскі. Дывізія генарала Данілава адступае з баямі ў глыбіні тылу. Косціну, параненаму ў баі, удаецца пераапрануцца ў мундзір забітага нямецкага афіцэра і дабрацца да горада, але там капітан трапляе ў палон, і супрацоўнікі Абвера вырашаюць завербаваць яго. Данілаў жа ў 1944 годзе ў выніку паспяховай вайсковай аперацыі вызваляе практычна неразбураны горад і знаходзіць каханую дзяўчыну, але тая, перажыўшы акупацыю, стала зусім іншым чалавекам. У гэты час у галоўнае ўпраўленне контрразведкі СМЕРШ прыходзіць шыфроўка, у якой паведамляецца, што рыхтуецца замах на Данілава...

Прадзюсар і сцэнарыст «Замаху» Глеб Шпрыгаў мае ў актыве ўжо 5 сцэнарыяў фільмаў пра вайну («Снайпер», «Апошні браняпоезд», «Чалавек вайны» і «У чэрвені 1941-га» — у якасці сааўтара), і тлумачыць сваю цікавасць да гэтай тэмы так: «Я і сам часта задаваўся пытаннем, ці маю права пісаць аб тым, чаго не бачыў, не перажыў? Але для мяне тэма вайны — неабдымная і шматслойная, у ёй вельмі многа драматычнага матэрыялу, які можа зацікавіць і аб'яднаць людзей розных пакаленняў».

Прэм'ерны паказ ваеннага дэтэктыва «Замах» — у вячэрнім эфіры Першага канала з 5 па 9 мая. У ролях — Дзмітрый Пяўцоў, Аліна Сяргеева, Даніла Казлоўскі, Аляксандр Фяклістаў, Магдалена-Ганна Гурска, Уладас Багдонас, Павел Дэлонг, Анатоль Цярпіцкі, Іван Мацкевіч, Павел Харланчук, Ігар Сігоў і іншыя.

## Цікавыя факты:

Здымкі «Замаху» праходзілі на вуліцах Мінска і Гродна, у доме-музеі Якуба Коласа і ў старадаўняй сядзібе Святск. Менавіта ў апошняй, дарэчы, здымалі эпізоды страляніны і пагоні, калі група дыверсантаў Абвера нападае на штаб генерала Данілава.

Увогуле ў карціне шмат трукаў, сярод якіх — пагоні на рэтра-аўтамабілях. Іх выконвалі маскоўскія каскадзёры. Зрэшты, Дзмітрый Пяўцоў многія трукі рабіў самастойна.

Аўтары фільма папярэдне вывучылі мноства дакументаў, у прыватнасці, мемуары нямецкага шпіёна Майера — ён у свой час рыхтаваў замахі на Сталіна, Чэрчыля і Рузвельта (у Тэгеране ў 1943 годзе). Гэтыя мемуары дапаможа стварыць вобраз здрадніка Чартова.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

## «ВЫЛЕЧЫЎ» ЗА 5 МІЛЬЁНАЎ 400 ТЫСЯЧ РУБЛЁЎ

**Менавіта ў такую суму «ўляцеў» 60-гадовай мінчанцы візіт да яе на кватэру незнаёмага «лекара».**

Зламысніку хапіла ўсяго дваццаць хвілін, каб вычысціць схованку пацярпелай, у якой яна захоўвала згаданую вышэй суму. А заявіўся нязваны госць да мінчанкі, якая пражывае ў кватэры на вуліцы Цнянскай, каля трох гадзін дня. Задурыўшы пацярпелай галаву наконт таго, што ён лечыць хваробы, зладзюжка, як бачым, дарэмна не марнаваў часу. Зніклага з чужымі мільёнамі прайдзісвета цяпер расшукваюць праваахоўнікі.

**Ігар ГРЫШЫН.**

«Еўрабачанне-2010»

## Шведскі піяніст Роберт УЭЛС:

# «ЯК НЕ БУДЗЕ РАСПРАНАННЯ? ЯНЫ МНЕ АБЯЦАЛІ!»

Літаральна днямі стала вядома, што беларускаму гурту «3+2», які прадставіць Беларусь на сёлетнім песенным конкурсе «Еўрабачанне», акажа падтрымку ўжо вопытны артыст, больш за тое, чалавек з гучным імем на еўрапейскай музычнай сцэне — шведскі піяніст і кампазітар Роберт Уэлс.

Натуральна, гэта навіна адразу выклікала мноства пытанняў: чаму беларускія арганізатары абралі менавіта гэту кандыдатуру, што зацікавіла самога музыканта з кансерваторскай адукацыяй у магчымасці выступіць на «Еўрабачанні», як наяўнасць шостага ўдзельніка скарэктуе конкурсны нумар, і ці не ўспрымуць у Швецыі выступленне Уэлса з беларускай камандай як дэмарш? Пра ўсё гэта пагадзіўся расказаць беларускім журналістам сам Роберт Уэлс, хоць і прыляцеў у Мінск усяго на дзень, літаральна дзеля «жывога» знаёмства і першага сумеснага выступлення з салістамі гурта «3+2».

Нават маленечкага імправізаванага канцэрта ў холе гасцініцы «Еўропа» нам хапіла, каб ацаніць не толькі найвышэйшы клас Роберта-музыканта, але таксама харызму, тактоўнасць і пачуццё гумару заходняга госця.

Штогадовае канцэртнае шоу Уэлса «Рапсодыя ў стылі рок» вось ужо 15 год як выклікае цікавасць у публікі ва ўсім свеце — ад Ізраіля да Кітая, ад Афганістана да ЗША (толькі ў Швецыі яго наведалі больш за 1,5 мільёна чалавек!). А вось у Беларусі кампазітар раней ніколі не бываў, але тое-сёе пра нашу краіну ведаў:

— У мяне захаваліся ўспаміны, як некалькі гадоў таму, у 2002 годзе на Алімпіядзе Беларусь абыграла каманду Швецыі па хакеі. А я мала таго што вялікі фанат хакея, дык яшчэ і пісаў музыку да гэтага чэмпіянату. Натуральна, для ўсіх нас гэта была вельмі-вельмі сумная падзея, — заразліва ўсміхаецца. — А ўвогуле, шмат чаго залежыць ад першага ўражання. Хоць я і правёў тут усяго дзень, але пачуцці, якія я перажыў ад візіту ў Беларусь, былі выключна станоўчымі: калі вылятаў са Швецыі, там было мінус 5, а ў вас амаль што лета, цёпла, і ўсе шчаслівыя — мне гэта вельмі спадабалася.

— Вы толькі днямі пазнаёміліся з нашымі выканаўцамі і адрэпеціравалі з імі «жыўцом». Якія ўражанні засталіся ад знаёмства — можа, чагосьці маладым салістам не хапае, над чымсьці варта папрацаваць?

— Мне здаецца, больш важна казаць не пра тое, якія ўражанні ў мяне пакінулі гэтыя маладыя артысты, а пра тое, як мы спрацуемся і якое ўражанне мы ўсе разам, выходзячы на конкурсную сцэну, пакінем у сэрцах еўрапейскіх слухачоў. Гэтым разам мы паспелі ўсяго некалькі хвілін пагаварыць у грымёрцы, але ў нас яшчэ будзе шэраг сумесных рэпетыцый, у тым ліку ў Осла, і я ўпэўнены: чым больш часу мы будзем зладжана працаваць, тым больш камфортна адчуем сябе адзін з адным. Думаю, мы зробім выдатнае шоу, сыграем гэту песню здорава. Для мяне вялікі гонар паўдзельнічаць у гэтым праекце, і я зраблю ўсё магчымае, каб Беларусь набрала як мага большую колькасць балаў.

Чым жа прыцягнула ўвагу шведскага музыканта прапанова беларусаў? «У песні «Butterflies» чутныя элементы класічнай музыкі, а я люблю, калі ў кампазіцыі ёсць такія элементы, рок-песня гэта ці балада. Таму незалежна ад таго, ствараліб мы гэтую песню да «Еўрабачання» або пасля, я ў любым выпадку з задавальненнем удзельнічаў бы ў гэтым праекце».

— Але ж мы прызвычаіліся, што для выступлення на «Еўрабачанні» патрэбна шоу — каб нехта распранаўся на сцэне, ляталі анёлы, што-небудзь узрывалася... Вас не засмучае, што нічога гэтага ў беларускім нумары няма?

— Як гэта не будзе распранання? — з прытворным абурэннем перапытвае Роберт. — Мне ж абяцалі! *(Смяецца)*. Песня эфектная сама па сабе, здольная выклікаць у людзей моцныя эмоцыі, і гэта, на мой погляд, самае галоўнае. Таму ёй не патрэбныя ніякія спецэфекты. Калі б яны былі, я адмовіўся б у гэтым удзельнічаць. Давайце пакінем увесь гэты экшн на наступны раз.

На журналісцкія падколкі, маўляў, ці не баіцеся, што ў роднай краіне ваша выступленне з беларускай камандай успрымуць як здраду, піяніст адказвае нечакана сур'ёзна: «Не, з гэтым не будзе ніякіх праблем, наадварот, усе будуць вельмі рады. У Швецыі на гэтым конкурсе ёсць толькі адзін адвечны сапернік — Нарвегія, і калі б я выступаў з нарвежцамі, то мае суайчыннікі маглі б разлавацца; а калі наступны конкурс будзе праходзіць у Мінску — гэта ж выдатна!». Дарэчы, Швецыя традыцыйна надае «Еўрабачанню» вялікую ўвагу: напрыклад, сёлета, каб мець гонар прадставіць сваю краіну, у адборы спаборнічала больш за 3 тысячы песень! Але поспех, пераканы музыкант, не залежыць ад таго, адкуль ты родам. Узяць хоць бы гісторыю яго запрашэння ў беларускую каманду: расійскі прадзюсар Макс Фадзееў звязаўся са шведскім піяністам і кампазітарам праз нямецкага імпрэсарыа Максіма Берына (родам, між іншым, з Беларусі).

Цікавая дэталь: адміністратыўная і творчая група, якая займаецца падрыхтоўкай нашых удзельнікаў да «Еўрабачання», спачатку збіралася «змясціць» на конкурснай сцэне шостага ўдзельніка віртуальна, з дапамогай складанай сістэмы праектараў і люстэркаў. Але нарвежскія арганізатары паведамілі, што ў іх наўрад ці будуць тэхнічныя магчымасці для такой пастаноўкі, і ад ідэі давялося адмовіцца. Цяпер рабочая версія — даволі статычная пастаноўка, пяцёра выканаўцаў і піяніст. Роберт па сакрэце прызнаўся, што бачыць у нумары стрыманыя класічныя ўборы і такі ж інструмент, напрыклад, белы антыкварны раяль. Ці падзяляюць яго пункт гледжання арганізатары? Даведаемся ўжо зусім хутка...

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**
**Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.**

# СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.




**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**

**Сканворд (30 красавіка.) Па гарызанталі:** Марка. Танкіст. Вата. Шадр. Рак. Поза. Алека. Норд. Сапёр. Кіт. Марак. Чадра. Шум. Пуп. Авар. Хлам. Яліна. Кандэла. Мор. Рында. Арам. Брамс. Прага. Сапа. Лётчык. Кама. Падарожніца.

**Па вертыкалі:** Пагранічнік. Ямб. Крэда. Хлор. Ліра. Каштан. Масла. Оні. Марс. Айва. Тэмп. Сотка. Адрас. Янка. Чад. «Татра». Прыма. Кіп. Каса. Кар. Армада. Водар. Еўропа. Эра. Уролаг. Мікраскоп. Амазонка.

## 6 мая



**1904 год** — нарадзіўся (в. Нізок, сёння — Уздзенскі раён) Паўлюк Трус, вядомы беларускі савецкі паэт. З 1925 года быў удзельнікам літаратурнага аб'яднання «Маладняк». У 1927-28 гадах працаваў у гомельскай газеце «Палеская праўда». З першымі творамі выступіў у друку ў 1923 годзе. Аўтар зборнікаў «Вершы», «Ветры буйныя», паэм «Астрожнік», «Юны барацьбіт» і інш. Пісаў сатырычныя вершы, гумарыстычныя вершаваныя апавяданні. Памёр у 1929 годзе ад тыфу. Імем паэта названы бібліятэка на яго радзіме і вуліца ў Гомелі.

**1758 год** — нарадзіўся Максіміліян Рабесп'ер, французскі адвакат, лідар і ахвяра Вялікай Французскай рэвалюцыі, ідэолаг тэрору.

**Цытата дня**

***«Тыя ж самыя сродкі, што робяць чалавека здольным разбагацець, перашкаджаюць яму атрымоўваць асалоду ад багацця».***

**Антуан Рывароль (1753—1801), французскі пісьменнік.**

# «ДВА БАКІ АДНАГО МЕДАЛЯ»,

*або Сімволіка парадкавага лічэбніка «другі».*

**Сітуацыя разнаполюснасці характарызуе асэнсаванне ліку два (колькаснага лічэбніка) і парадкавага лічэбніка *другі*. Можна сказаць, што яны ўтварылі ўнікальную апазіцыю супрацьстаяння, у якой *два (пара)* надзелена станоўчым, стваральным энергетычным патэнцыялам, а вось *другі* аказаўся на супрацьлеглым полюсе сістэмы каштоўнасных арыентацый. Парадкавы лічэбнік *другі* — гэта *цень ад першага* (але той цень, які не паўтарае канфігурацыю першага, а трансфармуе яе такім чынам, што Дабро пераўвасабляецца ў Зло); гэта ноч з яе загадкавасцю, цьмянасцю, час актывізацыі нячыстай сілы; гэта падвоенасць, якая мяжуе з перакананасцю ў тым, што «адна бяда не ходзіць, за сабой *другую* водзіць».**

● Разгледзім яшчэ некаторыя моманты рытуальнай падвоенасці. Так, калі малады едзе выкупляць маладую, то маці нявесты выходзіць з хаты ў вывернутым кажусе, сустракае перад парогам гасцей гарэлкай, чаркамі, боханам хлеба, на якім ляжаць два кавалачкі цукру. Хто хоча мець прыгожую жонку, той павінен на працягу трох велікодных дзён падпяразвацца двума паясамі (і кашулю, і верхнюю вопратку).

● У аснове дзявочых варожбаў перадшлюбнага часу сімволіка цотнасці выконвала галоўную ролю. Цотнасць абнадзейвала, няцот — адкладваў спадзяванні да наступнага года.

● Каб ліхія людзі часам і не нашкодзілі цяжарнай жанчыне падчас святочных урачыстасцяў, яна павінна была апрануць на сябе ўсё па пары: пару сарочак, пару спадніц, фартухоў, хустак, паясоў. Лічылася, што ў такім разе яна сама і яе дзіця будуць надзейна абароненыя ад уздзеяння нават самага моцнага чараўніка.

● Каб дзіця не вырасла п'яніцам, кумы на хрэсьбінах не павінны былі напівацца, а выпівалі толькі цотны лік чарак (часцей за ўсё дзве), каб хроснік пражыў жыццё ў пары.

● Асобнае месца ў традыцыйнай культуры славянскіх (ды і не толькі іх) народаў займала сімволіка *спарыша*. Супярэчлівым было народнае стаўленне і да здвоеных пладоў і карняплодаў. Дзяўчатам і жанчынам, якія яшчэ планавалі нараджэнне дзяцей, нельга было есці здвоеных сліў, морквы, арэхаў, каб не нарадзіць двойню. Такія спарышы аддавалі жывёле, каб прынесла большы прыбытак.

● Разам з тым, людзі былі перакананыя: калі памылкова адну і тую ж страву пасалілі двойчы, то гэта лічылася прадказаннем прыбытку; калі ў кішэні пастаянна насіць спараны арэх, то гэты чалавек будзе шчаслівы; калі ў абедзвюх кішэнях насіць па два каштаны, то не будзе балець спіна; калі дзяўчына або хлопец знойдуць у жыце спарыш, то, хутчэй за ўсё, у тым жа годзе іх будзе чакаць шлюб або які-небудзь нечаканы прыбытак.

● Бадай што найбольшая ўвага ў традыцыйных вераваннях славянскіх народаў надавалася **культу блізнят**. З аднаго боку, нараджэнне двойні ўспрымалася ў народным асяроддзі негатыўна. Існавала перакананасць, што блізняты — з'ява выключна рэдкая, і яны маглі нарадзіцца толькі ў выпадку парушэння стэрэатыпаў традыцыйных паводзін (напрыклад, бацькі зачалі дзяцей у пост або напярэдадні вялікага каляндарнага свята). Па тых жа народных уяўленнях, блізняты былі надзеленыя незвычайнымі здольнасцямі.

● Асэнсаванне сімволікі ліку «два» засведчыла, што яго семантычнае поле мае шмат вектараў. З аднаго боку, двойка (цот, пара) з'яўляецца сімвалам непарушнага адзінства як у сферы сацыяльных адносінаў, так і ў маштабах прыродна-касмічнага існавання: «Лета на зіму, а зіма на лета працуюць», «Рыхтуй летам сані, а зімой калёсы». З другога боку, спарыш або пара блізнят захоўвалі ў сабе таямнічы пачатак непрадказальнасці, часам смяротнай небяспекі. Напрыклад, надзвычай кепскім для вянчання і вяселля лічыўся той час, калі на небе адначасова было відаць і сонца, і месяц.

● Двойка гарманізавала адносіны, падвойвала сілу ўплыву або ўздзеяння адзінкі, і адначасова ўтрымлівала патэнцыяльную энергію напружання, палярнасці, супрацьстаяння.

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №УМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год. Тыраж 33.310. Індэкс 63850. Зак. № 2168. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

**Закрытае акцыянернае таварыства «Маладзечнамэбля»**

# НЕ ПРОСТА ВЫРАБІЦЬ, А ВЫРАБІЦЬ І ПРАДАЦЬ

***Напачатку карысны адрас, у прыватнасці — для мінчан і гасцей сталіцы: наведайце ў Мінску гандлёвы дом «Маладзечнамэблі» па праспекце Машэрава, 78 (вядома, калі вы вырашылі набыць для сваёй новай кватэры прыгожую, сучасную мэблю або абнавіць свае «сценкі» ды гарнітуры), і вам наўрад ці спатрэбіцца ездзіць па іншых крамах. У гандлёвым доме «Маладзечнамэблі» вы абавязкова знойдзеце вырабы, якія задаволяць ваш нават надзвычай патрабавальны густ. Прыгажосць, цікавы дызайн, эстэтычнасць — падобным чынам можна смела характарызаваць мэблю маладзечанцаў, і ў гэтым не будзе ніякага перабольшвання. Адным словам — класіка.***

## Так некалі абазначылі мэту сваёй дзейнасці працаўнікі «Маладзечнамэблі». І няўхільна рэалізуюць яе на практыцы

Дарэчы, менавіта на класічныя стылі і арыентуюцца маладзечанцы ў сваёй дзейнасці. Некалі, а дакладней, падчас крызісу на пачатку 90-х гадоў, тут і зрабілі ўхіл менавіта на яе. У якасці асноўных матэрыялаў для вырабу мэблі выбралі масіў дуба і вольхі (апошнім часам да гэтага сыравіннага пераліку дадалі бук, прычым менавіта з букам, які на зрэзе мае прыгожую фактуру, працуюць толькі ў Маладзечне). Пад сваю класіку знайшлі і даволі ўдалы асартымент — усемагчымыя наборы корпуснай мэблі (тут жа варта ўдакладніць: 8 гадоў таму на прадпрыемстве таксама асвоілі выпуск мяккай мэблі).

«Класіку» маладзечанцаў добра ведаюць і паважаюць не толькі айчынныя спажыўцы, яе высока цэняць і многія замежныя пакупнікі — у прыватнасці, у Расіі, а таксама ў Германіі, Бельгіі, Францыі, краінах Балтыі і іншых краінах. Такі факт: каля 60 працэнтаў сваёй мэблі прадпрыемства менавіта экспартуе. Маладзечанцы за сваю мэблю пяць гадоў таму атрымалі прэмію ўрада ў спецыяльным рэспубліканскім конкурсе ў галіне якасці, падчас якога, вядома ж, ацэньваюцца не проста чыста тэхнічныя характарыстыкі таго ці іншага вырабу, тавару, а цэлы комплекс іх спажывецкіх уласцівасцяў і якасцяў...

Да такога ж рэспубліканскага конкурсу рыхтуюцца на прадпрыемстве цяпер, адпаведныя тэрміны ўжо дазваляюць (гэты конкурс, варта нагадаць, праводзіцца штогод, а вось званне яго лаўрэата можна атрымаць раз на пяць гадоў).

Такім чынам, наш расказ пра сённяшнія справы маладзечанскіх мэбельшчыкаў, пра тое, як яны ў цяперашніх умовах працуюць на спажыўца. Ды, зразумела, пра іх прыгожыя вырабы. А перад гэтым яшчэ адно ўдакладненне: цяпер закрытае акцыянернае таварыства «Маладзечнамэбля» ўяўляе сабой аб'яднанне, у якое ўваходзяць галаўное прадпрыемства, а таксама фабрыка мяккай мэблі (у Маладзечне ж) і Вілейская мэблевая фабрыка. Апошняя найперш вызначаецца сваімі арыгінальнымі кухнямі ды таксама прыгожымі наборамі ўсё той жа корпуснай мэблі.

### ЦЯПЕР ТОЛЬКІ ЛЯНІВЫ МЭБЛІ НЕ РОБІЦЬ

**Так сказала падчас гутаркі начальнік аддзела тэхнічнага кантролю прадпрыемства Наталля АСТАХНОВІЧ.**

— Але вось пытанне, — зазначала яна, — якім чынам гэту мэблю робяць? І дзе? У многіх выпадках літаральна ў падвале... Вы былі на нашым прадпрыемстве, бачылі, што яно сабой уяўляе. Як можна параўнаць нашу вытворчасць з вытворчасцю цяперашніх шматлікіх і, па сутнасці, прымітыўных участкаў і цэхаў, а значыць, ці можна параўнаць і нашу мэблю з мэбляй, якую ствараюць на гэтых прымітыўных участках? А дадайце да ўсяго гэтага пастаянную творчую працу нашых канструктараў, нястомны пошук нашых дызайнераў...

Так, нас пазнаёмілі на прадпрыемстве са сваёй вытворчасцю. Гэта — прагрэсіўнае замежнае абсталяванне, якое выключыць з тэхналагічнага працэсу так званы чалавечы фактар, максімальна даручыць усю справу аўтаматыцы ды камп'ютарнаму кіраванню. Гэта задача, можна меркаваць, выканана. Вядома, на яе выкананне былі накіраваныя (і накіроўваюцца) немалыя сродкі, штогод прадпрыемства выдаткоўвае на тэхнічнае перааснашчэнне і абнаўленне мільярды рублёў.

На вытворчых участках «Маладзечнамэблі» – на сучасным абсталяванні працуюць Мікалай КАРАНЕЎСКІ (уверсе) і Андрэй ЧАРНЕЦКІ.
Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.



— У 2004 годзе мы ўкаранілі ў сябе сістэму ICO 9001, у 2007 годзе пацвердзілі яе, — працягвала Наталля Сігізмундаўна. — Як выконваюцца яе патрабаванні, прадпрыемства штогод правяраюць спецыялісты знешняга аўдыту з фірмы «Рускі рэгістр». Апошнія дзве праверкі прайшлі без ніякіх заўваг.

— На прадпрыемстве рэгулярна праводзіцца аналіз пытанняў якасці, працуе пастаянна дзейная камісія па якасці, праводзяцца дні якасці. Сёлетні год аб'яўлены ў краіне годам якасці, адпаведна мы намецілі праводзіць такія дні часцей. Наладжана добрая сувязь з нашымі аптовымі спажыўцамі. Зусім нядаўна да нас прыязджалі прадстаўнікі гандлю з Краснадара, у іх былі пэўныя пытанні да нас — сумесна закрылі гэтыя пытанні. Пры ўсім гэтым фабрычныя спецыялісты аддзела збыту і маркетынгу рэгулярна наведваюць нашы гандлёвыя дамы і прадстаўніцтвы, у тым ліку ў Расіі. Усё, што ўбачана і пачута імі падчас такіх паездак, дэталёва абмяркоўваецца, а ў канчатковым рынку сёння. «Мы можам вырабляць і вырабляем мэблю такога ж класа, наш брэнд таксама стаў добра пазнавальным», — упэўнена гавораць на «Маладзечнамэблі». Пры гэтым брэнд прадпрыемства, як расказалі тут, спрабуюць падрабляць, што ўжо само па сабе няблага сведчыць пра папулярнасць маладзечанскай мэблі. Праўда, гэты факт ніколькі не радуе саміх маладзечанцаў: падробка ёсць падробка, у ёй закладзена і адпаведная якасць, а гэта кідае на іх немалы цень.

Як адзначалася ўжо, на прадпрыемстве «Маладзечнамэбля» арыентуюцца пераважна на класіку, пры гэтым, паводле слоў Наталлі Астахновіч, менавіта класіку патрабуюць яго асноўныя спажыўцы, партнёры.

Разам з тым не застаюцца тут без увагі і больш сучасныя стылявыя кірункі. Напрыклад, цяпер моднай з'яўляецца мэбля белага колеру з пазалотай — адпаведна, такая мэбля пачала займаць немалую долю і ў маладзечанскім асартыменце.

### ЯК ДЫКТУЕ ЛОГІКА РЫНКУ

**З гутаркі з намеснікам генеральнага дырэктара па тэхнічным пераўзбраенні і развіцці — галоўным тэхнолагам Аляксандрам ЖАНКЕВІЧАМ.**

— У мінулым годзе абнаўленне прадукцыі на прадпрыемстве склала амаль 30 працэнтаў, у гэтым годзе плануем абнавіць яе не менш чым на 15. Аднак гэта не азначае таго, што абнаўленне робіцца дзеля абнаўлення. Арыентацыя на запатрабаванні спажыўца — вось што рухае намі ў гэтай справе. Асваенне новых вырабаў дыктуецца таксама неабходнасцю пашырэння нашага экспарту, прычым у першую чаргу — у краіны далёкага замежжа: Бельгію, Францыю і іншыя. Так, для экспарту ў гэтыя краіны плануецца асвоіць не менш трох новых праграм, а ў кожную з іх уваходзіць па 10—15 вырабаў (для ўнутранага рынку і рынку краін СНД намечана выканаць дзве праграмы). Прычым і гэтыя намечаныя планы не будуць застылымі: на працягу года будзем уважліва сачыць, што лепш за ўсё прадаецца, больш за ўсё запатрабаванае. Так дыктуе логіка рынку.

Выкананне намечанага, вядома ж, залежыць ад тэхнічнай гатоўнасці прадпрыемства. У гэтым годзе асноўная ўвага будзе надавацца нашай фабрыцы мяккай мэблі. Вытворчасць такой мэблі будзе цалкам перанесена непасрэдна на гэту фабрыку (цяпер корпусы мяккай мэблі вырабляюцца на асноўным прадпрыемстве). Тыя ж плошчы, якія вызваляцца на асноўным прадпрыемстве, будуць выкарыстаны для вырабу мэблі пад заказы, для выпуску больш высокамастацкіх вырабаў. Дарэчы, мы ўжо цяпер практычна працуем «пад заказ», і, у прыватнасці, для краін далёкага замежжа...

Хуткая змена асартыменту, гатоўнасць тут жа выканаць любы заказ спажыўца, увогуле — сучасная высокадакладная вытворчасць, якая патрабуе добрага ўмення і «мазгоў», вымагаюць належнай падрыхтоўкі кадраў. І гэтаму пытанню на «Маладзечнамэблі» дзяленняў пэўных лімітаў, за кошт замены энергаёмістага абсталявання, а галоўнае — дзякуючы таму, што некалі ўзвялі ўласную кацельню, у якой пачалі спальваць адходы дрэваапрацоўкі.

Тут жа, у сувязі з гэтым варта абазначыць наступную праблему: напэўна, нельга бясконца даводзіць прадпрыемствам паказчыкі па зніжэнні энергаёмістасці прадукцыі, па энергазберажэнні, па сутнасці раздаючы адпаведныя працэнты і паказчыкі «на вока», без уліку таго, што на тым ці іншым прадпрыемстве ўжо зроблена ў гэтым кірунку і ці магчыма на ім яшчэ нешта зрабіць, каб менавіта «знізіць». Ёсць жа нейкія сусветныя ўзроўні выдаткоўвання энергарэсурсаў на адзінку прадукцыі, выражаныя ў абсалютных адзінках — на іх і варта арыентавацца.

Што часам перашкаджае калектыву «Маладзечнамэблі» больш аператыўна рэагаваць на запатрабаванні таго ж рынку? Маса нудных і працяглых па часе ўзгадненняў па атрыманні дазволу для набыцця замежнага абсталявання. Яно зразумела: адпаведныя дзяржаўныя ведамствы непакояцца, каб за мяжу не быў вывезены лішні долар. А між іншым, сам гэты адміністрацыйны дазвол выглядае ў сённяшніх умовах даволі архаічным.

### БЕСПРАЦЭНТНЫ КРЭДЫТ, БІЗНЭС-СУСТРЭЧЫ, СКІДКІ

**З гутаркі з намеснікам генеральнага дырэктара па маркетынгу Сяргеем МАРОЗАМ.**

— Для нашага прадпрыемства вырабіць любую мэблю — ужо даўно не праблема, галоўнае — прадаць. У сувязі з гэтым адзначу: апошнім часам пакупніцкі попыт у краіне на мэблю (попыт увогуле) знізіўся; можна таксама надаюць неаслабную, пастаянную ўвагу. Як паведаміў Аляксандр Жанкевіч, напрыклад, у мінулым годзе каля 400 чалавек на прадпрыемстве прайшлі навучанне, курсы падрыхтоўкі, у тым ліку павысілі кваліфікацыю каля 80 інжынерна-тэхнічных работнікаў і больш за 100 рабочых.

— Наша мэбля, — падкрэсліваў падчас гутаркі Аляксандр Жанкевіч, — адносіцца да класа элітнай, разлічана на багатага і сярэдняга пакупніка. Гэта, аднак, ніколькі не адмаўляе неабходнасць працаваць над зніжэннем яе сабекошту, увогуле — над зніжэннем усіх выдаткаў прадпрыемства. Адпаведная праца праводзіцца па ўсіх кірунках, але асабліва поспеху дабіліся мы ў зніжэнні энергавыдаткаў, у энергазберажэнні...

Як зазначыў Аляксандр Жанкевіч, яшчэ 10 гадоў таму доля энерганосьбітаў у сабекошце прадукцыі складала больш за 14 працэнтаў — цяпер жа гэты паказчык знаходзіцца на ўзроўні 4 працэнтаў. Гэтага выніку дасягнулі за кошт установкі прыбораў уліку і давядзення да ўсіх падраздзяленняў пэўных лімітаў, з прадпрыемствам, з тымі змяненнямі па ўдасканаленні тэхналогіі і тэхнічнага парку, якія на ім адбыліся. Безумоўна, гэта надае ўпэўненасці нашым партнёрам у надзейнасці, трываласці нашых гандлёвых сувязяў.

Прадпрыемства нярэдка робіць скідкі ў сваіх фірмовых крамах (у прыватнасці, у залежнасці ад колькасці набытай мэблі), дае пакупнікам беспрацэнтны крэдыт для яе набыцця.

### ЯШЧЭ АДНА ЗАРАБОТНАЯ ПЛАТА ПРАЗ САЦЫЯЛЬНЫЯ ФОНДЫ

**З гутаркі з намеснікам генеральнага дырэктара па сацыяльных пытаннях, старшынёй прафсаюзнага камітэта Анатолем БЯЛЯЎСКІМ.**

Гэта ўжо аксіёма: паспяховая, прыбытковая дзейнасць любога прадпрыемства (а на «Маладзечнамэблі» маюць неблагі прыбытак) з'яўляецца гарантыяй дабрабыту яго працаўнікоў. Як падкрэсліў Анатоль Бяляўскі, штомесячныя выплаты на сацыяльную сферу ў разліку на аднаго чалавека (на матэрыяльную дапамогу, на ўтрыманне фабрычнай медыцыны, развіццё спорту і г.д.) складаюць 1380 тысяч рублёў. Гэта сума практычна роўная сярэднямесячнай заработнай плаце (у першым квартале 1460 тысяч рублёў).

Назавём асобныя артыкулы сумесных (казны прадпрыемства і казны яго прафсаюзнай арганізацыі) сацыяльных выдаткаў. Зрэшты, гэтыя выдаткі больш датычаць непасрэдна самога прадпрыемства, бо на прафсаюзныя ўзносы, як добра вядома, асабліва не разгонішся. Такім чынам, аднаразовыя выплаты на шлюб, на дапамогу пры нараджэнні дзіцяці складаюць па мільёну рублёў (гэта, варта ўдакладніць, дадаткова да адпаведных дзяржаўных выплат); працаўнікі, якія выходзяць на пенсію, атрымліваюць па 6 сваіх сярэднямесячных заробкаў; яны ж, ужо падчас знаходжання на пенсіі, заахвочваюцца і да пэўных святаў, прычым амаль на адным узроўні з тымі, хто працуе; яны ж рэгулярна атрымліваюць пэўныя сумы і да сваіх юбілейных датаў...

— У мінулым годзе выдаткавалі 40 мільёнаў рублёў на матэрыяльную дапамогу, 23 мільёны на турыстычна-экскурсійныя паездкі, 10 мільёнаў на навагоднія падарункі; прадпрыемства цалкам аплачвала канькабежна-лыжныя вылазкі нашых працаўнікоў на гарадскі стадыён (а ўсяго ў нас рэгулярна займаюцца спортам больш за 300 чалавек), — пералічваў Анатоль Бяляўскі. — У нас адзін з лепшых у горадзе масажных кабінетаў, адзін з лепшых стаматалагічных... Грунтоўна рыхтуемся да Дня Перамогі. Яшчэ раз паглядзім, як жывуць нашы ветэраны (для тых, хто застаўся адзін, мяркуем наладзіць рэгулярныя харчовыя дапамогі); ветэранам вайны і прыраўнаваным да іх катэгорыям, г.зн. афганцам і іншым, мяркуем выдаць да Дня Перамогі па мільёну рублёў. Добрая праца людзей (у тым ліку і былая праца), якія і ствараюць (стваралі) для прадпрыемства той жа прыбытак, павінна належным чынам і заахвочвацца. Ці не так?

Вядома ж, так; з гэтай высновай ну ніяк нельга паспрачацца. Хіба што варта дадаць: на ўсіх бы прадпрыемствах і ва ўсіх арганізацыях гэтак жа няблага б жыць.

* * *

**НА ЗАКАНЧЭННЕ.** «Маладзечнамэбля» за свае прыгожыя, дыхтоўныя вырабы зарабіла за апошнія гады нямала выдатных узнагарод. Прадпрыемства на працягу некалькі гадоў запар узнагароджвалася прызам «Гран-пры «Сярэбраная елка», неаднаразова станавілася лаўрэатам конкурсаў «Лепшыя тавары Рэспублікі Беларусь на рынку Расіі» і «100 лепшых тавараў Рэспублікі Беларусь», яго прадукцыя адзначана шматлікімі дыпломамі міжнародных і рэспубліканскіх выставак. Гэтыя ўзнагароды — цалкам заслужаныя, а галоўнае — яны пры гэтым нікольні не расслабляюць калектыў. Тут, у прыватнасці, падкрэсліваюць: цяпер працаваць стала больш складана, сам рынак не дазваляе расслабляцца, або, як кажа Сяргей Мароз, не дазваляе спаць у шапку. На ім сёння выйграе той, хто пастаянна працуе на якасць, хто мае доўгую запасную лаўку цікавых канструктарскіх распрацовак і дызайнерскіх рашэнняў, выйграе той, хто пастаянна вывучае і заўсёды падчас сваёй дзейнасці мае на ўвазе запатрабаванні спажыўца...

— Няпростыя задачы стаяць перад намі на гэты год, пры гэтым мы павінны нарасціць свае аб'ёмы недзе на 10 працэнтаў, — казаў генеральны дырэктар прадпрыемства Валерый Бушыла. — І асабліва няпростыя гэтыя задачы па экспарце. Сёння для нас галоўнае — не вырабіць (у гэтым плане працэс на прадпрыемстве адладжаны ўжо няблага), а прадаць; прапанова ж мэблі цяпер — вунь якая вялікая. Адпаведна, будзем яшчэ болей пашыраць сваю тавараправодную сетку, будзем яшчэ больш дэталёва працаваць над якасцю, над асартыментам. Адным словам, будзем змагацца за спажыўца ўсімі спосабамі...

Застаецца пажадаць калектыву «Маладзечнамэблі» новых поспехаў на гэтым шляху. А закончым гэты матэрыял такім, на наш погляд, даволі цікавым і павучальным фактам. З тым, каб актывізаваць рэалізацыю прадукцыі яшчэ болей, на прадпрыемстве задзейнічалі спецыяльную сістэму аплаты працы ўсіх тых, хто займаецца менавіта яе продажам, збытам. Галоўны сэнс гэтай сістэмы — заработная плата людзей павінна цалкам залежаць ад адпаведных аб'ёмаў прададзенага канкрэтна кожным з іх.

І яшчэ такі паказальны факт: як адзначалі на «Маладзечнамэблі», у аб'яднанні цяпер працуюць 1350 чалавек, з іх 110 чалавек задзейнічаны менавіта ў збыце і гандлі... Напэўна, усё гэта яшчэ яўна непрывычна для нашага пакуль што далёка не рынкавага ўсведамлення. Словам, у сваім разуменні таго ж рынку і яго наступстваў маладзечанцы пайшлі яўна далей, чым многія з нас, чым многія іншыя.

**Іван БАРАНОЎСКІ.**

УНП 600203065.

P.S. Як вядома, нядаўна адбыліся выбары ў мясцовыя Саветы. Генеральны дырэктар аб'яднання «Маладзечнамэбля» Валерый Бушыла выбраны дэпутатам Мінскага абласнога Савета.

**ШЧЫРА ВІНШУЕМ!**

**АДРАСЫ ФІРМЕННЫХ МАГАЗІНАЎ «МАЛАДЗЕЧНАМЭБЛІ»:**

г. Віцебск, вул. Ленінградская, 161А, тэл. (0212) 35 31 66
г. Барысаў, вул. 30 гадоў ВЛКСМ, д. 31, тэл. (0177) 76 92 21
г. Гомель, вул. Я. Коласа, 13, тэл. (0232) 54 78 35
г. Брэст, вул. Дуброўская, 10, тэл. (0162) 29 17 01
г. Гродна, вул. Лідская, 31, тэл. (0152) 75 69 52
г. Пінск, плошча Леніна, 1, тэл. (0165) 35 17 83
г. Баранавічы, вул. Фабрычная, 22, тэл. (0163) 47 13 46
г. Мазыр, вул. Савецкая, 194/1а, вул. Бульвар Дружбы, 12, тэл. (02351) 2 98 25
г. Мінск, праспект Машэрава, 78, тэл. (017) 306 03 28
г. Маладзечна, вул. Лібава-Роменская, 83а, тэл./факс (0176) 77 13 96
г. Магілёў, вул. Будаўнікоў, 11, тэл. (0222) 28 89 97